Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 МАЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 85 (29454)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА





ДЗЕ МЕЖЫ АЛЯКСЕЯ ТАЛАЯ? 6



ПОМНІК ЗАГІНУЛЫМ ЗА АСАБІСТЫЯ СРОДКІ МС




## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СТАНІЛЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку Міністэрства ўнутраных спраў:**

*«Хацелася б нагадаць пра неабходнасць выканання агульнапрынятых нормаў паводзін у грамадстве, захавання дзейнага заканадаўства і існуючай адказнасці за яго парушэнне. Асобна неабходна спыніцца на незаконным выкарыстанні незарэгістраванай сімволікі, здзяйсненні рознага роду правакацыйных дзеянняў, а таксама правакацыйных паводзін асобных грамадзян падчас мерапрыемстваў. Органы ўнутраных спраў не дадуць азмрочыць вялікае свята Перамогі. Любое правапарушэнне будзе імгненна спыняцца. Вінаватыя асобы будуць устаноўлены, затрыманы і прыцягнуты да адказнасці».*

## КОРАТКА

- **Патрыятычная акцыя «Іх імёнамі названы студэнцкія атрады» стартуе ў Беларусі 7 мая.**
- «АМКАДАР» пачаў выпрабаванні інавацыйнага дарожнага катка.
- **У 2020 годзе перададзены на перапахаванне астанкі 250 загінулых падчас вайнаў.**
- У Гальшанскім замку пачала работу музейная экспазіцыя.
- **Арменія адмяніла абмежаванні на ўезд для прышчэпленых ад COVID-19 турыстаў.**
- Нацбанк выпусціць памятныя манеты ў гонар Крапівы, Мележа і Шамякіна.


ISSN 1990 — 763X


# Малады настрой старажытнага парку



Нягледзячы на няўстойлівае надвор'е і капрызы сёлетняй запозненай вясны, жыхары сталіцы не сядзяць па кватэрах, а спяшаюцца на вуліцы і ў скверы — радуюцца першым майскім дзянькам. Гэта красамоўна падкрэслівае здымак «карпаратыўнай суполкі», якую днямі сустрэў на веладарожцы ў самым вялікім, прыгожым і старажытным сталічным парку — Лошыцкім.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Напярэдадні

## СРЭБРА І ЗОЛАТА, ЗЯЛЁНЫ І ЧЫРВОНЫ, УЗЫХОД І АДЗІНСТВА...



Усе гэтыя колеры і сімвалы размешчаны на гербе і сцягу Рэспублікі Беларусь — абавязковых дзяржаўных атрыбутах, якія сімвалізуюць яе суверэнітэт. Гэтымі днямі ім асаблівая ўвага. Адпаведнае свята было ўстаноўлена яшчэ ў 1995 годзе, у той жа год па выніках рэферэндуму быў зацверджаны эталон герба і Палажэнне аб сцягу. З таго часу пад знакамі незалежнай Беларусі нарадзілася і вырасла цэлае пакаленне, яно ўжо ўступіла ў дарослае жыццё, працягвае справу сваіх бацькоў, якія будавалі новую Беларусь — тую, якой мы ганарымся, дзядоў, якія яе аднаўлялі пасля вайны, і прадзедаў, якія за яе ваявалі. Дарэчы, сімвалы гэтыя захавалі пераемнасць з тымі, пад якімі жылі і за якія паміралі папярэднія пакаленні. Важна, каб гонар за іх і за сваю краіну адчувалі і маладыя беларусы, і зусім юныя, і тыя, што будуць жыць пасля нас. Гэтаму прысвечаны многія дзеі Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Пра тое, чым напоўнены дні, якія сёлета аб'ядноўваюць некалькі дзяржаўных свят, у паведамленнях нашых карэспандэнтаў.


СТАР. 4


Дзеля памяці

## І ПАСЛЯ НАС ПРЫЙДУЦЬ, І КВЕТКУ ПАКЛАДУЦЬ

### Амаль у кожнай беларускай вёсцы ёсць помнік падзеям вайны. За кожным з іх – свая гісторыя

**Не так даўно давялося пісаць пра помнікі, што стаяць у лясах, палях, пры дарогах. Часта іх устанаўлівалі на месцы расстрэлаў, на месцы спаленых вёсак, на брацкіх магілах. Яны вельмі розныя: ад сучасных велічных да старэнькіх, прымітыўных, якія ўзводзілі самі вяскоўцы. Нярэдка гэтыя манументы знаходзяцца даволі далёка ад населеных пунктаў, наведваюць іх найбольш пад святы. А вось у вёсках, уладкаваных аграгарадках, сярэдніх па велічыні, маленькіх населеных пунктах звычайна ёсць памятныя мясціны, дзе ўвекавечана памяць землякоў. Падчас нядаўняй паездкі ў Пружанскі раён давялося пабываць каля такіх помнікаў.**


СТАР. 5





Памятны комплекс у Сухопалі.

З першых вуснаў

# «Статус дзяржаўнага служачага падымецца высока, але і патрабаванні будуць адпаведныя»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях удасканалення заканадаўства аб дзяржаўнай службе. Удзел у ёй прымалі кіраўнікі ўрада, Адміністрацыі Прэзідэнта, спікеры дзвюх палат парламента, дзяржсакратар Саўбеза, міністры фінансаў, працы і сацыяльнай абароны.**

Інстытут прафесійнай дзяржаўнай службы створаны ў Беларусі 28 гадоў таму і ў цяперашні час яшчэ дзейнічае на падставе закона 2003 года. Абноўлены прававы акт дэпутаты прынялі ў першым чытанні летась у снежні. Перад другім чытаннем яго навелы чарговы раз абмеркавалі на нарадзе з кіраўніком краіны. Дарэчы, сустрэча на гэту тэму ў Палацы Незалежнасці ўжо другая — абнаўленні ў закон аб дзяржаўнай службе абмяркоўваліся ў студзені 2019 года. Да работы спрычыніліся навуковая, дэпутацкая і экспертная супольнасці. Патрабаванні з таго часу да новай рэдакцыі закона засталіся нязменныя: устанавіць сацыяльна-прававыя гарантыі, зрабіць дзяржаўную службу падобнай да вайсковай, выпрацаваць выразныя і вычарпальныя патрабаванні да яе праходжання, павысіць імідж дзяржаўнага кіравання.

Галоўным пытаннем нарады Прэзідэнт назваў пытанне аб тым, наколькі новы закон адпавядае бягучым і перспектыўным патрэбам дзяржавы і грамадства. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся падыходамі для дасягнення балансу дысцыпліны, адказнасці дзяржслужачых і павышэння прэстыжу дзяржаўнай службы.

## ФУНКЦЫЯНУЕ ВЫРАЗНА І ЗЛАДЖАНА

«Мы ў апошнія часы вельмі часта гаворым пра ўдасканаленне дзяржаўнага кіравання. ***Якраз людзі, што будуць занятыя на дзяржаўнай службе, і будуць ажыццяўляць гэта дзяржаўнае кіраванне. За мінулыя больш чым чвэрць стагоддзя з моманту набыцця незалежнасці нам удалося выбудаваць стройную вертыкаль улады, сфарміраваны кампактны дзяржаўны апарат, забяспечана неабходная выканаўчая дысцыпліна»,*** — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, нават у самых няпростых сітуацыях сістэма дзяржаўнага кіравання функцыянуе выразна і зладжана. Найлепшым прыкладам гэтаму з'яўляецца кансалідацыя дзяржслужачых і іх работа ва ўмовах мінулага года. «Гэта была лакмусавая папера. Таму ўсе павінны разумець, што на бягучым этапе размова не ідзе аб кардынальным зломе старой сістэмы і нават не аб кардынальным рэфармаванні дзяржаўнай службы. Асноўная наша задача па праекце гэтага закона — надаць імпульс далейшаму развіццю сучаснай сістэме дзяржаўнай службы», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Ён лічыць, што самае важнае ў гэтай сувязі — кадры, і трэба прыцягнуць у дзяржапарат не проста кваліфікаваных і мэтанакіраваных спецыялістаў, здольных аператыўна вырашаць важныя задачы, а «дзяржаўных» людзей. «Будуць кадры — тады і сістэма будзе працаваць. ***Паступаючы на службу, чалавек павінен разумець, што яго галоўны абавязак — служыць краіне і беларускаму народу. Таму асаблівае значэнне набывае маральна-этычнае аблічча дзяржаўнага служачага, яго паводзіны як на працы, так і ў побыце»,*** — заўважыў Прэзідэнт.

## ЗНАЧОК НЕ ПРОСТЫ АТРЫБУТ

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да спікераў палат парламента Наталлі Качанавай і Уладзіміра Андрэйчанкі з загадам прадугледзець законам, каб кожны дзяржслужачы ў звычайным жыцці выдзяляўся нейкім атрыбутам. Як прыклад — значок. «Народ павінен бачыць: гэта дзяржаўны чалавек, як ваенныя», — падзяліўся думкамі кіраўнік краіны, заўважыўшы, што гэта патрэбна для таго, каб людзі ведалі, да каго звярнуцца па дапамогу ці падтрымку. «Калі ты дзяржаўны служачы, ты павінен знешне выдзяляцца ў грамадстве для таго, каб да цябе маглі звярнуцца людзі па дапамогу, параду і проста з табой паразмаўляць. Менш будуць бегаць у прыёмныя і пісаць лістоў. Другое — гэта тэст любога дзяржаўнага служачага. Ён павінен ганарыцца тым, што ён дзяржаўны служачы. У адваротным выпадку, не трэба яму быць дзяржаўным служачым», — упэўнены Прэзідэнт.

## ПРА «ПЕРНІКІ» ДЗЯРЖСЛУЖБЫ

Кіраўнік краіны заўважыў, што забяспечыць высокі статус і прэстыжнасць прафесіі немагчыма без замацавання пакета сацыяльна-прававых гарантый. Аднак гэтыя гарантыі павінны строга суадносіцца з абавязкамі і адказнасцю кожнага супрацоўніка. «І тут не павінна быць перахлёсту: калі я дзяржаўны служачы, то растапырыў пальцы. Ён павінен быць сціплым, сумленным чалавекам і ў плане матэрыяльнага забеспячэння. Дзяржслужачы — гэта не значыць, што заробкі ў 10 разоў вышэйшыя, але павінна быць усё годна. Каб не было гэтага кантрасту, як у савецкія часы за Гарбачовым: сакратарам райкамаў, абкамаў і іншым зарплату паднялі ў два разы і адразу выклікалі агрэсію ў народа, таму што народ жыў няпроста. То-бок вось тут прыхільнасць павінна быць да народа», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пытанне аб статусе дзяржаўных служачых абмяркоўвалася падчас нядаўняга Усебеларускага народнага сходу. «Статус дзяржаўнага служачага падымецца высока, але і патрабаванні будуць адпаведныя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

***«Яшчэ раз падкрэслю свае патрабаванні: правы і абавязкі дзяржслужачых, правілы іх паводзін павінны быць падобныя вайскоўцам, а дзесьці, можа, нават і вышэйшыя.*** Але нельга перагнуць палку», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас нарады кіраўнікі ключавых дзяржаўных органаў выказалі асноўныя палажэнні падрыхтаваных праектаў і далі ім ацэнку. У прыватнасці, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка нагадаў, што створаная па даручэнні Прэзідэнта рабочая група на пляцоўках Савета Рэспублікі, Адміністрацыі Прэзідэнта, Акадэміі кіравання неаднаразова абмяркоўвала новую рэдакцыю закона аб дзяржслужбе і распрацаваных у яе развіццё праектаў указаў. Заканадаўчыя навелы накіраваны на павышэнне эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў, прэстыжу дзяржаўнай службы і, што немалаважна, якасці падбору дзяржаўных служачых», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Па яго словах, нязменным прынцыповым патрабаваннем да сістэмы застаецца тое, што ў ёй павінны працаваць выключна прафесіяналы, адданыя сваёй краіне.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Пасля нарады **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** расказаў журналістам, якія асноўныя новаўвядзенні будуць адлюстраваныя ў законе. У першую чаргу — сістэматызацыя ўсёй дзяржаўнай службы ў краіне. «Мяркуецца, што будзе ўведзена тры віды службы: дзяржаўная грамадзянская служба, ваенная служба, якая сёння існуе, і служба ў ваенізаваных арганізацыях: МУС, МНС, Следчым камітэце, Дэпартаменце фінансавых расследаванняў, Камітэце дзяржаўнага кантролю. Адпаведна, закладваюцца агульныя прынцыпы і патрабаванні да дзяржаўных чыноўнікаў. Уніфікуюцца падыходы да вызначэння класнасці, званняў, чыноў. Зразумела, што ўводзяцца і нейкія новыя патрабаванні. Яны зводзяцца да павышэння патрабаванняў да канкрэтных людзей, якія будуць працаваць на дзяржаўнай службе па прыкладзе ваеннай службы», — растлумачыў ён.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што дзяржаўны служачы павінен быць патрыётам сваёй краіны і, вядома, прафесіяналам. «Уводзіцца новы прынцып — ацэнка эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўнага служачага. Не трэба лічыць, што сутнасць закона зводзіцца да таго, што ён будзе даваць нейкія прэферэнцыі або льготы. Напэўна, у большай ступені павышаецца патрабавальнасць да дзяржаўных чыноўнікаў. Прадугледжваецца ў якасці дадатку да закона ўвядзенне правілаў службовай этыкі на службе і ў пазаслужбовы час. Дзяржаўны служачы павінен быць прыкладам для ўсіх грамадзян нашай краіны», — канстатаваў ён.

Ігар Сергеенка расказаў, што будуць перагледжаны сацыяльна-прававыя гарантыі ў выпадку накіравання ў іншую мясцовасць, жыллёвыя пытанні, пытанні навучання. Змены закрануць вылічэнне стажу дзяржаўнай службы. Але, па словах, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, фундаментальных змен не плануецца. «Закон ствараецца не на роўным месцы. У ім развіваюцца тыя нормы, якія закладзены ў дзеючым законе», — адзначыў ён.

Будзе перагледжаны шэраг палажэнняў закона, якія патрабуюць карэкціровак. Работа пакуль яшчэ не завершана, яна працягваецца і ў дэпутацкім корпусе, і на ўзроўні экспертнай супольнасці, і сярод дзяржаўных служачых.

Ва ўрадзе

# Ёсць магчымасці для росту

**Беларусь і Малдова імкнуцца выбудоўваць паўнавартаснае супрацоўніцтва ў розных сферах. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас сустрэчы са старшынёй парламента Малдовы Зінаідай ГРАЧАНАЙ, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Беларусь і Малдову звязваюць даўнія партнёрскія адносіны, адкрыты дыялог і ўзаемнае імкненне выбудоўваць паўнавартаснае супрацоўніцтва ва ўсіх сферах», — сказаў Раман Галоўчанка.

Ён падкрэсліў, што ў сучасных умовах неабходна пастаянна ўносіць карэктывы ў праекты і падыходы, знаходзіць новыя ініцыятывы, якія будуць працаваць на карысць народаў дзвюх краін. «Радуе, што, нягледзячы на ўсе складанасці, мы не згубілі гандлёвыя сувязі, той патэнцыял, які напрацоўваўся гадамі. Даныя па двухбаковым гандлі ўсяляюць пэўны аптымізм. Мы прырастаем. Ёсць усе магчымасці для павелічэння паказчыкаў», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Тавараабарот Беларусі і Малдовы ў студзені — лютым склаў $ 33,8 млн (рост у параўнанні з аналагічным перыядам 2020 года на 23,5 %). Беларускі экспарт у гэтую краіну вырас на 41 % — да $ 23,9 млн. Асноўныя пазіцыі беларускага экспарту — нафтапрадукты, тралейбусы, трактары і седлавыя цягачы, лекавыя сродкі, шкловалакно, пліты і плёнкі з пластмас, пруткі з нелегіраванай сталі, яйкі і малочныя прадукты. Аснову імпарту з Малдовы склалі натуральныя вінаградныя віны, кукуруза, моцныя спіртныя напоі, дываны і падлогавыя пакрыцці, кансерваваная агародніна, вінаград.

У Малдове створаны тры зборачныя вытворчасці: тралейбусаў «Белкамунмаш», садова-вінаградарскіх трактароў Смаргонскага агрэгатнага завода, трактароў малой і сярэдняй магутнасці Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў.

# НЕ ДАГЛЯДЗЕЛІ, ДРЭННА ВЫХАВАЛІ, ПАДШТУРХНУЛІ...

## У злачынствах дзяцей заўсёды вінаватыя дарослыя

**Пра гэта ішла размова і на Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці пры Савеце Міністраў. Разам з тым намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА адзначыў, што злачыннасць сярод падлеткаў у Беларусі зніжаецца.**

«Сёння ў краіне выбудавана сістэмная работа па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх. Ёсць адпаведныя вынікі. Па першым квартале колькасць злачынстваў, учыненых непаўналетнімі, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, скарацілася на 9,5 працэнта, колькасць пацярпелых ад злачынстваў дзяцей — на 16,9 працэнта. Аднак, на жаль, абсалютныя лічбы па гэтых паказчыках яшчэ высокія. Прычына кожнага такога выпадку — няўвага, патуранне або несвоечасовае аказанне дапамогі непаўналетняму з боку дарослых», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Паводле яго слоў, падзеі мінулага года выявілі дзве трывожныя тэндэнцыі. «Першая — свядомае ўцягванне дарослымі, у тым ліку бацькамі, дзяцей у проціпраўную дзейнасць, палітычныя гульні, маніпуляванне імі, а ў шэрагу выпадкаў — цынічнае выкарыстанне іх для шантажу. Другая — дэструктыўны ўплыў інфармацыі, што распаўсюджваецца ў сетцы Інтэрнэт, розных мэсэнджарах і сацыяльных сетках. Пры гэтым пераважная частка такіх злачынстваў учыняецца дома, за зачыненымі дзвярыма», — звярнуў увагу віцэ-прэм'ер. На пасяджэнні абмяркоўвалася, як эфектыўна вырашаць гэтыя пытанні, што неабходна зрабіць дзяржаўным органам і арганізацыям для прафілактычнай работы з непаўналетнімі і іх сем'ямі.

«Хацелася б папрасіць усіх бацькоў, каб яны ўважліва сачылі за сваімі дзецьмі, таму што правапарушэнні ажыццяўляюцца падлеткамі ў асноўным у начны час, калі яны павінны быць дома. Таму няхай вашы дзеці будуць з вамі. Сямейныя традыцыі, здаровы лад жыцця — прывучайце іх да гэтага. Дзяцей трэба выхоўваць у духу неабходных каштоўнасных параметраў, — заклікаў Ігар Петрышэнка. — Дарэчы, на гэта звярнуў увагу і Камітэт ААН па правах дзіцяці ў сваім перыядычным аглядзе па выніках мінулага года. Нам неабходна засяродзіць увагу як на прафілактыцы злачынных паводзін дзяцей, так і на выхаваўчым працэсе, традыцыйных сямейных каштоўнасцях».

На пасяджэнні закранулася і тэма патрыятычнага выхавання. «Цяпер Год народнага адзінства, і патрыятычныя акцыі праводзяцца на працягу ўсяго года. Мы актыўна працуем з нашай моладдзю. Гэта асабліва актуальна напярэдадні Дня Перамогі. Моладзь ускладае кветкі ў памяць аб ахвярах Вялікай Айчыннай вайны, віншуе ветэранаў з гэтым святам», — адзначыў віцэ-прэм'ер.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# СУСЕДЗІ, ЦЭНЫ, НАНАТЭХНАЛОГІІ...

**Асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай РАГАШЧУК.**



Гамяльчанка Вера Белавус на прыёме агучыла некалькі пытанняў, што хвалююць яе і суседзяў. У людзей ёсць асцярога, што адкрыццё трох крам на першым паверсе шматпавярховіка негатыўна адаб'ецца на стане зялёных насаджэнняў каля дома.

Яшчэ адзін агульны зварот ад жыхароў дома па вуліцы Інтэрнацыянальнай, 33 — некалькі гадоў таму пасля рэканструкцыі праезнай часткі да шматпавярховіка перанеслі прыпынак грамадскага транспарту, паток людзей і машын заўсёды вельмі вялікі. Ці магчыма перанесці прыпынак бліжэй да нежылых будынкаў?

**Старшыня гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА,** які прысутнічаў на прыёме, запэўніў, што з адкрыццём новых гандлёвых цэнтраў зялёную зону не закрануць. Пытанне аб пераносе прыпынку грамадскага транспарту Мікалай Рагашчук будзе высвятляць на месцы.

На прыём звярнулася пенсіянерка са Жлобіна Кацярына Дзмітрыеўна. Жанчына паскардзілася, што яе сусед падвёў вадасцёкавую трубу да падмурка яе дома — цяпер у хаце сырасць і цвіль. Акрамя таго, жлабінчанка запэўніла, што суседзі незаконна прыватызавалі частку яе зямельнага ўчастка. Памочнік Прэзідэнта адзначыў, што па адрасе заяўніцы прыйдзе камісія на чале з намеснікам старшыні Жлобінскага райвыканкама і правядзе абследаванне жылля.

Некалькі зваротаў датычылася сферы аховы здароўя. Яўген і Людміла Манкевічы са Светлагорска распавялі, што з іх дачкой адбыўся няшчасны выпадак на рабочым месцы. Бацькі спрабуюць дамагчыся, каб факт вытворчай траўмы і ступень цяжкасці нанесеных пашкоджанняў былі ў поўнай меры ўнесены ў медыцынскую карту. Усе звароты па сферы аховы здароўя ўзяты на кантроль.

На прыём з прапановай прымяніць нанатэхналогіі ў сельскай гаспадарцы прыйшоў жыхар абласнога цэнтра Алег Багданаў. Ён распавёў, што вытворчасцю ўгнаенняў на аснове актыўнага крэмнію займаецца яго маскоўскі партнёр. Па словах прадстаўніка кампаніі-вытворцы, у сярэднім за сезон выкарыстанне нанакрэмнію дае рэнтабельнасць больш за 600 %. Эканамічны эфект падлічаны пакуль толькі па трох культурах — злакавых, кукурузе і цукровых бураках. Вытворца гатовы бясплатна даць амаль 800 кілаграмаў для эксперыментальнага выкарыстання нанакрэмнію ў гаспадарках Гомельскай вобласці. Дэталёва абмяркоўваць гэтае пытанне ініцыятары эксперымента цяпер будуць з супрацоўнікамі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама.

Усяго на прыём звярнуліся дзевяць чалавек.

— Гэта адначасова складана і цікава. Прыемна, што некаторыя гамяльчане прыходзілі сёння для вырашэння не толькі ўласных пытанняў, але закраналі і тэмы, якія датычацца многіх людзей. Такую форму работы працягнем. Плануем таксама выязныя прыёмы ў розныя раёны вобласці, — падсумаваў Мікалай Рагашчук вынікі першага прыёму на пасадзе памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гомельскай вобласці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота gp.by**

Трэба памятаць...

# У Беларусі ў кожнай сям'і ёсць гісторыя, звязаная з вайной

**Напярэдадні Дня Перамогі «звяздоўцы» разам з калегамі-журналістамі, кіраўніцтвам Міністэрства інфармацыі аддалі даніну памяці і павагі ўсім тым, хто не вярнуўся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны, цаной свайго жыцця наблізіў Перамогу і падарыў нам магчымасць жыць і працаваць пад мірным небам Беларусі.**

«Звяздоўцы» разам з калегамі ўзялі ўдзел у акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага», прысвечанай 76-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, і ўсклалі кветкі да п'едэстала 45-метровай стэлы «Мінск — горад-герой» у памяць аб усіх ахвярах той жахлівай трагедыі, якая пазбавіла жыцця кожнага трэцяга беларуса...



Адказваючы на пытанне журналістаў пра сямейную гісторыю, звязаную з вайной, **міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ** акцэнтаваў увагу на тым, што не ведае ніводнай беларускай сям'і, у якой няма гісторыі, звязанай з Вялікай Айчыннай вайной.

— І калі чуеш такія гісторыі, разумееш, што вайна і чалавек — гэта два несумяшчальныя паняцці, — падкрэсліў ён. — І тыя, хто цяпер імкнецца бравіраваць, перапісаць гісторыю, расказаць, што ўсё было не так жахліва і гэта не была агрэсія фашысцкай Германіі, а проціборства нейкіх дзвюх таталітарных сістэм, — гэта сапраўдная хлусня!

Міністр нагадаў, што па задуме агрэсараў з гітлераўскай Германіі нас не павінна было тут быць наогул: ні як краіны, ні як нацыі, ні як народа.

— І перагляд вынікаў Вялікай Айчыннай вайны, спроба перапісвання гісторыі — гэта, верагодна, самае страшнае, што цяпер можа адбыцца, — перакананы Уладзімір Пярцоў. — У нас, дзякуй богу, за навейшую гісторыю Беларусі такіх спроб не было.

Ён падкрэсліў, што у нашай краіне ўсё, што датычыцца ўвекавечання памяці (у кінадакументалістыцы, у доглядзе помнікаў і абеліскаў, у рабоце школ з маладым пакаленнем), — выконваецца на дастаткова высокім узроўні.

— Але, бачыце, другі бок працягвае спрабаваць (і апошнім часам дастаткова агрэсіўна) змяніць наш гістарычны код: гэта прыпісванне нейкіх не адпаведных нам рыс, гераізацыя тых людзей, якія ўжо прызнаны (у тым ліку і судом) злачынцамі, — звярнуў увагу міністр. — І мне падаецца, што кожны раз, не толькі 9 Мая (хоць гэта адно з самых галоўных свят нашай краіны), мы — журналісты — павінны згадваць і рабіць усё магчымае для таго, каб гэтая памяць захавалася, і каб тыя, хто будзе супраць нас, ведалі гэтую адзіную гістарычную праўду.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГУ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 8 мая, з 9.00 да 12.00, правядуць:**

намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# Дажджліва, а месцамі — замаразкі

### Але на наступным тыдні пацяплее

**Пачатак мая ў нас нейкі няправільны. Месцамі так холадна, што нават узнікае ўражанне, быццам вярнуліся ў красавік ці ў канец сакавіка. На сёння па заходняй палове нашай тэрыторыі сума ападкаў ужо дасягае 30—40 % майскай нормы, а на асобных метэастанцыях зарэгістравана і да 80 % нормы апошняга веснавога месяца. І дажджы спыняцца не збіраюцца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу на большай частцы нашай тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Вецер удзень у многіх раёнах краіны будзе ўзмацняцца да моцнага парывістага. Уначы — плюс 2—9 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 6—12 цяпла.

У нядзелю пераважна без ападкаў. Вецер па заходняй чвэрці будзе ўмераны, уначы на паўночным усходзе парывісты. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны будзе плюс 1—6 градусаў, на глебе і месцамі ў паветры чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 3 градусаў. У дзённыя гадзіны тэмпература паветра складзе 11—17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е зменіцца да лепшага. У Беларусь пачнуць паступаць паветраныя масы з поўдня Еўропы і ўсталюецца цёплае надвор'е. У панядзелак істотных ападкаў не чакаецца. Тэмпературны рэжым будзе рэзка кантрасны. Так, тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 1 градуса да 8 цяпла, але месцамі на паўночным усходзе замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Аднак днём паветра прагрэецца да 17—24 цяпла. І ў аўторак — без ападкаў. Уначы — плюс 3—10 градусаў, па захадзе — да плюс 12 градусаў. Удзень чакаецца 19—26 цяпла.

У сераду ўначы без ападкаў, удзень у асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы — плюс 5—12 градусаў. У дзённыя гадзіны да плюс 16—22 градусаў, у асобных раёнах — да 25 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На мяжы галоднай смерці апынуліся больш чым 155 мільёнаў чалавек

Паводле даных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO), па меншай меры звыш 155 мільёнаў чалавек у 55 краінах свету сутыкнулася летась з вострай формай адсутнасці харчовай бяспекі. Гэта прыкладна на 20 мільёнаў чалавек больш, чым у 2019-м. Эксперты заяўляюць аб пяцігадовым максімуме (у 2016-м гаворка ішла пра 94 мільёны жыхароў планеты) і адной з галоўных прычын пагаршэння крызісу называюць пандэмію і выкліканыя ёй эканамічныя ўзрушэнні. «Праз год пасля абвяшчэння пандэміі COVID-19 прагнозы на 2021-ы і наступныя гады застаюцца несуцяшальныя, — у сумеснай заяве FAO, ЕС, Сусветная харчовая праграма ААН (члены-заснавальнікі Глабальнай сеткі па барацьбе з харчовымі крызісамі) і Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці адзначаюць зацяжны характар частых крызісаў і заклікаюць сусветную супольнасць да радыкальных рэформаў. — Пандэмія прадэманстравала ўразлівасць глабальнай харчовай сістэмы і неабходнасць стварэння больш справядлівых, устойлівых і жыццяздольных сістэм, каб забяспечыць здаровым і стабільным харчаваннем 8,5 мільярда чалавек да 2030 года». У найбольш цяжкай сітуацыі летась апынулася каля 133 тысяч жыхароў Буркіна-Фасо, Емена і Паўднёвага Судана.

### Жанчына ў Малі нарадзіла дзевяцярых дзяцей запар



25-гадовая Халіма Сіса паспяхова нарадзіла адразу дзевяцярых немаўлят. Пра гэта паведаміў малійскі партал навін Maliweb са спасылкай на заяву Міністэрства аховы здароўя і сацыяльнага развіцця Малі. Роды ў жанчыны прымалі ў Марока — менавіта туды, у спецыяльную клініку, адправілі парадзіху ўлады краіны. «Я шчаслівы, вельмі-вельмі шчаслівы, — прызнаўся ў інтэрв'ю Бі-бі-сі бацька немаўлят. — Мая жонка і дзеці [пяцёра дзяўчынак і чацвёра хлопчыкаў] адчуваюць сябе выдатна». Дзевяцярня — надзвычай рэдкая з'ява, звычайна звязаная з ускладненнямі, у выніку якіх нованароджаныя паміраюць. Медыкам вядомыя два такія выпадкі — у Аўстраліі ў 1971 годзе і ў Малайзіі ў 1999-м, і ў абодвух ніхто з дзяцей не выжыў. Муж Халімы па-ранейшаму знаходзіцца ў Малі са старэйшай дачкой, але, па яго словах, ён увесь час падтрымлівае сувязь з жонкай у бальніцы і не хвалюецца пра будучыню сям'і, якая нечакана стала шматдзетнай. На адну жанчыну ў краіне, паводле даных Сусветнага банка, прыпадае 6,3 дзіцяці. Па дадзеным паказчыку Малі саступае ў свеце толькі суседняй краіне — Нігерыі. Гэтая дзяржава ўваходзіць у Афрыцы ў тройку краін з самым маладым насельніцтвам. Сёння сярэдні ўзрост жыхара Малі складае 16,3 года.

### Пятая пясчаная бура накрыла Пекін

Яна прыйшла з Унутранай Манголіі, паведаміла РІА «Навіны». Першая ў гэтым годзе і самая моцная за апошнія 10 гадоў пясчаная бура адбылася ў Пекіне 15 сакавіка, калі якасць паветра рэзка пагоршылася і забруджванне дасягнула небяспечнага для здароўя ўзроўню. Другая адбылася 28 сакавіка, трэцяя — 15 красавіка, а чацвёртая — 26 красавіка. Метэаралагічнае бюро Пекіна апублікавала «сіні» ўзровень папярэджання. Эксперты тлумачаць высокую частату пясчаных бур у кітайскай сталіцы надвор'ем. У раёнах паходжання пяску было цёпла, а ападкаў мала, што і стала асноўнай прычынай узнікнення прыродных катаклізмаў.

# ГЭТА НАШ СЦЯГ, ГЭТА НАША КРАІНА

**Дзяржаўныя сцяг, герб і гімн адлюстроўваюць гістарычныя, духоўныя і маральныя якасці нацыі, асаблівасці культуры і светапогляду народа, яго самавызначэнне і самастойнае развіццё. Штогод у другую нядзелю мая ў нашай краіне адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга.**

Рыхтуюцца да гэтага ўрачыстага дня і ў Мінскай вобласці. На Кургане Славы 9 мая адбудзецца мерапрыемства, прысвечанае 76-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, Дню Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь з удзелам старшыні Мінаблвыканкама Аляксандра Турчына, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, моладзі, ветэранаў.

У Бярэзінскім раёне запланаваны ўрачысты прыём у члены Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «У сімвалах гісторыя краіны», аўтапрабег «Сімвалы доблесці і народнага гонару», конкурс малюнкаў «Якога колеру Радзіма?»

На Барысаўшчыне пройдзе флэшмоб «Ганаруся маёй краінай», будзе працаваць пляцоўка, прысвечаная ўрачыстаму дню, дзе жыхары змогуць паслухаць канцэрт з песнямі пра Беларусь. Усім прысутным раздадуць сцяжкі з дзяржаўнай сімволікай, запусцяць паветраныя шары. Усе ахвотныя змогуць паўдзельнічаць у спаборніцтвах па маўтынбайку, у патрыятычным флэшмобе «Падымем сцяг разам», у акцыі «Гэта мой сцяг, гэта мая Беларусь».

У Валожынскім раёне збярэцца каардынацыйны савет грамадскіх арганізацый і палітычных партый. А ў кінатэатрах перад пачаткам сеансаў пакажуць хроніка-дакументальны фільм «Герб і сцяг маёй краіны». У Клецку арганізуюць круглы стол у фармаце «сустрэчы пакаленняў» на тэму «У сімвалах — гісторыя краіны». 9 мая тут стартуе акцыя-эстафета «Беларусь пачынаецца з мяне». Яна працягнецца да Дня Незалежнасці Беларусі 3 ліпеня.

Супрацоўнікі Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Тышкевічаў правядуць урок грамадзянскасці «З гісторыі дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Патрыятычны марафон, флэшмобы, велапрабегі

### У Гродзенскай вобласці на працягу некалькіх дзён адбудзецца звыш трыццаці мерапрыемстваў, прысвечаных Дзяржаўнаму гербу і Дзяржаўнаму сцягу

**Цыкл святочных падзей пачаўся 5 мая з 75-й лёгкаатлетычнай эстафеты, прысвечанай 76-й гадавіне Перамогі і Дню дзяржаўных сімвалаў. Традыцыйна эстафета праводзіцца на прызы газеты «Гродзенская праўда». Месцам правядзення сталі гарадскія вуліцы.**

А вось для маладзёжнага флэшмобу ў Навагрудскім раёне, які таксама адбыўся ў гэты дзень, месца не мела значэння. Галоўнае, каб задума акцыі адпавядала вызначанай тэме. Трэба сказаць, што школьнікі і моладзь праявілі фантазію. Кожная група стварыла свой арыгінальны сюжэт з выкарыстаннем дзяржаўнай сімволікі.

6 мая каля Кургана Славы ў Гродне адбылося адкрыццё двухдзённай патрыятычнай гульні «Зарніца». Як расказаў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага гарвыканкама Аляксандр КАВАЛЕНКА,** школьнікі прадэманстравалі страявую падрыхтоўку, выканалі ваенізаваныя элементы і паказалі ўменне маршыраваць з песняй.

Свой цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга, праходзіць і ва ўсіх гродзенскіх універсітэтах. Напрыклад, у ГрГУ імя Я. Купалы адбудзецца фінал патрыятычнага марафону, у якім прымуць удзел 13 універсітэтаў краіны.




Падчас флэшмобу ў Навагрудку.

Школы Гродна праводзяць конкурс малюнкаў «Сімвалы маёй краіны», вынікі якога будуць падведзены непасрэдна ў дзень свята — 9 Мая. Многія мерапрыемствы ладзяцца менавіта ў гэты дзень, бо сёлета Дзень герба і сцяга, які адзначаецца ў другую нядзелю мая, супаў з Днём Перамогі. Непасрэдна ў нядзелю адбудзецца абласная акцыя «Сімвал адзінства і славы», у рамках якой а 9 гадзіне раніцы Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь адначасова падымуць на ўсіх флагштоках вобласці. У Гродне такіх пунктаў больш за дваццаць.

Тэма сімвалаў краіны была ўзнята падчас маладзёжнай дыялогавай пляцоўкі ў аграгарадку Алекшыцы Бераставіцкага раёна.

У Ваўкавыску рыхтуюцца да святочнага шэсця 9 мая. Яго ўдзельнікі будуць несці ў руках двухметровы герб і 12-метровы сцяг.

У Мастах дэпутаты Маладзёжнага парламента арганізуюць інтэлект-батл на тэму дзяржаўнай сімволікі.

У многіх раёнах вобласці адбудуцца тэматычныя вела- і аўтапрабегі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# У гонар Перамогі і дзеля адзінства

**У Магілёве 9 Мая адзначаць адкрыццём крамы дзяржаўнай сімволікі і прэм'ерай твора магілёўскага пісьменніка Алеся Казекі на тэму спаленых вёсак.**

Наогул, святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 76-й гадавіне Перамогі, распачаліся тут 1 мая. Сёння ў вобласці пражывае 286 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Адмысловыя рабочыя групы аказваюць комплексную дапамогу ім і асобам, пацярпелым ад наступстваў вайны. Героўў Вялікай Айчыннай наведвае кіраўніцтва горада і вобласці, моладзь, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Пра падзеі тых гадоў нагадваюць выстаўленыя ў вокнах бібліятэк і ўстаноў адукацыі малюнкі і фотаздымкі. Кожны дзень у абласным цэнтры праходзяць спартыўныя і інтэлектуальныя спаборніцтвы, прысвечаныя Перамозе. Музеі праводзяць артзанняткі на ваенную і патрыятычную тэматыку. А бібліятэкі Магілёва аб'явілі агульнасістэмны гісторыка-патрыятычны марафон «Я размаўляю з табой з 41-га...»

Дзень Перамогі ў Магілёве пачнецца са святочнага мерапрыемства «Адна на ўсіх Вялікая Перамога». На плошчы Славы адбудзецца маладзёжная патрыятычная акцыя «Ганарымся Радзімай сваёй», прысвечаная Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. У гэты ж дзень у Магілёве ўрачыста расчыніць свае дзверы крама дзяржаўнай сімволікі. Пра тое, чым будзе адрозніваецца гэты гандлёвы аб'ект, «Звязда» ўжо паведамляла.

Свята Перамогі ў Магілёве будуць святкаваць адначасова на некалькіх буйных пляцоўках: на плошчы Славы, у Пячэрскім лесапарку, каля гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Атрыум» і іншых. А на сцэне старадаўняга Магілёўскага абласнога драмтэатра адбудзецца прэм'ера літаратурнай музычна-пластычнай кампазіцыі паводле паэмы магілёўскага пісьменніка Алеся Казекі «Марыйка». Гэта кранальная гісторыя пра дзяўчыну, якой удалося атрымалася пазбегнуць смерці. Падзеі адбываюцца 15 чэрвеня 1942 года, калі ў вёску Боркі Кіраўскага раёна ўварваліся карнікі і жыўцом спалілі 2000 жыхароў гэтай і найбліжэйшых вёсак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# Свята з крэатывам

**У Віцебскай вобласці многія ўспрымаюць мерапрыемствы, прысвечаныя гадавіне Перамогі, Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, як адно цэлае. І гэта лагічна. Без Перамогі не было б незалежнай, прыгожай, спакойнай, мілай сэрцу краіны, сімваламі якой з'яўляюцца дзяржаўныя атрыбуты.**



У навучальных установах арганізоўваюць тэматычныя ўрокі, падводзяць вынікі патрыятычных праектаў, школьнікі робяць сваімі рукамі сувеніры для тых, каму мы абавязаны чыстым небам. Праводзяць і крэатыўныя акцыі.

У прыватнасці, да Дня Перамогі віцебскія ратавальнікі 5 мая правялі анлайн-парад у рэжыме відэасувязі з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, былымі работнікамі пажарнай аховы.

На Віцебшчыне трое ветэранаў — калегі тых, хто заўсёды ў выпадку надзвычайнага здарэння прыйдзе на дапамогу: Фёдар Піліпавіч Конаў, Іван Іванавіч Цераханў і Павел Фёдаравіч Гнеўка. У самым сэрцы плошчы Перамогі абласнога цэнтра на экране манітора ўдзельнікі мерапрыемства ў рэжыме рэальнага часу змаглі ўбачыць ветэранаў і паразмаўляць з імі.

У сваю чаргу ветэраны ў рэжыме відэасувязі назіралі, як перад мемарыяльным комплексам работнікі МНС і юныя ратавальнікі з ліку навучэнцаў сярэдняй школы № 46 Віцебска сталі з фотаздымкамі сваіх дзядоў — удзельнікаў вайны і загінулых салдат.

Ветэранам кожны змог сказаць «дзякуй» за вызваленне Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў.

Потым прагучала песня «Дзякуй дзеду за Перамогу» ў выкананні ратавальнікаў і вакальнай групы «Гукі ветру». Парадны пажарны разлік з ліку афіцэраў Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС прайшоў урачыстым маршам.

У завяршэнні ўдзельнікі акцыі ўсклалі кветкі да вечнага агню.

У інтэрнэце можна ўбачыць нямала відэавішаванняў з такімі важнымі для нас святамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС.**

# У сімвалах дзяржавы — гісторыя народа

**Педагогі-арганізатары, класныя кіраўнікі, намеснікі дырэктараў устаноў адукацыі па выхаваўчай рабоце Ленінскага раёна Брэста сабраліся на круглы стол па дзяржаўнай сімволіцы ў актавай зале сярэдняй школы № 8 імя Героя Беларусі Уладзіміра Карвата. Месца для мерапрыемства было выбрана невыпадкова. Школьны музей у гонар выпускніка школы, першага Героя Беларусі, стаў своеасаблівым цэнтрам патрыятычнага выхавання.**

Гэтым разам абмяркоўвалі работу школьных калектываў па папулярызацыі дзяржаўнай сімволікі, месца і ролю такой работы ва ўсім выхаваўчым працэсе. Навуковымі і практычнымі распрацоўкамі падзяліліся **намеснік дэкана юрыдычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Эдуард СЕВЯРЫН** і **метадыст аддзела адукацыі Ленінскага раёна Брэста Алена КУШЧЫНСКАЯ.**

Калегі абменьваліся вопытам, расказвалі аб сваіх цікавых мерапрыемствах, творчых знаходках. Паводле слоў педагога-арганізатара школы № 8 Аляксандры БЫЦКО, пра дзяржаўныя сімвалы, што нераздзельна звязаны з гісторыяй народа, расказваюць найперш на інфармацыйных гадзінах. Пры гэтым для розных узроставых катэгорый выбіраюцца найбольш прымальныя формы работы.

У восьмай школе памятныя мерапрыемствы, урокі мужнасці традыцыйна праводзяцца ў музеі Уладзіміра Карвата. Школьнікі праводзяць тут экскурсіі для гасцей, разважаюць пра гонар і мужнасць. Дарэчы, план мерапрыемстваў на гэты месяц у школе называецца «Героі нашага часу». Справа ў тым, што 23 мая спаўняецца 25 гадоў з дня гібелі Героя Беларусі Уладзіміра Карвата і дня яго подзвігу. У той дзень 1996 года падпалкоўнік адвёў ад населенага пункта самалёт, што страціў кіраванне. Сам лётчык катапультавацца не паспеў... Зноў ва ўсіх класах згадаюць былога выпускніка. Зноў ускладуць кветкі да яго памятных месцаў, і крыху прыспусцяць Дзяржаўны сцяг, каб аддаць даніну памяці і пашаны.

Абласное свята, прысвечанае Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга краіны пройдзе ў Цэнтры маладзёжнай творчасці 7 мая.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПРЫГОЖА І ЦІКАВА

**Расквечаныя ў колеры нацыянальнай сімволікі фасады будынкаў, кветнікі як прыродныя акварэлі дзяржсімвалаў, займальныя квэсты, акцыі, чэленджы... Да святкавання Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга нестандартна падышла Гомельшчына.**

Майстар-класы па вырабе сувенірнай прадукцыі з атрыбутамі дзяржаўнай сімволікі для ўсіх жадаючых правялі ў Акцябрскім, Рэчыцкім, Светлагорскім, Чачэрскім, Буда-Кашалёўскім і Брагінскім раёнах вобласці. У рэгіёне абвешчаны акцыі: «Ганарымся Радзімай сваёй» — прыём у шэрагі БРСМ і БРПА з уручэннем сцяжкоў Рэспублікі Беларусь, «Сімвал гонару і славы» — размяшчэнне Дзяржаўнага сцяга на балконах і флагштоках домаўладанняў. На Жлобіншчыне арганізаваны раённы конкурс «Сцяг-шоу», які прадстаўляе паказальныя выступленні гуртоў сцяганосцаў. У Гомелі дзяржаўны педагагічны каледж імя Выгоцкага рэалізоўвае свой новы праект — інтэрактыўную інсталяцыю «Гісторыя і цікавыя факты Герба Гомельскай вобласці».

Між тым непасрэдна ў дзень свята — 9 мая — у абласным цэнтры на пляцоўцы каля Дошкі Пашаны Гомельскай вобласці пройдзе ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Адзначаць свята і ў раёнах. Тэматычны мітынг пройдзе на цэнтральнай плошчы Рэчыцы. Запусцяць паветраныя шары ў колерах нацыянальнай сімволікі жыхары Добруша, Жлобіна і Акцябрскага. Сцяг-шоу «Сімвал гонару і славы» збярэ ўдзельнікаў на цэнтральнай плошчы Рагачова.

Дарэчы, моладзь Гомельшчыны актыўна бярэ ўдзел у святочных мерапрыемствах праз месенджары і сацыяльныя сеткі. Так, запушчаны анлайн-флэшмоб «Беларусь — краіна маёй будучыні», чэлендж #Сімвалымаёйкраіны, рыхтуюцца відэавіншаванні са святамі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# І ПАСЛЯ НАС ПРЫЙДУЦЬ, І КВЕТКУ ПАКЛАДУЦЬ

## СЦЯНА З ТАБЛІЧКАМІ

У Сухопалі, у самым цэнтры вёскі, уладкаваны цэлы памятны комплекс побач з брацкай магілай. Там знайшлі спачын франтавікі, якія загінулі ў баях з захопнікамі. Толькі тры прозвішчы ўдалося ўстанавіць, астатнія лічацца невядомымі. Усяго пад абеліскам пахаваны 21 чалавек. Помнік тут стаяў даўно. Да пачатку 90-х гадоў ён стаў разбурацца. За аднаўленне яго ўзялося тагачаснае сельгаспрадпрыемства. Тады гэта быў калгас «Іскра».

Былы яго старшыня Уладзімір Астапчык згадаў, што ў пачатку 90-х праўленне прыняло рашэнне не толькі паставіць новы помнік на брацкай магіле, але і ўвекавечыць памяць усіх землякоў, хто не вярнуўся з вайны. Эскіз мемарыяла намаляваў не прафесійны мастак ці архітэктар, а калгасны спецыяліст Ірына Прытульчык. Менавіта Ірына Уладзіміраўна з вялікім жаданнем узялася за гэту работу. Падключыўся сельскі Савет: удакладнілі спісы загінулых землякоў, апытвалі старажылаў, звяралі са звесткамі, якія рыхтаваліся для кнігі «Памяць».

У выніку вырабілі 12 мемарыяльных пліт, якія размясцілі на бетоннай сцяне. На плітах напісаны прозвішчы землякоў з кожнай вёскі. Для Хвалава, напрыклад, спатрэбіліся аж чатыры пліты. З гэтай, некалі адной з самых вялікіх вёсак у акрузе з вайны не вярнуліся 42 чалавекі. У Сухопалі жонкі і маці не дачакаліся 23 франтавікоў, з Гален загінула 20 мужчын, з Клятнога — 17.

На месцы брацкай магілы ўстанавілі асобны абеліск у адным стылі з памятнай сцяной. Усё аб'ядналі ў адзіны комплекс з клумбамі для кветак, плітачнымі дарожкамі, малымі архітэктурнымі формамі. Урачыста адкрылі яго 9 мая 1995 года.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## З СІМВАЛАМ МІРУ

У суседняй Мураве паглядзелі на Сухопаль і вырашылі не адставаць. І ўжо праз два гады, у 1997-м, у цэнтры вёскі паставілі высокі абеліск з буслам наверсе — сімвалам міру і дабрабыту. На стэле гэтага абеліска размясцілі мемарыяльныя пліты з прозвішчамі загінулых таксама па вёсках. Фінансаваннем і арганізацыяй вырабу помніка займаўся тагачасны калгас імя Калініна, цяпер ААТ «Мурава». Намеснік дырэктара гаспадаркі Аляксандр Маркечка гаворыць:




**Помнік у Мураве.**

— Тады я ў школе вучыўся, памятаю, як абеліск устанаўлівалі, якую работу перад гэтым праводзілі. Школа таксама прымала ўдзел у пошуку звестак, запісвалі сведчанні ветэранаў і старажылаў. У нас ёсць яшчэ адзін помнік на могілках. Гэта брацкая магіла расстраляных жыхароў Муравы. Расказвалі, нехта з вяскоўцаў стрэліў у напрамку нямецкай калоны. За гэта правялі паказальную «выхавальную» акцыю — расстралялі 11 жыхароў вёскі. Кожнае 9 Мая нясём туды вянок, як і да помніка ўсім загінулым землякам у цэнтры вёскі.

І калі ў названых вышэй населеных пунктах, якія з'яўляюцца цэнтрамі сельсавета і гаспадаркі, помнікі ўзводзілі сельгаспрадпрыемствы, то невялікая вёска Зарэчча абавязана захаваннем памяці яе выхадцам-энтузіястам. У Зарэччы засталася жменька жыхароў, усе яны маюць узрост 80+. Вёска паступова і няўмольна знікала менавіта па прычыне паважанага ўзросту яе насельнікаў і праз некалькі гадоў знікла б, але стала вёскай-мемарыялам.



**Сваякі каля партрэта франтавіка ў Зарэччы.**

## ВЁСКА-МЕМАРЫЯЛ

Усяго з Зарэчча на вайну пайшлі 59 мужчын, 27 з іх не вярнуліся. А тыя, каму пашчасціла вярнуцца, у асноўным працавалі ў калгасе. У гаспадарцы ўдзельнікаў вайны заўсёды шанавалі. Адзін з актыўных калгасных парторгаў сабраў некалі па хатах фотаздымкі ветэранаў і размясціў іх на стэндзе пад назвай «Вечная слава героям».

Той вялікі стэнд, які ўсе ведалі, доўга вісеў у «чырвоным кутку» калгаснага двара. А потым многае змянілася, пачалася рэарганізацыя, былы калгасны двор прыйшоў у занядпад, фермы сталі закрываць, пабудовы зносіць. Стэнд выпадкова знайшоў і ўратаваў ад знішчэння выхадзец з гэтай вёскі Георгій Швед. Георгій Яраслававіч сабраў здымкі і пачаў абсталёўваць свайго роду музей у бацькоўскім доме.

Аднойчы ён паказаў матэрыялы і здымкі земляку Міхаілу Куцу. Міхаіл з'ехаў з Залесся адразу пасля школы, паступіў у ваеннае вучылішча, служыў у розных месцах былога Саюза, потым асеў у Брэсце, адкрыў сваю справу. І хоць бацькоў яго няма з сярэдзіны 80-х, у вёску прыязджаў заўсёды, як сам казаў, цягнула сюды.

Тады яны з Георгіем і задумаліся, як увекавечыць памяць землякоў. У Міхаіла Куца, дарэчы, бацька таксама ваяваў, але, на шчасце, вярнуўся. Бацька яго жонкі таксама франтавік, так што для сям'і гэтая тэма асаблівая. Паступова нарадзілася ідэя зрабіць памятную алею.

Расходы ўзяў на сябе прадпрымальнік. Былі выраблены мемарыяльныя дошкі з фотапартрэтамі загінулых землякоў. Іх выставілі ў выглядзе алеі, у канцы якой паставілі памятны знак-арку са званом. Чыіх здымкаў не знайшлі, напісалі прозвішчы на асобнай дошцы. Пазней справа ад аркі ўзвялі капліцу. Яе купал, унутранае начынне падрыхтавалі ў Брэсце, а сюды прывезлі гатовыя кампаненты і змантавалі. Мемарыял маюць намер развіваць далей, з часам тут будзе стаянка для машын, сквер.

Першая мемарыяльная дошка на алеі прысвечана Мікалаю Гуку 1926 года нараджэння. Загінуў у 1945-м, цалкам верагодна, што да сваіх дзевятнаццаці хлопец не дажыў. Партрэт яго паставілі першым нездарма, цяпер ён стаіць акурат насупраць сваёй хаты, адкуль яго праводзілі на вайну.

Кожны год з'язджаюцца выхадцы з Залесся і праводзяць свята вёскі. Прыязджаюць і тыя, чые родныя ўвекавечаны на партрэтах, паказваюць унукам-праўнукам, расказваюць пра іх продкаў, што загінулі на вайне.

З Міхаілам Куцам мы стаялі якраз каля партрэта Мікалая Гука. Міхаіл Міхайлавіч разважае:

— Прыйдзе час, і вёскі не будзе як населенага пункта, але мы павінны захаваць яе для сябе, для сваіх дзяцей і ўнукаў. Нехта ж абавязкова і пасля нас прыйдзе-прыедзе, нехта кветку пакладзе на 9 Мая. Спадзяюся, што нашчадкі не забудуць сюды дарогу. Мы ў даўгу перад такімі, як Мікалай Гук, яго дзеці не нарадзіліся, не прыйдуць да помніка ўнукі. Значыць, мы, тыя, хто нарадзіліся, павінны захаваць памяць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і Валерыя КАРАЛЯ.**
*Пружанскі раён.*

---

Беларусы замежжа

# Сувязь паміж Украінай і Беларуссю трэба пашыраць



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК перадае Ігару МОШКІНУ камплекты беларускіх нацыянальных касцюмаў.**

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК напярэдадні святкавання Дня Перамогі сустрэўся з намеснікам старшыні Усеўкраінскага саюза беларусаў Ігарам МОШКІНЫМ. На сустрэчы абмяркоўвалі работу з нацыянальна-культурнымі аб'яднаннямі і ўзнімалі пытанні супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой.**




Падчас сустрэчы Аляксандр Румак расказаў, як у Беларусі рэалізоўваюцца правы і свабоды прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў, якіх у нашай краіне налічваецца больш за 150. Упаўнаважаны асабліва адзначыў той факт, што, нягледзячы нават на змену месца жыхарства, людзі розных дыяспар захоўваюць свае нацыянальныя традыцыі.

«У іх ёсць жаданне не забыць родную культуру, родную мову. Таму дапамога з боку дзяржавы вельмі важная. Сёння ў нашай краіне існуе 205 зарэгістраваных нацыянальных аб'яднанняў і 25 нацыянальных супольнасцяў. Пры ўпаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў існуе Кансультатыўны міжэтнічны савет, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі амаль усіх нацыянальных супольнасцяў. Пры гэтым яны самастойна вырашаюць пытанні размеркавання фінансавай дапамогі, якая аказваецца дзяржавай на правядзенне статутнай дзейнасці», — сказаў Аляксандр Румак.

Па словах упаўнаважанага, грошы выдаткоўваюцца перш за ўсё на культурнае развіццё, адукацыйную дзейнасць, выданне кніг, якія распавядаюць пра жыццё прадстаўнікоў той ці іншай нацыянальнасці ў нашай краіне, на правядзенне мерапрыемстваў, якія арганізоўваюцца гэтымі аб'яднаннямі па ўсёй рэспубліцы. Акрамя таго, нацыянальна-культурныя аб'яднанні рэгулярна прымаюць удзел у такіх акцыях, як «Нашы дзеці», «Тыдзень лесу», і мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі.

«Гэта вельмі збліжае людзей, — дадаў Аляксандр Румак. — Таму для нас важна падтрымліваць традыцыі, ствараць магчымасць збірацца разам з суайчыннікамі, займацца карыснымі справамі. Наша дзяржава робіць шмат для таго, каб людзі маглі рэалізаваць сваё імкненне да захавання нацыянальна-культурных традыцый. У 2020 годзе было выдзелена больш за 37 тысяч рублёў на падтрымку нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў».

Ігар Мошкін у сваю чаргу праінфармаваў пра дзейнасць Усеўкраінскага саюза беларусаў па захаванні і развіцці самабытнасці беларусаў Украіны. Ён расказаў, што сёння на тэрыторыі Украіны пражывае каля 240 тысяч нашых суайчыннікаў. Там рэгулярна праходзяць мерапрыемствы па папулярызацыі беларускай культуры і мовы, нашых народных традыцый і звычаяў, а Дзень Незалежнасці Беларусі, Дзень роднай мовы і, вядома, 9 Мая беларусы адзначаюць па ўсім свеце.

«Кожная краіна і нацыянальнасць маюць права на існаванне, калі яны памятаюць сваю гісторыю. Украіна і Беларусь маюць вялікую агульную гісторыю. Калі ўзяць нават апошнія 100 гадоў — Вялікую Айчынную вайну. Ваявалі беларусы з украінцамі і рускімі плячо да пляча, і нашы дзяды адстаялі наша жыццё. Дзень Перамогі адзначаецца і ва Украіне, і ў Беларусі. Усе пра гэта памятаюць. Перамога была агульная, яе ніхто не дзяліў», — адзначыў прадстаўнік Усеўкраінскага саюза беларусаў.

На думку Ігара Мошкіна, нягледзячы на тое, што Украіна ідзе па еўрапейскім вектары развіцця, эканамічныя сувязі паміж нашымі краінамі варта пашыраць.

На сустрэчы абмяняліся і памятнымі падарункамі. Прадстаўнік Усеўкраінскага саюза беларусаў павязе з сабой сувеніры, кнігі і нацыянальныя касцюмы для сяброў беларускіх дыяспар у Чарнігаве, Кіеве і Міргарадзе. Таксама спецыяльна для старшыні Чарнігаўскай грамадскай арганізацыі «Беларускае нацыянальна-культурнае таварыства «Сябры» Галіны Варажбіт, якая была дэлегатам ад Усеўкраінскага саюза беларусаў на VI Усебеларускім народным сходзе, Аляксандр Румак перадаў беларускі нацыянальны касцюм, пашыты па мерках, знятых з жанчыны, калі яна знаходзілася на радзіме.

**Намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Алена РАДЧАНКА** падчас афіцыйнай сустрэчы пазнаёміла госця з Украіны і журналістаў з фотавыставай «Беларусь шматнацыянальная», на якой прадстаўлены фатаграфіі дыяспары розных нацыянальнасцяў, якія пражываюць у нашай краіне.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Аляксей ТАЛАЙ:

# «Я САБЕ ПАБЛАЖАК НЕ ДАЮ»

## Чорны пояс па таэквандо і светлы шлях па жыцці плыўца-параалімпійца

**Імя гэтага чалавека вядома кожнаму, хто чытае навіны. Матывацыйны спікер, бізнесмен, галава сям'і, бацька чатырох дзяцей, член Канстытуцыйнай камісіі, Аляксей Талай нядаўна устанавіў новы сусветны рэкорд у параалімпійскім плаванні на этапе Сусветнай серыі. Дыстанцыю ў 50 метраў брасам ён пераадолеў за 1.18.42. А 150 метраў у комплексным плаванні праплыў за пяць хвілін, удасканаліўшы свой вынік на 10 секунд. Зараз спартсмен рыхтуецца да чэмпіянату Еўропы ў Партугаліі, які стане галоўнай праверкай сіл перад Параалімпійскімі гульнямі. Дарэчы, у Токіа Аляксей паедзе па асабістым запрашэнні Міжнароднага параалімпійскага камітэта.**

**Адказ на пытанне «Дзе межы Аляксея Талая?» шукаюць многія. Паспрабавала гэта зрабіць і «Звязда».**




***— Аляксей, ваш новы рэкорд быў запланаваным ці стаў прыемным сюрпрызам?***

— Едучы на спаборніцтвы, я планаваў выканаць сваю праграму-мінімум — праплыць па сваіх крайніх секундах і самому сабе паказаць, што я ў добрай форме. Я плыў і думаў, што набліжуся да свайго мінулага рэкорду. А калі ўбачыў, што пабіў яго на цэлых шэсць секунд, гэта быў вялікі сюрпрыз... Як член Канстытуцыйнай камісіі, я праводжу шмат сустрэч з людзьмі ў розных рэгіёнах краіны, мой удзел патрэбны ў розных праектах, бізнесе. І я перажываў, што праз усю гэтую занятасць не змагу дастойна выступіць на спаборніцтвах. Калі я не паспяваў у басейн, займаўся з трэнажорамі ў спартыўнай зале. Значыць, мая тактыка «рабі, што абавязаны, і рабі гэта з поўнай аддачай» была правільная. Магчыма, цудоўная прырода Італіі зрабіла сваю справу. Мы былі ў мястэчку, дзе растуць выдатныя кедры, там рос наш беларускі ядловец, пашчасціла нават паспытаць яго ягады, якія, як вядома, спеюць раз на два гады. І адбылася нейкая перазагрузка.

***— Увогуле, вы адчуваеце, што ў вашым плаванні ёсць мяжа?***

— Я ведаю, што на пэўным этапе мае фізічныя і фізіялагічныя асаблівасці не дадуць мне ісці напрад. Але пакуль рана аб гэтым думаць. Межы чалавечага арганізма і матывацыі я імкнуся шукаць усё жыццё. І пастаянна задаю сабе пытанне: «Што ты яшчэ можаш зрабіць, Аляксей Талай?» Нямецкая міна мяне не ўзяла, слава Богу, жывы, сям'я, дзеткі, бізнес — усё добра. Яшчэ і спорт уварваўся.

***— І як у ваша жыццё ўварваўся спорт?***

— Спортам я займаўся яшчэ ў дзяцінстве. Параалімпійскім пачаў займацца ў 2017 годзе, а за пяць гадоў да гэтага глядзеў Параалімпійскія гульні, і ў мяне прамільгнула думка: таксама хачу сябе паспрабаваць, можа, што і атрымаецца. Але думка прабегла, і я аб гэтым нібыта забыў. Я тады быў на этапе станаўлення, мне не было калі думаць пра спорт, патрэбна было працаваць, зарабляць грошы, каб забяспечыць сям'і належныя ўмовы. А ў 2017 годзе Дзмітрый Бачкоў запрасіў мяне ў сваю праграму на тэлеканале АНТ. Па выніках Параалімпійскіх гульняў 2016 года мы ўшаноўвалі нашага легендарнага спартсмена Ігара Бокія, там быў яго трэнер Генадзь Вішнякоў, бацькі. Мяне запрасілі як эксперта, каб разабрацца, чаму адны людзі з інваліднасцю могуць дасягаць поспехаў, а другія — не. І мяне як маланка ўдарыла: памятаеш, хацеў, а вось жа рэалізацыя. Мы пагаварылі з Генадзем Вішняковым, я яму проста сказаў: «Паверце мне, я зраблю ўсё, што магу». Ён пільна паглядзеў мне ў вочы і паверыў. Параалімпійскі камітэт падтрымаў маё жаданне. А мы тады жылі ў Оршы і паўстала пытанне аб пераездзе ў Мінск. Жонка Настасся была цяжарная і, дзякуй ёй вялікі, пагадзілася пераехаць. Я сабе кінуў выклік — са студзеня да сакавіка набраць патрэбную форму і там ужо глядзець, ці мэтазгодна мне займацца спортам, траціць рэсурсы, грошы. Праз два месяцы я выканаў нарматыў на майстра спорту. Усе былі ў шоку. І тады на авансцэну выйшаў матывацыйны спікер Аляксей Талай, які прыкладам пацвердзіў, наколькі важна паставіць канкрэтную мэту і дакладна прытрымлівацца графіка для яе дасягнення. Калі я бяруся за нейкую дзейнасць, паблажак сабе не даю. Кожны сам для сябе вырашае, «каменем яму ляжаць ці гарэць зоркай», як Цой спяваў. Я заўсёды адчуваў, што мне трэба моцна працаваць, нездарма Усявышні пакінуў мяне жывым у той дзень 8 мая 1999 года.

І сёння я зорка параалімпійскага спорту, шматразовы чэмпіён свету і Еўропы. Мне самому часам не верыцца, што гэта ўсё пра мяне.

***— Аляксей, колькі ўсяго ў свеце спартсменаў-параалімпійцаў у вашым класе?***

— Мы маліліся, каб знайшліся гэтыя спартсмены і каб яны атрымалі ліцэнзію на Параалімпійскія гульні ў Токіа. Ва ўсім свеце іх шэсць ці сем чалавек, і плаваюць яны толькі на спіне. Мяне гэта засмучае, бо найлепшы я ў брасе. Але ў брасе не знайшлося спартсменаў, здольных выканаць алімпійскі нарматыў. Таму на Параалімпійскіх гульнях у Токіа я буду выступаць на 50 метрах і на 100 метрах на спіне. І зараз мая задача — засяродзіцца на гэтым відзе плавання і максімальна яго ўдасканаліць.



***— Атрымліваецца, што перанос Гульняў пайшоў вам на карысць?***

— Невядома, як бы для мяне скляліся Параалімпійскія гульні, калі б яны былі ў мінулым годзе ў канцы жніўня — пачатку верасня, калі ў Беларусі адбываліся ўсе хвалюючыя падзеі. Невядома, аб чым бы я думаў у Токіа: аб сваім выступленні ці аб тым, што адбываецца дома. Канкрэтна ў маім выпадку добра, што гульні перанеслі. У мяне з'явіўся час стаць больш моцным, мудрым і лепш падрыхтавацца.

***— Генадзь Вішнякоў адзначаў, што вы валодаеце павышанай плывучасцю. Што гэта азначае?***

— Гэта адчуванне вады, любоў да яе, адчуванне сваёй еднасці з вадой, нібыта вы адно цэлае. Я без вады проста не магу, гэта мая стыхія. Калі б вы размаўлялі з маёй мамай, яна расказала б вам цікавую гісторыю пра тое, як у дзяцінстве я не засынаў без бутэлькі вады ў руках. Са мной заўсёды побач вада, я пастаянна яе п'ю: дактары ж рэкамендуюць у дзень выпіваць па 1,5-2 літры вады. Вада нібыта надае мне сілы, аднаўляе арганізм.

***— Дзеці плаваннем займаюцца?***

— Я думаю, будуць. Дачка Даша займалася мастацкай гімнастыкай. Зараз займаецца сучаснымі танцамі, а восенню плануем аддаць яе на спартыўную гімнастыку, каб база не страцілася. Хлопчыкі і плаваннем, і футболам займаліся. Зараз яны больш вучобай заняты. Я вельмі б хацеў, каб хтосьці з маіх сыноў стаў ваенным.

***— Аляксей, гэта праўда, што ў вас ёсць чорны пояс па таэквандо?***

-. Я атрымаў яго ў ЗША пры вельмі цікавых абставінах 11 гадоў таму. Я быў у штаце Фларыда на выставе новых трэндаў па рэабілітацыі людзей з інваліднасцю, у тым ліку і ў спорце. Там былі прадстаўлены спартыўныя секцыі для інвалідаў. І інклюзіўная каманда па таэквандо паказвала сваё шоу. Іх трэнер выклікаў ахвотнага разбіць дошку. Усе маўчаць... А мой амерыканскі сябар Дан павёз маю каляску да сцэны і крычыць, што ёсць ахвотныя, то-бок, я. Я спрабую тармазіць, злуюся, а ён задаволены такі. Я змірыўся, падумаў аб тым, што ў Амерыцы добрая страхоўка, і калі я зламаю руку, то хоць грошы атрымаю. Адмовіцца ж сорамна. Я ўжо Богу памаліўся, папрасіў у яго дапамогі і сам думаю: «Няхай будзе што будзе, не падвяду Беларусь». Заплюшчваю вочы, замахваюся і б'ю па гэтай дошцы. Адчуваю страшэнны боль у руцэ, адкрываю вочы, імгненне — і зала ўзрываецца апладысментамі! А дзве часткі дошкі валяюцца на падлозе, усе ў шоку. Рука балела, але не зламалася. Так я атрымаў чорны пояс па таэквандо.

***— Раскажыце, калі ласка, пра ваш праект «Спартсмены Беларусі. Сіла ў адзінстве».***

— Агульнанацыянальны праект «Спартсмены Беларусі. Сіла ў адзінстве» быў запушчаны летась. І ў яго межах мы плённа працуем у школах, універсітэтах розных гарадоў краіны. Праект накіраваны на тое, каб прывіць нашай моладзі разуменне, што здаровы лад — гэта модна, крута і вельмі важна. Каб быць канкурэнтаздольным, патрэбна быць моцным і здаровым. Мне дактары казалі, што я выжыў, таму што паспеў пракачаць сябе на спартыўных пляцоўках, паспеў зрабіць сваё сэрца моцным, займаючыся веславаннем, а дзякуючы каратэ ўмацаваў дух. Таму маё цела змагло справіцца з усімі выпрабаваннямі. Нізкі паклон усім донарам, дзякуючы якім я жыву. Гэта былі літры крыві, і арганізму патрэбны былі сілы, каб прыняць чужую для яго субстанцыю. Я тады выжыў, а зараз у свеце жывуць чацвёра цудоўных дзетак — Марк, Уладзіслаў, Даша, Яраслаў. І як бацька, я разумею, наколькі важна, каб дзеці, моладзь былі здаровыя. І стараюся данесці гэта і да маладога пакалення. І другая мэта праекта — адарваць дзяцей ад гаджэтаў і зацікавіць іх спортам. Так, інтэрнэт, гаджэты — гэта добра, мне як інваліду яны вельмі дапамагаюць узаемадзейнічаць са светам. Але нельга на гэтым зацыкліваца.



Вось што значыць праект «Спартсмены Беларусі». І гэта магчымасць для нашых спартсменаў падключыцца да важнай сацыяльнай работы. Так, вы цудоўныя, але падзяліцеся сваім вопытам з нашай моладдзю. І за гэты праект Прэзідэнт узнагародзіў мяне прэміяй «Беларускі спартыўны алімп». Былі важныя і мае рэкорды, але галоўную ролю сыграла менавіта гэта дзейнасць.

***— Аляксей, як непасрэдны ўдзельнік параалімпійскага спорту вы не лічыце, што ў нашай краіне ён недаацэнены?***

— На жаль, у Беларусі існуе недаацэнка параалімпійскага спорту. Параалімпійскі спорт нашай краіны дайшоў да такога высокага ўзроўню, калі ўжо неабходна перагледзець падыходы да яго рэгулявання для плённага развіцця дзеля славы Беларусі. Напрыклад, я магу выкарыстоўваць свае магчымасці ў плане піяру, зносін са СМІ, чыноўнікамі для папулярызацыі параалімпійскага спорту. Я магу данесці да грамадства думку, што параалімпійскі спорт нездзе нават вышэйшы за алімпійскі і цаніцца павінен больш. Мала хто можа ўявіць, праз якія іспыты праходзяць гэтыя людзі — толькі яны гэта ведаюць. І параалімпійцам трэба даць слова. Няхай яны раскажуць, як перамагаць сляпому ці на інваліднай калясцы, ці, як я, без рук і ног. Гэта неверагодны жыццёвы вопыт, і, пазнаёміўшыся з ім, людзі будуць больш цаніць сваё здароўе, хтосьці паверыць у сябе. Як член Канстытуцыйнай камісіі, я хачу замацаваць у Канстытуцыі выраз «спартсмены алімпійцы і параалімпійцы». Каб у галоўным законе краіны было пацверджана, што інваліды маюць правы і магчымасці займацца спортам. Гэта абсалютна справядліва і аб'ектыўна. Нашы параалімпійцы — я нават не поўнасцю прылічваю сябе да гэтых герояў — даўно даказалі, што яны гэта заслужылі. І прызавыя ў іх павінны быць аднолькавымі з алімпійцамі. Я спадзяюся, што змагу ўнесці свой уклад у развіццё параалімпійскага спорту і што ў мяне будзе магчымасць абмеркаваць гэта і з Віктарам Аляксандравічам Лукашэнкам, прэзідэнтам НАК, і з Сяргеем Міхайлавічам Кавальчуком, міністрам спорту.

***— А спартыўная інфраструктура? Ці хопіць той, што ёсць?***

— На маю думку, наспела неабходнасць у стварэнні новых ці перабудове існуючых аб'ектаў для РЦАП па параалімпійскіх і дэфалімпійскіх відах спорту. Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі ў нас ёсць, а комплексу няма. Нам патрэбен спартыўны кластар для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Дабрачынны фонд Аляксея Талая разам з Нацыянальным параалімпійскім камітэтам ужо рыхтуе дакумент-прапанову па стварэнні такога кластара, каб нашы спартсмены адчувалі сябе дагледжанымі і працавалі дзеля нашай краіны. Магчыма, будзем звяртацца да кіраўніка дзяржавы. Мы разумеем, што бюджэт краіны не гумавы, але ў нашага фонду ёсць магчымасць знайсці і спонсарскія сродкі, гэта нармальная практыка. Наш фонд актыўна працуе над гэтым праектам.

***— Адкуль бярэ матывацыю матывацыйны спікер Аляксей Талай?***

— Я кайфую ад жыцця. Тая падзея, калі я мог памерці, і ўсе наступныя іспыты вывелі маю свядомасць на новы ўзровень. Я зразумеў, наколькі важнае жыццё ва ўсёй яго разнастайнасці. І цяжкасці, і боль — часткі гэтага жыцця, без якіх потым не адчуваеш шчасця. Я ўсімі фібрамі душы адчуваю, як цудоўна быць тут, цаніць кожнае імгненне, любіць сваіх блізкіх, свой народ. Давайце паглядзім на нашу планету збоку. І мы тут будзем злавацца і нешта дзяліць? Давайце дарыць любоў! І тады ўсё будзе добра, і жыццё падасца цудоўным кожнаму з нас.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з асабістага архіва героя.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

7 мая 2021 г. № 17 (602)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ІНІЦЫЯТЫВЫ ВІТАЮЦЦА І БУДУЦЬ ЗААХВОЧВАЦЦА




**Жыхары Слаўгарада Ігар і Алена ВАРУЦЕНКІ маюць свой пчальнік. Мёд, сабраны з навакольных лугоў і палёў, прыносіць дбайным гаспадарам неблагі прыбытак. Рэалізаваць гэты каштоўны прадукт можна на мясцовым рынку мёду, які абсталяваны каля гідралагічнага помніка прыроды «Блакітная крыніца» — месца, якое ў любы месяц наведваюць жыхары і госці горада. Там жа, у кіёсках, на добраўпарадкаванай тэрыторыі, можна набыць сувеніры, зробленыя рукамі мясцовых умельцаў.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**У Слаўгарадзе падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, дзе абмяркоўвалася работа па рэабілітацыі і ўстойлівым развіцці пацярпелых пасля аварыі на ЧАЭС тэрыторый, таксама шмат увагі ўдзялілі падтрымцы слушных ініцыятыў жыхароў рэгіёнаў краіны.**

У гэтым сэнсе цікавым было выступленне **старшыні Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў Святланы ЯЗЕРСКАЙ.** Яна адзначыла, што своечасовая і прадметная падтрымка ініцыятыў мясцовага насельніцтва можа і павінна адыгрываць больш значную, чым цяпер, ролю ў развіцці тэрыторый. Гэта агульны клопат дзяржавы, органаў мясцовай улады і, вядома, жыхароў канкрэтнага раёна, у тым ліку прадстаўнікоў малога бізнесу, маладзёжных арганізацый, ініцыятыўных груп, проста адказных і неабыякавых да лёсу сваёй малой радзімы людзей. І без сумесных намаганняў тут не абысціся.

За апошнія 10 гадоў з дапамогай мясцовай улады ў раёне было рэалізавана прыкладна 60 ініцыятыў. З іх 27 даволі значныя, лічыць Святлана Язерская. На яе погляд, за час іх ажыццяўлення райвыканкам, райсавет і сельскія Саветы шмат чаму навучыліся. У тым ліку і пошуку неабходных сродкаў праз удзел у конкурсах на фінансаванне цікавых прапаноў, прыцягненне спонсараў, атрыманне грантаў, правядзенне суботнікаў і г. д.

У выніку новае дыханне атрымала выкарыстанне раёнам сваіх рэсурсаў і магчымасцяў. Так, мясцовыя сыравары занялі сваю нішу не толькі ў раёне, развіваецца пчалярства, розныя рамёствы, аграрны турызм і г. д. Дарэчы, у яго ёсць рэальныя перспектывы для станаўлення цяперашніх і ўзнікнення новых аграсядзіб. Усе гэтыя ініцыятывы садзейнічалі і развіццю самазанятасці, і стварэнню дадатковых працоўных месцаў, што вельмі актуальна для сельскагаспадарчага Слаўгарадскага раёна, гаворыць старшыня райсавета дэпутатаў.

У тым, што актуальныя ідэі жыхароў рэгіёнаў патрабуюць усямернай падтрымкі, сёння ўжо на дзяржаўным узроўні дасягнуты станоўчы кансенсус. Гэта ў пэўным сэнсе аксіёма, бо мясцовыя ініцыятывы дапамагаюць у забеспячэнні сацыяльных і эканамічных патрэб жыхароў тэрыторый, захаванні і стварэнні камфортнага асяроддзя для жыцця людзей. Таму зараз ідзе прапрацоўка ўсяго комплексу пытанняў, якія звязаны з заахвочваннем удзелу насельніцтва ў развіцці раёнаў. Ды і ўвогуле мясцовыя ініцыятывы садзейнічаюць удасканаленню мясцовага самакіравання.

Лагічным працягам і дапаўненнем выступлення Святланы Язерскай стаў змястоўны даклад **намесніка міністра фінансаў Дзмітрыя КІЙКО,** які ён прысвяціў мерам бюджэтнай палітыкі па ўмацаванні самастойнасці органаў мясцовых улад і ўдзелу грамадзян у рэгіянальным развіцці. Паводле яго інфармацыі, рэсурсная база мясцовых бюджэтаў пастаянна і няўхільна ўзрастае, на іх даводзіцца каля 55 працэнтаў кансалідаванага бюджэту краіны. Гэта асэнсаваная палітыка, паколькі сёння мясцовыя бюджэты нясуць асноўную нагрузку па фінансаванні галін, якія вызначаюць і забяспечваюць узровень якасці жыцця нашых суграмадзян, падкрэсліў Дзмітрый Кійко.

Па словах намесніка міністра фінансаў, сёння ростам актыўнасці жыхароў у справах сваіх рэгіёнаў заклапочаны ўлады многіх краін. Напрыклад, у Расіі ўзрастае ўвага да павышэння якасці непасрэднага ўдзелу грамадзян у вырашэнні мясцовых праблем. Там рэалізоўваецца некалькі значных праектаў, якія накіраваны на развіццё тэрыторый, стварэнне сацыяльнай інфраструктуры мясцовага ўзроўню, абуджэнне творчай і дзелавой ініцыятывы, у прыватнасці, наладжаны пошук свежых ідэй ад моладзі.

У Беларусі таксама вядзецца мэтанакіраваная работа па заахвочванні мясцовых ініцыятыў, якія маюць мэтай развіццё рэгіёнаў і іх канкрэтных тэрыторый. Фінансаванне такіх ініцыятыў будзе ажыццяўляцца на парытэтнай аснове: палова сродкаў — з рэспубліканскага бюджэту, другая палова — з абласных бюджэтаў. Прычым аўтары ці аўтары ідэі, якія зацікаўлены ў яе ўвасабленні ў жыццё, павінны будуць унесці не менш чым 10 працэнтаў ад кошту выдаткаў на рэалізацыю ініцыятывы. Гэта робіцца з мэтай павысіць зацікаўленасць і адказнасць насельніцтва.

А каардынацыю па рэалізацыі мясцовых ініцыятыў варта даручыць структурам абласных Саветаў дэпутатаў. А ўвогуле, ужо наспелі змены ў закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, лічыць Дзмітрый Кійко.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

НА ПАРАДКУ ДНЯ

## Падтрымка сем'яў — прыярытэтны напрамак

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Анатоль ІСАЧАНКА сустрэўся з кіраўніком офіса Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі Вольгай АТРОШЧАНКАЙ.**



— Пытанні дэмаграфіі і падтрымкі сем'яў знаходзяцца на пастаянным кантролі Прэзідэнта нашай краіны і з'яўляюцца адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі, — падкрэсліў падчас гутаркі віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

На сустрэчы бакі абмеркавалі стан і перспектывы двухбаковага ўзаемадзеяння з ЮНФПА па лініі нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.

## Супрацоўніцтва ў эпоху лічбавізацыі

**У Савеце Рэспублікі прайшла рабочая нарада па падрыхтоўцы мерапрыемстваў VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.**



Цяпер у верхняй палаце парламента вядзецца актыўная работа па падрыхтоўцы мерапрыемстваў VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі на тэму «Навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва Расіі і Беларусі ў эпоху лічбавізацыі». Нагадаем, што правядзенне форуму запланавана ў перыяд з 29 чэрвеня да 1 ліпеня ў Маскоўскай вобласці.

На чарговым пасяджэнні, якое адбылося на гэтым тыдні, абмяркоўваліся ключавыя пытанні, якія датычацца арганізацыі правядзення секцый форуму, іх напаўнення і зместу, фармату і месцаў правядзення.

У нарадзе ўзялі ўдзел службовыя асобы міністэрстваў і іншых дзяржаўных органаў, а таксама асобных рэспубліканскіх арганізацый. У далейшым работа ў гэтым кірунку будзе працягвацца.

## Лёсы ветэранаў — прыклады мужнасці, вартыя захаплення і пераймання

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК павіншавала ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з надыходзячым Днём Перамогі.**



Словы ўдзячнасці і найлепшыя пажаданні ад сенатара прымалі Мікалай Нічыпаравіч Цыганкоў і Іван Ігнатавіч Шкурко ў Хойніцкім раёне, Васіль Аляксандравіч Нікалаенка, Андрэй Васілевіч Козел і Васіль Кузьміч Свірыдзенка ў Брагінскім раёне, Аляксандра Фёдараўна Кукса і Іван Аляксеевіч Гаўрыленка ў Лоеўскім раёне.

Ала Смаляк выказала бясконцую ўдзячнасць героям за магчымасць жыць і працаваць сёння пад мірным небам. Парламентарый пажадала ветэранам дабрабыту і моцнага здароўя, уручыла ім кветкі і падарункі.

— У кожнага з ветэранаў свае ратныя подзвігі, працоўныя перамогі, свой жыццёвы шлях, але ўсіх іх аб'ядноўвае бязмерная любоў да роднай зямлі, за якую яны былі гатовыя зложыць галовы. Для цяперашніх пакаленняў лёсы ветэранаў — прыклады мужнасці, самаахвярнасці, вартыя захаплення і пераймання, — адзначыла член Савета Рэспублікі.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Сенатар Тамара ШАТЛІКАВА:

# «Мы ўсе сталі крыху шчаслівейшыя»

## Член Савета Рэспублікі, старшыня райсавета, кіраўнік раённай грамадскай арганізацыі зладзілі для сямейнага дзіцячага дома цікавую паездку выходнага дня

**ДЛЯ дзяцей з маларыцкага дзіцячага дома сямейнага тыпу, якіх выхоўваюць Таццяна і Вячаслаў АБРАМУКІ, мінулая нядзеля стала нечым накшталт сямейнага свята. Усёй сям'ёй, у якой выхоўваецца дзевяць дзяцей, яны выправіліся ў Брэст, дзе іх чакала цікавая праграма: спачатку адпачынак у санаторыі «Сонечны», а потым экскурсія і абед у Брэсцкай крэпасці. Пра гэта паклапаціліся сенатар Тамара ШАТЛІКАВА, старшыня Маларыцкага райсавета Алег ЯКУБЧЫК, старшыня Маларыцкай раённай арганізацыі «Белая Русь» Алена СЕРАДА і іншыя нераўнадушныя людзі.**



На тэрыторыі санаторыя «Сонечны».

Паводле слоў Тамары Анатолеўны, гэтая ідэя ўзнікла, калі яна сама адпачывала ў санаторыі "АСБ Беларусбанка" «Сонечны». Там ёсць кантактны мінізаапарк, і ў выхадныя дні часам прыязджаюць сем'і з дзецьмі, каб правесці з карысцю на свежым паветры час. А сямейным дзіцячым дамам у сваёй акрузе сенатар Шатлікава ўдзяляе асаблівую ўвагу. Вось і дамовіліся на паездку. Тым больш што санаторый узяўся ўладкаваць праграму выхаднога дня для сям'і на ўмовах спонсарства.

Колькі ж радасці было для дзяцей пакатацца вярхом на коні і ўпрэжанай павозцы! Самыя малыя гладзілі-абдымалі вялікіх добрых сабак, іншых ручных звяркоў. У салянай пячоры таксама было вельмі цікава.

— Меншыя адчувалі сябе ці не героямі мультфільмаў, іх цяжка было з гэтай пячоры выцягнуць, — са смехам згадала маці-выхавальніца Таццяна Абрамук. — А ў крэпасці было, вядома, цікава нашым старэйшым. Тым больш што ў новых музеях спрэс інфармацыйныя тэхналогіі, 3D-ілюстрацыі, іншыя сучасныя цікавосткі. Мы нават падумалі, што трэба зноў сюды прыехаць са школьнікамі, ужо без малых. Бо, здаралася, падчас экскурсіі трэба было лавіць меншых, якія разбягаліся па залах і знаходзілі нешта цікавае для сябе.

Яно і зразумела. Узрост дзяцей у гэтай сям'і — амаль як лічылка: 3, 4, 5, 6, 7, 8, 10, 13, 15 гадоў. І для ўсіх адразу зрабіць цікавай праграму не вельмі проста. Але ж галоўнае, як лічыць маці-выхавальніца, магчымасць выехаць усёй сям'ёй:

— Усе разам мы часам толькі ў парк выходзім, ну, яшчэ ў госці да другой такой жа сям'і, — гаворыць Таццяна Мікалаеўна. — А ў Брэст выбрацца праблематычна. Дзякуй аддзелу адукацыі, які выдзеліў аўтобус, ну, і ўсім нашым арганізатарам-спонсарам. За шэсць гадоў работы нашага сямейнага дзіцячага дома мы выязджалі аднойчы за кошт спонсараў у абласны цэнтр. Але тады праграма была вельмі насычанай, уключала шмат мерапрыемстваў, і дзеці нават стаміліся. Цяпер жа паездка атрымалася больш камерная, дзеці з задавальненнем камунікавалі з дарослымі, пазнавалі новае. Дадому прыехалі не вельмі позна, паспелі нават падрыхтавацца да ўрокаў. Адным словам, усё атрымалася як найлепш.

Старшыня раённага савета Алег Якубчык таксама атрымаў незабыўныя эмоцыі і ўражанні:

— Звычайна мы прыязджаем у дзіцячыя дамы і іншыя падобныя ўстановы на кароткі час. Дзеці не паспяваюць прывыкнуць, бывае, праяўляюць сарамлівасць у адносінах. А тут яны даволі хутка асвоіліся, і аказалася, што для іх галоўнае — патрымаць за руку, пагаварыць з дарослым чалавекам, які цікавіцца ім, маленькім. І гэта было вельмі кранальна. Добрай атмасферы паспрыяла тое, што большую палову часу дзеці знаходзіліся на свежым паветры, маглі свабодна рухацца: на тэрыторыі санаторыя — у заапарку, а ў крэпасці ад душы палазілі па танках, баявых машынах, якія для гэтага і ўстаноўлены на адмысловай пляцоўцы.

Тамара Шатлікава сказала, што яна захапляецца тымі, хто ідзе на работу бацькоў-выхавальнікаў:

— Гэта людзі вялікай душы і вялікай мужнасці. І мы, грамадскасць, павінны ўсяляк іх падтрымліваць. Дзеці прыходзяць з розных сем'яў. Часта зусім малы чалавек за свае некалькі гадоў паспявае сербануць і гора, і нястачы. Пра аднаго выхаванца дзіцячага дома мне расказвалі літаральна наступнае. Калі яго забралі з біялагічнай сям'і і прывезлі да новых бацькоў, недзе праз месяц зайшлі педагогі, каб пацікавіцца, як яму жывецца. І дзіця сказала: «Добра, тут так шмат кормяць, і я... мыюся кожны дзень». Па адным гэтым сказе можна меркаваць, як малы жыў раней. Адагрэць гэтых дзяцей, дастукацца да іх душы бывае вельмі няпроста. А ім гэта часта ўдаецца.



Тамара ШАТЛІКАВА з выхаванцамі сямейнага дзіцячага дома.

Ведаеце, нам было радасна хадзіць з імі, паказваць, расказваць нешта новае, — працягвае Тамара Анатолеўна. — Адзін хлопчык мяне пытаў, ці прыеду я зноў. А другі, школьнік, дапытваўся, ці ўбачыць ён шкляную падлогу ў музеі, пад якой ляжаць гільзы і пісталеты. Відаць, нехта з таварышаў, хто раней быў у Брэсцкай крэпасці, расказваў, што найбольш уразіла пры наведванні музея. Вось і наш падарожнік хацеў абавязкова гэта ўбачыць, і яму ўдалося. А нам пашчасціла паспрыяць... Думаю, што ўсе мы сталі шчаслівейшыя пасля гэтай паездкі.

На канец мая мы запланавалі такую ж паездку з сямейным дзіцячым домам, які знаходзіцца ў вёсцы Лукава. Там мы былі на Новы год з падарункамі, святочнай дзеяй. А цяпер зладзім тур выхаднога дня. Пазней, думаю, арганізуем экскурсію і для трэцяга дзіцячага дома (іх усяго тры ў Маларыцкім раёне). Апроч іншага, такі досвед вельмі карысны для дзяцей: пачынаючы са збораў, выезду з дому, потым абеду ў кафэ — усё спрые жыццёваму вопыту і навыкам паводзін у грамадскіх месцах, камунікацыі. Часам трэба ладзіць вось такія сямейныя паездкі для дзіцячых дамоў, тым больш што ёсць аднадумцы, якія падтрымліваюць і маральна, і матэрыяльна, — заключыла сенатар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# ДЗЕЛЯ БУДУЧЫХ ПЕРАМОГ!

**ПЫТАННЕ аб прызначэнні стыпендый спартсменам Віцебскай вобласці, падтрымкі ў станаўленні патэнцыйных чэмпіёнаў і рэкардсменаў было адным з галоўных на пазачарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў. Вельмі актуальная тэма напярэдадні Алімпійскіх гульняў, дэпутаты гэта разумелі.**

Паводле інфармацыі ўпраўлення спорту і турызму Віцебскага аблвыканкама, сёлета вартыя атрымліваць грашовую падтрымку 89 спартсменаў, якія дабіліся найбольш значных вынікаў у 24 відах спорту, у тым ліку 21 — алімпійскіх.

Цікава, што толькі 49 з іх жывуць у абласным цэнтры. Астатнія — у правінцыі, у тым ліку і ў глыбінцы. У прыватнасці, у Оршы — 13, Наваполацку — 12, Полацку — 6, у Браславе, Сянно і Чашніках — па двое, у Шуміліне, Лепелі і Глыбокім — па адным.

На выплату стыпендый з абласнога бюджэту на гэты год спатрэбіцца прыблізна 250 тысяч рублёў.

Для параўнання: летась атрымальнікамі стыпендый былі 97 чалавек. Таму карэкціровак у бок павелічэння фінансавання не спатрэбіцца.

У згаданым упраўленні падкрэсліваюць, што фактаў, каб нехта паскардзіўся, чаму не ён стыпендыят, не было. Усё справядліва, бо ўлічваюцца дасягненні, перспектывы, напрыклад, ці з'яўляецца спартсмен кандыдатам для ўдзелу ў Алімпіядзе?

У 2020 годзе спартсменамі Прыдзвінскага краю на афіцыйных міжнародных спаборніцтвах заваявана 10 медалёў: тры — залатыя, два — сярэбраныя і пяць — бронзавых. З агульнай колькасці заваяваных медалёў сем — па алімпійскіх відах спорту.

Поўнач краіны стабільна ў прызавой тройцы па пераможных месцах сярод абласцей.

Народным выбраннікам агучылі сёлетнюю алімпійскую статыстыку. 27 прадстаўнікоў Віцебскай вобласці ў дзевяці відах спорту прэтэндуюць на права змагацца за медалі на XXXII летніх Алімпійскіх гульнях у сталіцы Японіі.

Між іншым, цікавы факт: у спісе алімпійцаў-пераможцаў з Віцебшчыны пад нумарам адзін — лёгкаатлет Рамуальд Клім, які ў Токіа ў 1964 годзе заваяваў залаты медаль на XVIII Алімпійскіх гульнях. Хочацца верыць, што ў Японіі пашанцуе нашым не толькі з Віцебшчыны і не толькі з «золатам» няхай вернуцца. Пабольш медалёў розных!

Робіцца многае, каб своечасова выявіць схільнасць хлопчыкаў і дзяўчынак да спорту, дапамагчы раскрыць спартыўны талент. Летась у спецыялізаваных па спорце класах займалася 649 спартсменаў па 23 відах.

А ўсяго спартыўную падрыхтоўку ў вобласці праходзяць больш чым 21 тысяча чалавек пад кіраўніцтвам каля тысячы трэнераў-выкладчыкаў.

Падрыхтоўку спартыўнага рэзерву і спартсменаў высокага класа забяспечваюць каля шасцідзесяці спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў і два вучылішчы алімпійскага рэзерву. У іх за кошт бюджэтных сродкаў культывуецца прыкладна пяцьдзясят відаў спорту.

Стварэнне добрых умоў для заняткаў фізкультурай і спортам, будаўніцтва новых аб'ектаў — гэтыя тэмы пад пільнай увагай дэпутатаў розных узроўняў. Дарэчы, у вобласці для арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай, спартыўна-масавай работы і турызму функцыяніруе каля чатырох тысяч фізкультурна-спартыўных збудаванняў.

Некалькі гадоў таму ў абласным цэнтры пабудавалі цудоўны цэнтр для трэніровак і спаборніцтваў батутыстаў. Між іншым, праз некалькі дзён пасля сесіі прадстаўнікі вялікага спорту Віцебшчыны Уладзіслаў Ганчароў і Алег Рабцаў выйгралі «золата» чэмпіянату Еўропы па скачках на батуце ў Сочы.

У 2020 годзе ўведзены ў эксплуатацыю паветраапорны футбольны манеж у Віцебску, адкрылі восем пляцовак са штучным пакрыццём у рамках сацыяльнага праекта «Bonfesto-дзецям» (у Дубровенскім, Талачынскім, Лепельскім, Пастаўскім, Глыбоцкім, Шумілінскім, Лёзненскім, Віцебскім раёнах).

Зрабілі капітальныя рамонты з элементамі мадэрнізацыі: стадыёна Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, спартыўнага комплексу горада Барань і стадыёна гарадскога пасёлка Балбасава Аршанскага раёна.

І сёлета будуць адкрывацца новыя залы, спартыўныя комплексы, палацы...

Гарадскімі і раённымі аддзеламі і сектарамі спорту і турызму летась праведзена каля трох тысяч спартыўна-масавых і турысцкіх мерапрыемстваў. У іх узялі ўдзел больш за 130 тысяч чалавек.

Сярод мноства акцый, якія рэкламуюць заняткі фізкультурай і магчымасць паказаць вялікія дасягненні ў спорцы, бадай, адна з самых вядомых — штогадовая міжнародная выстаўка-кірмаш «Віцебшчына — за здаровы лад жыцця». Тут юныя спартсмены бяруць удзел у паказальных выступленнях. З наведвальнікамі гутарыць вядомыя спартсмены, ветэраны спорту. Яны, у прыватнасці, раяць бацькам, чым лепш заняцца іх дзецям, якія секцыі найлепш выбраць і гэтак далей.

У Віцебскай вобласці ўсё больш развіваюць спартыўны турызм: на трэніроўкі прыязджаюць аматары спорту і прафесіяналы з краін не толькі блізкага, але і далёкага замежжа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ПЕРАМОЖЦЫ РАДЫЁКОНКУРСУ «МАЛАДЫЯ ТАЛЕНТЫ БЕЛАРУСІ»

**Першы нацыянальны канал Беларускага радыё абнародаваў вынікі X Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі». Прызёрамі юбілейнага спаборніцтва сталі 144 фіналісты.**




Варта адзначыць, што два туры творчага конкурсу прайшлі ў красавіку ў дыстанцыйным фармаце, а фінальны трэці тур даў магчымасць арганізатарам і журы праслухаць ужывую выкананне ўдзельнікаў-салістаў вакальных і інструментальных твораў у студыі Дома радыё. У калектыўных харавых, аркестравых і ансамблевых намінацыях фінальны тур праходзіў анлайн. Увогуле, сёлетні X творчы радыёконкурс стаў найбольш маштабным за ўсю гісторыю свайго існавання, паколькі сабраў 632 заяўкі ад удзельнікаў з усёй Беларусі.

Рашэннем журы Гран-пры «Маладых талентаў Беларусі» прысуджаны пяці ўдзельнікам праекта ў розных намінацыях. Сярод пераможцаў: Валерыя Шманай (Жодзіна), Вікторыя Янушкевіч (Ракаў), народны хор «Радзейка» (Гомель), народны ансамбль цымбалістаў «Лілея» (Брэст) і народны духавы аркестр УА «МДМК імя Агінскага» (Маладзечна). Акрамя таго, 76 салістаў і калектываў прызнаны лаўрэатамі I, II і III ступеняў, а 63 удзельнікі ўдастоіліся спецыяльных дыпломаў праекта. З поўным спісам пераможцаў можна азнаёміцца на сайце Першага нацыянальнага радыё альбо на тэлеграм-канале «Радыё_1». Усе пераможцы атрымалі памятныя ўзнагароды, а таксама права на ратацыю ў эфіры галоўнага радыёканала краіны.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 139

З 16 да 19 красавіка 2021 года ў Мінску праходзілі чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын інвалідаў па зроку. У мужчынскім турніры перамог майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў (Мінск). На другім месцы — майстар Аляксандр Радзівіловіч (Орша), «бронза» ў майстра Мікалая Антосікава (Мінск). Сярод жанчын перамагла кандыдат у майстры Марыя Лясун (Барысаў). Сярэбраны медаль у Ірыны Чэрэднічэнкі (Мінск), бронзавы выйграла Віта Якімчэнка (Гродна).

**№ 52**



**№ 52** Варушыла В.
**Белыя простыя шашкі:** a1, c1, d2, f2, c3, g3, c5, b6 (8)
**Чорныя простыя шашкі:** h4, g5, a7, c7, e7, g7, d8, h8 (8)

**№ 53** Варушыла В.
**Белыя простыя шашкі:** c5, e5, b6, d6, c7 (5)
**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, a3, b4, h4, a5, g5 (7)

**№ 54** Ю. Мурадаў (Барысаў)
**Белыя простыя шашкі:** e1, d2, h2, e3, d4, e5 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** g3, b4, f4, g5, d6, f6, a7, c7, g7, h8 (10)

У шашкі-100 кампазіцыі склаў літоўскі гросмайстар Валдас Беляўскас.

**№ 55**
**Белыя простыя шашкі:** 35, 42, 49, 50, белыя дамкі: (5)
**Чорныя простыя шашкі:** 10, 21, 28, 39, чорныя дамкі: 32(5)

**№ 56**
**Белыя простыя шашкі:** 33, 34, 21, 22, 25 (5)
**Чорныя простыя шашкі:** 30, 12, 14, 7, 9 (5)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Празвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

Анонс: 15—16 мая ў СДЮШАР па шахматах і шашках (Мінск, вул. Ракаўская, 24) адбудзецца XIII адкрыты Рэспубліканскі турнір па шашках-64 памяці М. Гелера. Даведкі па тэл. 80295621190 (Андрэй Валюк).

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам за творчасць, а вядучаму — за падбор матэрыялу. Да сустрэчы на старонцы газеты!» — пішуць Фёдар Карпей і Леанід Жыхар з Мядзеля.

Праверце свае рашэнні

Выпуск № 138 ад 23.04.2021.

№ 48 1. e7-d8 f6:h4 2. d8-f6 e5:g7 3. c5-d6 c7:e5 4. a7:c5 d4:b6 5. f2:h8 h4:f2 6. g1:c1 a3-b2 7. c1:a3 c3-d2 8. h8-c3 d2:b4 9. a3:a7+

№ 49 1. a5-b6 c3:c7 2. g1-h2 d6:b4 3. d2-c3 b4:d2 4. e1:c3 f4:b4 5. h2:f8 h6:f4 6. f8:d8+

№ 50 1. 23-19 14:32 2. 17-12 38:20 3. 12:03 26:17 4. 03:01 36-41 5. 42-37 41:32 6. 01-29 32-37 7. 29-47 37-41 8. 47:36+

№ 51

1. 16-11 06:26 2. 37-31 26:28 3. 49-44 45:34 4. 44:02 19-23 5. 02-11 23-28 6. 11:30 25:34 7. 50-44+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзель), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда».

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Згадаць і помніць цану Перамогі

**У эфіры беларускага тэлебачання дзень Вялікай Перамогі заўсёды адзначаецца асабліва. Паказ памятных акцый, урачыстых цырымоній і ваенных кінафільмаў чакае нас 9 Мая і напярэдадні гэтага знакавага свята.**

Так, журналісты Агенцтва тэленавін у нядзелю будуць на працягу ўсяго дня працаваць у рэжыме маштабнага інфармацыйнага канала, дзе ў прамым эфіры прадставяць галоўныя сталічныя мерапрыемствы, а таксама гледачам будуць прапанаваны тэматычныя падборкі гульнявога і дакументальнага ваеннага кіно, канцэртныя праграмы, спецыяльныя выпускі ўласных праектаў Белтэлерадыёкампаніі.

Ужо па традыцыі напярэдадні Дня Перамогі ўсе тэлеканалы будуць мець святочнае афармленне. Акрамя таго, напрыклад, на каналах медыяхолдынга міжпраграмныя інтэрвалы дапоўняць цыклы мастацкіх відэазамалёвак, героямі якіх сталі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. У эфіры «Беларусь 1» і міжнароднага спадарожнікавага «Беларусь 24» 8 мая ў вячэрнім эфіры для тэлегледачоў падрыхтавалі прэм'еру: 12-серыйны мастацка-публіцыстычны цыкл «Крылы Перамогі». Праект вытворчасці Белтэлерадыёкампаніі, на аснове эпізодаў ключавых падзей гісторыі ВПС Беларускай асобай ваеннай акругі і Заходняга фронту перыяду Вялікай Айчыннай вайны пакажа ўклад беларускай авіяцыі ў вызваленне краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тут даведаемся гісторыі тых, хто першымі сустрэў ворага ноччу 22 чэрвеня і за некалькі дзён да таго, бо толькі 19-20 чэрвеня нямецкія самалёты парушылі дзяржаўную граніцу каля 55 разоў. Спазнаем таямніцы франтавых дзённікаў і рассакрэчаных архіваў, што пральюць святло на дзеянні беларускіх пілотаў як на прасторах роднага неба, так і ў тыле ворага, а таксама пакажа іх ролю ў стрымліванні асноўных сіл праціўніка і ўдзел у лёсавызначальнай аперацыі «Баграціён».



У дзень Перамогі ў эфіры «Беларусь 1» і «Беларусь 24», акрамя згаданага, зможам убачыць трансляцыю святочных падзей у сталіцы. У 11.00 у рэжыме рэальнага часу тэлеканалы пакажуць цырымонію ўскладання кветак і вянкоў да манумента Перамогі ў рамках патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае!», а ў 18.00 — урачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню Дзяржаўнага Герба і Дзяржаўнага Сцяга Рэспублікі Беларусь, і вечарам — святочны гала-канцэрт «Подзвіг народа бессмяротны» ў рамках тэлепраекта «Плошча перамогі». А яшчэ на «Беларусь 1» варта чакаць цікавыя тэматычныя выпускі традыцыйных праграм і паказ кіно.



Тэлеканал «Беларусь 2» адсвяткуе Дзень Перамогі серыяй спецвыпускаў праграм уласнай вытворчасці. У прыватнасці, каманда праекта «Камень, нажніцы, папера» 8 мая адправіцца даследаваць ваенную гісторыю беларускіх мястэчак Шчорсы і Іказнь. Гэтыя аграгарадкі наўрад ці сустрэнеш на картах буйных ваенных баёў, але іх таксама не абмінула вайна. У Іказні ёсць месца гібелі мясцовых яўрэяў, а ў Шчорсах засталіся помнікі загінулым падчас вайны жыхарам вёскі: тут не дажыло да Перамогі больш за 250 чалавек...

Сацыякультурны тэлеканал «Беларусь 3» да Дня Перамогі падрыхтаваў новую серыю тэматычных міжпраграмных відэаролікаў, якія распавядаюць пра франтавыя старонкі біяграфій вядомых беларускіх пісьменнікаў. А ў перадсвяточным эфіры 8 мая пакажа гледачам спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа "Не пакідай мяне..." па п'есе Аляксея Дударава і на вершы Генадзя Бураўкіна. Як адзначаюць аўтары пастаноўкі, яна — даніна памяці тым, хто цаной уласнага жыцця прыблізіў перамогу над фашызмам. Таксама «Беларусь 3» падрыхтаваў кінападборку вытворчасці «Беларусьфільма», у якой любімыя многімі кінастужкі «Кіроўца аўтобуса», «Дняпроўскі рубеж», «У жніўні 44-га...» і іншыя.

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква балетная.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**8.15** «Забытае рамяство». Дак.серыял.
**8.35, 16.30** «Дзень за днём». Маст. фільм.
**9.45** Колер часу. Ван Дэйк.
**10.15** Шэдэўры старога кіно. «Беспасажніца». Маст. фільм.
**11.55** Дарогі старых майстроў. «Магія шкла».
**12.05** «Каця і прынц. Гісторыя адной выдумкі». Дак. фільм.
**12.45** «Шахеразада». Серыял.
**13.45** Да 95-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Трошына. Астравы.
**14.30** Скразное дзеянне. «Права на шэпт».
**15.05** Лісты з правінцыі. Лебядзінае (Ленінградская вобласць) [СЦ].
**15.35** «Энігма. Рудольф Бухбіндэр».
**16.15** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**17.45** Сімфанічныя аркестры Еўропы. Зубін Мета і Ізраільскі філарманічны аркестр.
**18.45** «Царская ложа».
**19.45, 2.00** Шукальнікі. «Золата графа Каліёстра» [СЦ].
**20.30** Лінія жыцця. Кірыл Разлог [СЦ].
**21.25** «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца». Маст. фільм.
**22.55** «2 Верных 2». Ілья Дзямуцкі і Дар'я Жоўнер.
**0.05** «Сіндром Пятрушкі». Маст. фільм.
**2.45** «Кастрама». Мультфільм для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.00** Маст. фільм «Па вуліцах камоду вадзілі» (16+).
**8.05** Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.00, 13.05, 14.40, 15.40, 17.00, 19.15, 20.45, 21.40, 23.00, 1.00, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Не люба — не слухай...» Актуальная класіка». 1991 год (16+).
**13.20** Маст. фільм «Два Фёдары». (16+).
**17.20** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Беражыся аўтамабіля». 2007 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1991-ы. 2008 год (18+).
**19.25** Маст. фільм «Жанчына для ўсіх» (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год (16+).
**1.20** Маст. фільм «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 4.00, 7.00, 11.30, 13.45, 20.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**1.30** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Штодзённая руціна» (12+).
**2.30, 5.30, 8.00** Тэніс. «Ралан Гарос» — 2020 (6+).
**9.30, 22.00** Веласпорт. «Тур Венгрыі» (12+).
**10.30, 23.00** Тэніс. Australian Open (6+).
**13.15** Веласпорт. Мальёрка (12+).
**18.30** Веласпорт (12+).
**20.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс All Around (12+).

## Кінакамедыя

**0.45** Не жартуйце з Зоханам! (16+)
**3.10** Ас (16+).
**4.55** Як украсці брыльянт (16+).
**6.40** Пакуль вяселле не разлучыць нас (12+).
**8.50** Пацучыныя скачкі (12+).
**10.55** Год свіні (16+).
**12.20** Дружба і ніякага сексу? (16+)
**14.10** Зводныя браты (18+).
**16.00** Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
**17.50** Добры доктар (16+).
**19.30** Сутэнёр (16+).
**21.10** Гэты няёмкі момант (16+).
**23.00** Даспехі Бога: аперацыя «Ястраб» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**6.30** «Немец». Маст. фільм (12+).
**9.40** «Паглядзім» (12+).
**10.15, 4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).
**11.15, 3.00** «Паралельны свет» (12+).
**12.15, 18.10** «Сляпая» (16+).
**13.20** «Варажбітка» (12+).
**14.25** «Містычныя гісторыі» (12+).
**15.30** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.05** «Ведзьмакі свету» (16+).
**17.05** «Нечысць» (16+).
**19.50** «Звышнатуральны адбор» (16+).
**20.55** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**22.00** Камедыя «Бойфрэнд з будучыні» (16+).



**0.20** «Хімера». Маст. фільм (18+).
**2.15** «90-я» (16+).
**3.50** «Знак якасці» (16+).

## ТБ1000

**5.15, 17.20** Доктар Хаус (16+).
**6.40** Маленькі Манхэтэн (12+).
**8.15** Пініст (16+).
**10.50** Чытальнік (16+).
**13.00** Гонар і прадузятасць (12+).
**15.10** Джэйн Эйр (12+).
**19.00** Дзюплекс (16+).
**20.30** Чатыры вяселлі і адно пахаванне (12+).
**22.40** Кепскія дзяўчынкі (12+).
**0.20** Таксі (12+).
**1.50** Таксі-2 (12+).
**3.15** Таксі-3 (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.00** Каханне ў вялікім горадзе-3 (12+).
**7.45** Рубеж (12+).
**9.40** Чэмпіёны (6+).
**11.25** Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
**13.15, 19.00** Узыходжанне на Алімп (12+).
**15.15** 28 панфілаўцаў (12+).
**17.15** Танкі (12+).
**21.00** Калашнікаў (12+).
**22.50** Ржэў (12+).
**0.55** 72 метры (12+).
**2.50** Вечнае жыццё Аляксандра Хрыстафорава (16+).
**4.30** Пасажырка (16+).

## National Geographic

**6.00, 23.35** Інстынкт выжывання (16+).
**6.35** Золата Юкана. (16+).
**7.20** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**8.15, 9.55** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.05** Сапраўдны суперкар (16+).
**10.45, 22.40** Аўта-SOS (16+).
**11.35, 3.35** Асушыць акіян (16+).
**12.30, 15.00, 19.15, 1.15** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**13.20** Космас: магчымыя сусветы (16+).
**14.15** Космас: прастора і час (16+).
**17.35** Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
**18.25** Фабрыка ежы (16+).
**21.00, 2.45** Апакаліпсіс: Гітлер ідзе на захад. (16+).
**21.50** Вечная Планета: героі Акіянаў (16+).
**0.25** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна (16+).
**4.25** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**5.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).

## Discovery

**8.00** Сябры-скарбашукальнікі (12+).
**8.46, 16.48, 22.12** Махінатары (12+).
**9.39** Паляўнічыя на старызну (12+).
**10.32, 15.00, 21.18, 5.00** Як гэта зроблена? (12+)
**11.25** Круты цюнінг (12+).
**12.18** Разбуральнікі легенд: кастынг (16+).
**13.12, 6.30** Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
**15.54, 1.47** Музейныя загадкі (12+).
**17.42** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**18.36, 2.40** Смяротны ўлоў (16+).
**19.30** Геній аўтадызайну (12+).
**20.24, 5.45** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**23.06** Багажныя войны (12+).
**0.00** Аляска: апошні рубеж (16+).
**0.54** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**4.15** Мяцежны гараж (12+).

чацвер, 13 мая ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!»
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
8.50 Слова епіскапа Казіміра Велікасельца на свята Ушэсця Гасподняга.
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05 Меладрама «Вяртанне» (16+).
14.00 «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.40, 15.25 Меладрама «Незабытая» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 0.30 «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
18.35, 19.20 Меладрама «Вяртанне» (16+).
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
0.10 Сфера інтарэсаў.
0.55 Дзень спорту.

## Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 16.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 22.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
11.00, 18.25 Серыял «Анатамаванне пакажа» (16+).
12.40 «Да пабачэння» (16+).
13.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
13.50 Фільм для ўсёй сям'і «Сямейныя каштоўнасці» (12+).
15.40 Нічога сабе ньюз (12+).
15.45 «ПІН_КОД» (12+).
16.35 «Клон». Серыял (16+).
17.25 «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.25 «Развод і дзявочае прозвішча» (16+).
23.45 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

## Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Цатні.
8.05, 12.00, 20.20, 23.20 Навіны культуры.
8.25 «Размовы пра духоўнае». Ушэсце Гасподняе.
8.35, 18.00 «Дом з лілеямі». Маст. фільм (16+) [СЦ].
10.30, 15.45 «Цыган». Маст. фільм. (12+) [СЦ].
12.20 «Беларуская кухня». Верашчака.
12.40 «Жывая спадчына».
13.10, 21.05 «Вялікая вайна». Дак. драма. «Курская дуга» (12+).
14.00, 21.55 «Балада пра бомбера». Маст. фільм (16+) [СЦ].
14.55 «Фарбы памяці». Мастак Леанід Шчамялёў [СЦ].
15.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
17.05 «Кадры жыцця». Оперная спявачка, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Людміла Колас.
19.55 «Камертон». Рэжысёр Алена Турава.
20.40 «Калыханка» (0+).
22.50 «Нататкі на палях». Пімен Панчанка: сінія касачы для паэта-філосафа [СЦ].

## Беларусь 5

7.00 Між іншым.
7.15 Валейбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2021. Жанчыны. Швейцарыя — Беларусь.
9.20 Слэм-данк.
9.50 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Першы матч. «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь) — «Барселона» (Іспанія).
11.25 Хакей для ўсіх.
12.00 Тэніс. WTA. Рым.
17.50 Валейбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2021. Жанчыны. Эстонія — Беларусь.
19.50, 21.40 Спорт-цэнтр.
20.00 Веславанне на байдарках і каноэ. Алімпійская кваліфікацыя. Сегед.
21.25 Вось гэта спорт!
21.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Эвертан». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.50 Фактар сілы.

## АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], 8.00 [СЦ], 9.00 [СЦ], 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], 20.30, 0.50 Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.10 «Жыць здарова!» (16+)
11.15 «Модны прыгавор» (6+).
12.20 «Бесталковыя нататкі» (12+).
13.15 Серыял «Медсястра» (12+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20, 0.00 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 Удача ў прыдачу! Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.50 Серыял «Нішто не здараецца двойчы» (16+).
23.00 Серыял «Гурзуф» (16+).

## СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], 7.30 [СЦ], 8.30 [СЦ], 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.45, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.35, 16.50 «Ленінград 46». Серыял (16+).
20.15, 23.15 «СТБ-спорт».
20.20 «Сталічныя падрабязнасці».
20.30 «Міншчына».

## МІР

5.00, 4.10 Серыял «Непапраўныя» (16+).
7.10, 10.10, 23.30, 0.10 Серыял «Без следу» [СЦ] (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10, 17.20 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05, 16.20 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
18.00 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25 Тэлегульня «Гульня ў кіно» (12+).
21.00 Шоу «Назад у будучыню» (16+).
22.55 «Сусветныя гульні розуму» (12+).
2.30 «Свет пераможцаў» (16+).

## РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.35 Маст. фільм «Замах» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.45 «Спецыяльны рэпартаж».
15.10 Канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі «Народжаныя вайной».
17.15 «60 хвілін».
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
21.05 Серыял «Прыстанак» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 6.50, 8.20, 16.20, 19.35, 21.55, 23.20 Сёння. Галоўнае.
6.15 Беларусы (6+).
7.05 «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
7.35 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.30 Сфера інтарэсаў.
8.55 «Навукаманія» (6+).
9.25, 22.00 «НЗ.by».
9.50, 10.20 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
11.05 Серыял «Вочы ў вочы» (16+).
12.05, 13.50 Серыял «Ліцейны» (16+).
13.20 Надзвычайнае здарэнне.
14.50 Пракурорская праверка (16+).
16.25 Гісторыі выратавання (12+).
16.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
19.50 Серыял «Капкан для монстра» (16+).
22.15, 23.35 Серыял «За гадзіну да світання» (16+).

## 8 канал

7.00, 15.20, 18.40, 21.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мультпарад». «Шчанячы патруль» (0+).
7.30, 15.25 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).
8.15 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).
9.45 Дак. экран «Аляксандр Чыжэўскі. Запалонены сонцам» (12+).
10.30 Камедыя «Сэрцаедкі» (16+).
12.30 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).
13.45 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).
15.30 «Мультпарад». «Вялікія сабачыя ўцёкі» (0+).
17.00 Драма «Таямніца апошняй главы» (16+).
18.45 Серыял «Апошні артыкул журналіста» (16+).
19.35 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
19.55 Серыял «Загрузка» (16+).
20.50 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).
20.55 «Вечарніца» (6+).
21.10 Драма «Номадленд» (16+).
23.00 Трылер «Д'ябал ў дэталях» (16+).
1.05 «Надвор'е».

## ВТБ

6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.00, 14.20 Шоу «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.20 «Лаві момант» (16+).
13.15, 3.05 Серыял «Варонiны» (12+).
16.20, 2.10 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
17.25 «Уральскія пельмені» (16+).
18.30, 4.00 Серыял «Усход-Захад» (16+).
20.30 Серыял «Па калена» (16+).
21.30 Серыял «Госці з мінулага» (16+).
0.20 Серыял «Маладзёжка» (16+).
5.40 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Балтыка прыбярэжная.
7.05, 20.05 «Правілы жыцця».
7.35, 18.30 «Таямніцы зніклых гігантаў». Дак. фільм [СЦ].
8.35, 16.30 «Дзень за днём». Маст. фільм.
9.45 «Забытае рамяство». Дак. серыял.
10.15 «Назіральнік».
11.10, 0.55 XX стагоддзе. «Майстар. Міхаіл Булгакаў». 2-я серыя. 1987 год.
12.10 «Свет Піранезі». Дак.фільм.
12.40, 0.00 «Шахеразада». Серыял.
13.50 Да 800-годдзя Аляксандра Неўскага. Улада факту.
14.30 Скразное дзеянне. «Рэпертуарная лінія».
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Маё каханне — Расія! «Святы кацкарэй» [СЦ].
15.45 «2 Вернік 2». Валерый Тадароўскі.
17.30, 1.55 Сімфанічныя аркестры Еўропы. Сямён Бычкоў і Чэшскі філарманічны аркестр.
19.45 «Галоўная роля».
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 Кіно пра кіно. «Вяселле ў Малінаўцы». Вашу ручку, бітэ-дрытэ». Дак. фільм [СЦ].
21.25 «Энігма. Рудольф Бухбіндэр».
22.10 «Тайна «Гранд-оперы». Маст. фільм.

## Настальгія

6.00 «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год (16+).
7.00, 8.40, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 19.05, 20.40, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца» (16+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
12.00 «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
13.00 Маст. фільм «Па вуліцах камоду вадзілі» (16+).
14.05 Кінаканцэрт «На біс». 1988 год (12+).
18.00 «Не люба — не слухай...» Актуальная класіка». 1991 год (16+).
19.20 Маст. фільм «Два Фёдары». 1958 год (16+).
23.20 Дак. фільм «Фільм пра фільм. Беражыся аўтамабіля». 2007 год (16+).
00.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Радыё 70—80-х». 2005 год (18+).
01.20 Маст. фільм «Ваенна-палявы раман» (16+).

## EuroSport 1

0.00, 4.00, 7.00, 11.30, 20.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
1.30 Веласпорт. Афрыка (12+).
2.00 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Штодзённая руціна» (12+).
2.30, 10.30, 23.30 Тэніс. US Open — 2020 (6+).
5.30, 8.00 Тэніс. «Ралан Гарос» — 2020 (6+).
9.30, 22.00 Веласпорт. «Тур Венгрыі» (12+).
18.30 Веласпорт. Кубак Бельгіі (12+).
20.00 Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс All Around (12+).
23.00 Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (6+).

## Кінакамедыя

1.35 100 рэчаў і нічога лішняга (18+).



4.20 Канікулы строгага рэжыму (12+).
6.30 Бандыткі (16+).
8.10 Ніндзя з Беверлі-Хілз (12+).
9.50 Дружба і ніякага сексу? (16+)
11.35 Як знаць... (16+)
13.55 Год свінні (16+).
15.20 Пацучыныя скачкі (12+).
17.25 Даспехі Бога: аперацыя «Ястраб» (12+).
19.30 Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
21.15 Зводныя браты (18+).
23.05 Даспехі Бога (16+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
6.30 «Немец». Маст. фільм (12+).
9.40, 23.40 «Улегцы» (12+).
10.15, 15.55, 4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).
11.15 «Паралельны свет» (12+).
12.10, 18.50, 3.10 «Сляпая» (16+).
13.15, 19.55, 4.05 «Варажбітка» (16+).
14.20 «Містычныя гісторыі» (12+).
15.20 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
16.55 «Ганна-дэтэктыў». Серыял (16+).
21.00 «Добры доктар». Серыял (16+).
22.45 «Грым». Серыял (16+).
0.15 «Знак якасці» (16+).
1.00 «Зладзейка кніг». Маст. фільм (12+).

## ТБ1000

5.00, 17.20 Доктар Хаус (16+).
6.55 Баявы конь (12+).
9.55 Вайна токаў (18+).
11.40 Смурфікі (6+).
13.25 Смурфікі-2 (6+).
15.15 Гонка (16+).
19.00 Вораг каля брамы (16+).
21.15 Піяніст (16+).
23.55 Чытальнік (16+).
1.50 Гонар і прадузятасць (12+).
3.50 Апошняе каханне на Зямлі (16+).



## ТБ1000 Рускае кіно

6.35, 14.50 Белы снег (6+).
9.05 Адзін удых (12+).
10.50 Адзінка (12+).
12.50, 19.00 Узыходжанне на Алімп (12+).
17.10 Рубеж (12+).
21.00 Чэмпіёны (6+).
22.45 Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней (6+).
0.35 Ржэў (12+).
2.30 Каханне ў вялікім горадзе (16+).
4.10 Каханне ў вялікім горадзе-2 (16+).

## National Geographic

6.00, 23.30 Інстынкт выжывання (16+).
6.45 Золата Юкана (16+).
7.30 Самыя лепшыя суперкары (16+).
8.20, 10.05 Падарожжы з Гарданам Рамзі (16+).
9.15 Сапраўдны суперкар (16+).
10.55, 22.40 Аўта-SOS (16+).
11.45, 3.30 Асушыць акіян (16+).
12.40, 16.45 Непакорлівы востраў (16+).
13.25 Космас: магчымыя сусветы (16+).
14.20 Космас: прастора і час (16+).
15.05, 19.15, 1.10, 2.40 Расследаванні авіякатастроф (16+).
17.35 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.25 Фабрыка ежы (16+).
21.50 Злавіць кантрабандыста (16+).
0.20 Ліхтугі за мяжой: злачынствы і пакаранне (16+).
1.55 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна (16+).
4.20 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
5.05 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).

## Discovery

8.00, 18.36, 2.40 Смяротны ўлоў (16+).
9.39 Паляўнічыя на старызну (12+).
10.32, 15.27, 21.18 Як гэта зроблена? (12+)
11.25 Круты цюнінг (12+).
12.18 Разбуральнікі легенд: кастынг (16+).
13.12, 6.53 Голыя і напалоханыя (16+).
14.33 Сталёвыя хлопцы (12+).
15.54, 1.47 Музейныя загадкі (12+).
16.48, 22.12 Махінатары (12+).
17.42 Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
19.30 Геній аўтадызайну (12+).
20.24, 5.23 Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
23.06 Багажныя войны (12+).
0.00 Залатая ліхаманка: Берынгава мора (12+).
3.30 Разбуральнікі легенд: спецвыпуск (12+).
4.15 Мяцежны гараж (12+).
5.00 Як гэта ўладкавана? (12+)
6.08 Голыя і напалоханыя XL (16+).

# Майстар-клас на мове рома

ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

## У Магілёве спрабавалі зацікавіць дзяцей цыганскай дыяспары інавацыйнымі падыходамі

**Праект «Адукацыя рома — новы погляд у будучыню» быў заяўлены пяць гадоў таму Гомельскім грамадскім аб'яднаннем «Сацыяльныя праекты». Яго мэта — сацыялізацыя дзяцей рома праз новыя падыходы ў адукацыйным працэсе і забеспячэнне ўзаемадзеяння паміж педагогамі і бацькамі гэтых дзяцей. Летась партнёрам «Сацыяльных праектаў» стала Майстэрня інавацыйных тэхналогій, і ва ўсіх рэгіёнах былі створаны рэсурсныя цэнтры па адукацыі цыганоў. У Магілёве такі цэнтр з'явіўся на базе абласнога інстытута развіцця адукацыі. А нядаўна ў абласным цэнтры прайшоў вялікі рэспубліканскі семінар на гэтую тэму.**



### Цыганская школа

Вучоба адбылася на базе школы № 13, якая лічыцца ў Магілёве цыганскай. З болей чым 500 школьнікаў, якія тут вучацца, — 78 — дзеці рома. Наогул, у вобласці ўжо шэсць школ, дзе ёсць такія вучні, далучыліся да праекта. Настаўнікі не хаваюць, што пэўныя цяжкасці ў рабоце з дзецьмі існуюць. Цыганскія дзеці размаўляюць паміж сабой выключна на сваёй мове, яны амаль не наведваюць дзіцячыя садкі і цяжэй адаптуюцца да школы, такія дзеці трымаюцца адасоблена ад іншых, а пасля школы наогул выпадаюць з грамадскага жыцця. Дзе яны працуюць і за конт чаго жывуць, часцей за ўсё застаецца таямніцай.

— Вельмі спадзяюся, што праект дапаможа сацыялізаваць нашых цыганоў і гэта ім спатрэбіцца ў жыцці, — кажа **дырэктар школы № 13 Наталля СМАРОДСКАЯ.** — Ёсць сярод іх і медалісты, і студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі. Гулец БАТЭ Уладзімір Юрчанка, адзін з вядучых беларускіх футбалістаў, — наш выпускнік. Але гэта не тыповыя прыклады — часцей за ўсё нават выключэнні з правіл.

Наколькі тэма актуальная і патрэбная, можна было меркаваць па ўдзельніках сустрэчы. На ёй прысутнічалі начальнік упраўлення па адукацыі Магілёўскага гарвыканкама Ірына Рыбакова, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прарэктар МДУ імя А. Куляшова Алег Дзячэнка, эліта магілёўскай ромскай дыяспары на чале з іх лідарам Яфімам Казіміравым. Цыганы, дарэчы, дагэтуль добрым словам згадваюць старшыню Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлю Качанаву, якая прыязджала да іх, калі ўзнік канфлікт у адносінах да прадстаўнікоў дыяспары з боку міліцыі.

— Мы за тое, каб жыць у міры і згодзе, каб нашы дзеці развіваліся і рэалізоўваліся, — заявіў **Яфім КАЗІМІРАЎ.** — Шмат прыкладаў, калі яны вельмі цесна сябруюць з беларускімі дзецьмі. І вучацца не горш.

Бар'еры, вядома, ёсць, і іх трэба вучыцца пераадольваць. Цыганы мяркуюць, што вельмі можа ў гэтым дапамагчы культурны складнік. Можна, напрыклад, аднавіць дзіцячы ансамбль цыганскай песні і танца, які быў раней. Праз мастацкую самадзейнасць прасцей наладзіць стасункі, лічаць прадстаўнікі рома.

— У Гомелі мы таксама пачыналі складана. Але потым колькасць рома, якія жадалі далучыцца да праекта, зашкальвала, — кажа **дырэктар установы адукацыі «Рамана дром» Вольга НЯЧАЕВА.** — Яны чакалі ад нас ужо не матэрыяльнай дапамогі (хоць спачатку мы і партфелі збіралі іх дзецям да школы), а прагнулі ведаў, каб сацыялізаваць сваіх нашчадкаў. Быў усталяваны моцны міжасобасны кантакт «бацькі — дзеці — настаўнік». І гэта цудоўна. Рома зразумелі, што толькі ўзаемадзейнічаючы можна пераадолець усе бар'еры. І дзецям прасцей стала рэалізаваць свае магчымасці.



### Інавацыйныя і беспрэцэдэнтныя

Пра тое, што цыганы таксама імкнуцца мяняцца, гаварыла **ініцыятар і кіраўнік праекта, дырэктар Гомельскага абласнога грамадскага аб'яднання «Сацыяльныя праекты» Ніна КЕКУХ.**

— Працэс сацыялізацыі ромскага грамадства нялёгкі, паколькі ў іх свае этнічныя асаблівасці і менталітэт, — тлумачыць яна. — Перад намі стаіць задача сацыялізаваць рома пры захаванні іх культуры і традыцый. Гэта няпроста, бо яны да сябе блізка не падпускаюць. І ў шырокай грамадскасці да іх ёсць пэўны недавер з-за іх жа паводзін. Але цыганская супольнасць таксама мяняецца. Яны разумеюць, што, калі няма адукацыі, прафесійных навыкаў, уладкавацца ў жыцці цяжка. Рома — людзі амбіцыйныя, але, калі яны прыходзяць на заняткі, спрацоўвае дух саперніцтва. Яны бачаць, што ёсць дзеці мацнейшыя за іх, і імкнуцца падцягнуцца да гэтай планкі. У некаторых дзяцей узровень ведаў і камунікатыўных здольнасцяў павялічваецца да 50—60 %. І калі яны прыходзяць у першы клас пасля такой падрыхтоўкі, ім не трэба тлумачыць, як сабе паводзіць, яны цалкам адаптаваныя.

Падтрымаць праект на рэспубліканскім узроўні дапамагла Майстэрня інавацыйных тэхналогій.

— Гэта наш кірунак, —заўважае **дырэктар Майстэрні і менеджар праекта Уладзімір АЛЕКСАНДРОНЕЦ.** — Тэма адукацыі ў яе ўразлівых груп — а цыганская з прычыны этнічных, ментальных асаблівасцяў менавіта такой і лічыцца — для нас архіважная. Мы і арганізацыю стварылі для таго, каб садзейнічаць устойліваму развіццю мясцовых супольнасцяў праз прасоўванне ідэй адукацыі на працягу ўсяго жыцця. Адукацыя здольная мяняць жыццё людзей і рабіць яе лепш. Культура цыганскай суполкі вельмі цікавая, але, паколькі гэта група дастаткова закрытая, асаблівасці цыганоў у Беларусі мала вывучаны. І працаваць з гэтай катэгорыяй непадрыхтаванаму чалавеку немагчыма. Таму праектная група робіць акцэнт на работу з педагогамі, на майстар-класы. Важна даць інструменты, методыкі, падыходы. Вялікія спадзяванні на педагогаў, што яны будуць фіксаваць інфармацыю пра танцы, песні, казкі, быт, адзенне, ежу рома. Для этымалогіі гэта вельмі важна.

У працэс па сацыялізацыі цыганоў актыўна ўключыўся Магілёўскі абласны інстытут развіцця адукацыі, на базе якога некалькі месяцаў таму запрацаваў адмысловы рэсурсны цэнтр. Ён займаецца распрацоўкай інавацыйных метадаў работы з дзецьмі рома.

— Мы ўзаемадзейнічаем з педагогамі і бацькамі, а яны потым выкарыстоўваюць гэты вопыт у рабоце і выхаванні, — кажа **начальнік аддзела інстытута Святлана СЕЛЯЗНЁВА.** — Да гэтай дзейнасці мы прыцягваем маладых педагогаў, пераможцаў конкурсаў прафесійнага майстэрства. Ім вельмі цікавы гэты праект.

На семінары перадавымі метадамі работы па ўцягванні дзяцей рома ў адукацыйны працэс падзяліліся з калегамі маладыя і крэатыўныя педагогі Магілёўшчыны. Настаўнік геаграфіі Мяжысецкай школы Андрэй Трэй паказаў, як можна выкарыстоўваць тэхналогію адукацыйнага падарожжа. Тэмай яго ўрока стала гісторыя цыганоў. Прызнаецца, што сам зрабіў для сябе адкрыцці пры паглыбленні ў тэматыку. А настаўнік беларускай мовы і літаратуры гэтай жа школы Антон Лабаноўскі лічыць, што матэрыял лепш засвойваецца, калі падаецца праз малюнак. І ў дзяцей рома нават не ўзнікне праблем з вывучэннем беларускай мовы, перакананы ён.

Арганізатары праекта лічаць, што сацыялізацыя дзяцей рома праз адукацыйны працэс яшчэ больш зблізіць беларускі народ і зробіць яго больш моцным і трывалым. І тое, што зацікаўленасць у рэалізацыі праекта ёсць, абяцае дастаткова хуткі вынік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

### Кампетэнтна

**Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прарэктар МДУ імя А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА:**

— Наша краіна шматнацыянальная, у Беларусі жыве больш чым 130 нацыянальных і этнічных груп. Па выніках перапісу насельніцтва ў 2019 годзе, колькасць цыганоў складае ўсяго 6848 чалавек, з іх 279 жывуць у Магілёўскай вобласці. Па неафіцыйных даных, цыганоў значна больш — каля 60 тысяч. Гэта сведчыць, што народ рома мала вывучаны і сацыялізаваны. Але дзяржава робіць усё для таго, каб міжнацыянальныя адносіны ў краіне развіваліся гарманічна. Наша дзяржаўная палітыка будуецца на прынцыпе роўнасці нацыянальных і этнічных груп перад законам. Правядзенне рэспубліканскага семінара па ўцягванні дзяцей рома ў адукацыйны працэс — знакавая падзея. Яна не толькі адпавядае інтарэсам нацыянальнай палітыкі, але і накіравана на забеспячэнне вялікай палітычнай задачы. Талерантнасць і міжнацыянальнае пагадненне, абарона дзяржавай інтарэсаў усіх нацыянальных і этнічных груп садзейнічае фарміраванню нацыянальнай ідэнтычнасці, грамадзянскай згоды і міру ў краіне. Гэта асабліва важна ў Год народнага адзінства.

У ПОЛІ ЗРОКУ

# Звароты грамадзян — заўсёды на кантролі

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ па даручэнні старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай разгледзеў з выездам на месца зварот мінчанкі, які датычыўся аднаўлення жылога дома пасля пажару.**

У разглядзе звароту таксама былі задзейнічаны кіраўніцтва Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, прадстаўнікі адміністрацыі Заводскага раёна Мінска і іншыя зацікаўленыя.



Адпаведным службам дадзены даручэнні аператыўна прапрацаваць пытанні аднаўлення жылля ў адпаведнасці з патрабаваннямі і абмежаваннямі, прадугледжанымі дзеючым заканадаўствам.

— Праблемы, адзначаныя ў звароце, да ўрэгулявання мясцовымі органамі ўлады застаюцца на кантролі Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, — падкрэсліў сенатар.

***

**Днём раней Міхаіл РУСЫ наведаў Пухавіцкі раён Міншчыны, дзе таксама разгледзеў зварот шматдзетнай сям'і непасрэдна на месцы. Гаворка ў лісце датычылася нездавальняючага стану пад'язных шляхоў да іх жылога дома ў вёсцы Матарова.**

Да разгляду звароту таксама было прыцягнута кіраўніцтва Пухавіцкага раённага выканаўчага камітэта і раённага Савета дэпутатаў.

Як паведамілі ў профільнай камісіі, праблемы, адзначаныя ў звароце, у хуткім часе будуць урэгуляваныя мясцовымі органамі ўлады.

# Як будуецца кальцавая дарога вакол Гродна?

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ наведаў аб'екты будаўніцтва кальцавой дарогі вакол абласнога цэнтра.**



Парламентарый азнаёміўся з работамі па рэканструкцыі чыгуначнага моста пад аўтамабільны, а таксама ўзвядзенні кальцавой развязкі з пуцеправодам на левым беразе Нёмана.

Вялікае абходнае транспартнае кола — гэта ўнікальны праект, у склад якога ўключаны чыгуначны мост праз Нёман у раёне вёскі Кашэўнікі і падыходы да яго з абодвух бакоў ракі, а таксама выхад на вуліцу Карскага, у мікраёна жылой забудовы Грандзічы.

— У Гродне, дзе працягваецца будаўніцтва другой кальцавой развязкі абходнага кола вакол горада, работа над збудаваннем вялікага 36-кіламетровага кола не спыняецца нават у святочныя дні, — адзначыў сенатар.

Чакаецца, што першая чарга аб'екта будзе здадзена сёлета да 3 ліпеня — Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

# Напрасткі — хутчэй!

**Днямі член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд» Уладзімір МАЦВЕЕЎ узяў удзел ва ўрачыстым адкрыцці наплаўнога моста праз раку Заходняя Дзвіна ў гарпасёлку Бешанковічы.**

— Новы мост скароціць аб'язныя шляхі для сельгастэхнікі і аўтамабіляў. Гэта не толькі дазволіць істотна сэканоміць паліва, але і, самае галоўнае, — аператыўна вырашаць пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва, — падкрэсліў парламентарый.

ЗАПРАШАЛЬНІК

## Паслухаць франтавыя песні і пакаштаваць салдацкую кашу

### Якая праграма чакае мінчан і гасцей сталіцы на 9 Мая?

**У горадзе будзе дзейнічаць некалькі святочных пляцовак, на кожнай з якіх запланаваны свае цікавінкі і адметныя мерапрыемствы. Аб тым, што і дзе можна будзе ўбачыць у Мінску ў гэты святочны дзень, паведаміў тэлеграм-канал «Мінск. Афіцыйна».**




Так, у **11.00** свята распачнецца з урачыстай цырымоніі ўскладання кветак і вянкоў да **манумента Перамогі.** Ушанаваць памяць загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны прыйдуць афіцыйныя дэлегацыі дзяржаўных органаў, працоўных калектываў сталічных прадпрыемстваў, прадстаўнікоў грамадскіх і прафсаюзных арганізацый, адміністрацый раёнаў, духавенства, дэпутаты, моладзь.

У **парку Перамогі** ў **11.00** стартуе святочная тэматычная праграма, у якой возьмуць удзел аркестры і вакальна-інструментальныя калектывы, пройдуць паказальныя выступленні па рукапашным баі, а вайскоўцы кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь прадэманструюць сваё майстэрства ў дрэсіруванні службовых сабак. Галоўнай асаблівасцю свята стане выстаўка ваеннай тэхнікі. Дарэчы, тут жа будзе працаваць і палявая кухня. Усе мерапрыемствы будуць доўжыцца да **17.00.**

Каля **Палаца спорту** ў поўдзень распачнецца канцэртная праграма «Мая вясна! Мая Перамога!». Канцэрт дасць магчымасць акунуцца ў атмасферу ваеннага часу, паслухаць франтавыя песні і папулярныя творы ваенных гадоў. Атрымліваць асалоду ад чароўнай музыкі можна будзе да **23.00.** Там жа, на пляцоўцы каля Палаца спорту, ужо з **10.00** будзе дзейнічаць святочны кірмаш.

**На плошчы Дзяржаўнага Сцяга** ў **18.00** пройдзе ўрачысты рытуал ушанавання дзяржаўных сімвалаў — герба і сцяга.

Увечары, у **21.30 на плошчы Перамогі,** пройдзе святочны гала-канцэрт «Подзвіг народа бессмяротны», які будзе трансліравацца на тэлеканале «Беларусь 1».

Па традыцыі завершыцца святочны дзень маляўнічым феерверкам, які запланаваны на **23.00.** Арганізатары абяцаюць уразіць гледачоў разнастайнасцю колераў і формаў агнявога шоу.

# НЕ ЗАРАСЦЕ НАРОДНАЯ СЦЯЖЫНКА

### Прадпрымальнік за свае сродкі ўладкаваў помнік загінулым на фронце. Цяпер каля пастамента заўсёды кветкі

**ВЁСКА Цюрлі знаходзіцца непадалёк ад Маладзечна, на трасе Р56, якая злучае райцэнтр з Валожынам. Дарога даволі ажыўленая, па ёй праходзяць у дзень дзясяткі, а можа, і сотні машын. У населенага пункта даволі багатая гісторыя. Упершыню ён згадваецца ў XVIII стагоддзі. У пачатку XX мястэчка ўвайшло ў Маладзечанскую валасць Вілейскага павета Віленскай губерні. Да 1939 года было пад панскай Польшчай. З 1939-га — у складзе БССР. Падчас Вялікай Айчыннай вайны з канца чэрвеня 1941-га да пачатку ліпеня 1944-га — пад нямецкай акупацыяй. Фашысты спалілі тут 27 двароў, а 42 жыхары вёскі, якіх забралі на фронт пасля вызвалення Беларусі, не вярнуліся дадому.**

У 1965 годзе загінулым землякам быў усталяваны помнік у скверы насупраць калгаснай канторы. У 1990 гадах гаспадарку далучылі да суседняй. А будынкі былога праўлення прыходзілі ў заняпад, разбураўся і помнік. Збудаванні на аўкцыёне набыў **Сяргей МІНКОЎСКІ.** У адным будынку Сяргей Мікалаевіч пасля рамонту і рэстаўрацыі ўладкаваў невялікі камфартабельны гатэль. У другім адвёў месца для паштовага аддзялення. Работнікі його сядзелі ў непрыстасаваным памяшканні, без зручнасцяў, не было каналізацыі, водаправода. Цяпер аддзяленне абсталявана ўсёй неабходнай тэхнікай для аказання разнастайных паслуг. Мясцовыя жыхары вельмі ўдзячныя Сяргею Мінкоўскаму: не трэба ехаць у Маладзечна, каб адправіць пасылку, адксеракапіраваць дакумент, заплаціць за камунальныя паслугі. Усё на месцы, у крокавай даступнасці.

— Давялося шмат папрацаваць і ўкласці немала сродкаў, каб прывесці выкупленыя будынкі ў прыстойны выгляд, — кажа Сяргей Мікалаевіч. — Падвёў газ, каналізацыю, электрычнасць, зрабіў сваю кацельню. Вы б пабачылі, у якім стане быў сквер. Зрэзалі там старыя аварыйныя дрэвы, на іх месца пасадзілі маладыя, ачысцілі яго ад смецця, непатрэбных кустоў, цалкам правялі добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі, заасфальтавалі, выклалі тратуарнай пліткай.

І, вядома ж, не мог прадпрымальнік пакінуць помнік загінулым на фронце жыхарам Цюрляў у такім непрыглядным стане.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але, зрэшты, укладваць грошы ў яго рамонт было нэмэтазгодна. Прасцей было паставіць новы. Сяргей Мінкоўскі звярнуўся да мясцовых улад, каб знесці і ўсталяваць яго ў іншым месцы. Сельвыканкам сабраў актыў, на ім прысутнічалі і два ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія на той час былі жывыя. Ідэю Сяргея Мікалаевіча падтрымалі, і мясцовая ўлада адвяла месца для ўстаноўкі помніка насупраць былой канторы, па другі бок дарогі.

Мы з Сяргеем Мікалаевічам падыходзім да шасціметровага помніка. Да яго выкладзена дарожка, абапал — тратуарная плітка, высаджаны туі, кветкі. На гранітнай пліце выбіты прозвішчы 42 загінулых на фронце землякоў узростам ад 17 да 40 гадоў.

Заказваў мой суразмоўнік помнік у Мінску. На той час, а гэта быў 2014 год, ён абышоўся недзе каля васьмі тысяч долараў у эквіваленце. Помнік знаходзіцца на балансе сельскага Савета. Тут ладзяцца мітынгі ў дзень Перамогі, Дзень вызвалення Беларусі. Каля пастамента заўсёды кветкі. Словам, сцяжынка да яго ніколі не зарастае.

— Сяргей Мікалаевіч, у вас, як прадстаўніка старэйшага пакалення, вельмі трапяткія адносіны да светлай памяці тых, хто ваяваў за свабоду, аддаў сваё жыццё за будучыню дзяцей і ўнукаў...

— На долю нашых бацькоў і дзядоў выпала шмат нягод, па сутнасці, яны не бачылі добрага жыцця. Працавалі, ваявалі, пасля вайны падымалі з руін гаспадарку. І ўсё гэта дзеля будучых пакаленняў, нас з вамі. Ваеннае ліхалецце не абышло бокам і маіх родных, сваякоў. Мой бацька вучыўся ў Слоніме на кінамеханіка, калі пачалася вайна. У ліпені 1941 года яму споўнілася б 18 гадоў. Ён пайшоў паказваць дарогу чырвонаармейцам, якія адступалі, і не вярнуўся назад. Ён падаўся разам з байцамі і аказаўся пад Вязьмай, дзе яго залічылі ў артылерыю. Трапіў у палон да немцаў — збег. Яго злавілі — зноў збег. І так паўтаралася некалькі разоў. Зімой 1942-га лясамі ён дабраўся дадому. Яго, брата і бацьку немцы адправілі ў Германію. Брат загінуў, а яны з татам вярнуліся ў родную вёску. Яшчэ адзін мой сваяк загінуў у Германіі, там жа і пахаваны. Мы ездзілі на яго магілу. Толькі пазайздросціць: усё чыста і акуратна прыбрана, дагледжаная магіла з шыльдачкай і з прозвішчам.

Тэма мінулай вайны для майго суразмоўніка сапраўды балючая.

— Многія ўдзельнікі вайны жывымі вярнуліся дамоў, працавалі ў калгасе. Пахаваныя яны на простых вясковых могілках. Ніхто не прыйдзе схіліцца іх магілам на Дзень Перамогі. І гэта, лічу, вялікая несправядлівасць, — выказвае шкадаванне Сяргей Мінкоўскі. — Варта было б і іх прозвішчы выбіць на помніку.

Сяргей Мікалаевіч нарадзіўся ў Лебедзеве. Гэта адна з найстарэйшых і самых вялікіх вёсак Маладзечанскага раёна. Калісьці гэта было яўрэйскае мястэчка. Тут гітлераўцы знішчылі 950 яўрэяў. На месцы іх гібелі ўсталяваны нядрэнны помнік. Але, на думку майго суразмоўніка, варта добраўпарадкаваць тэрыторыю каля яго, пакласці плітку, пасадзіць алею.

— А вы часам не дэпутат сельскага Савета? Ваша неўтаймаваная энергія, неабыякавасць да праблем людзей спатрэбілася б у грамадскай дзейнасці, — спытала на прыканцы ў мужчыны.

— Я пабываў у ролі дэпутата яшчэ з усім маладым. Даводзілася займацца шмат якімі справамі. Аднойчы паскардзілася жанчына на свайго мужа. І я, зялёны юнак, ездзіў іх мірыць, — усміхаецца Сяргей Мікалаевіч. — А што датычыцца сельвыканкама, то мы падтрымліваем цесныя стасункі. І я ніколі не атрымліваў адмовы ў дапамозе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## Падрыхтоўка да Радаўніцы ў Мінску

**Многія мінчане пачалі прыводзіць у парадак магілкі сваіх родных і блізкіх. Але традыцыйна шмат людзей збіраецца там менавіта на Радаўніцу, што часам не абыходзіцца без дробных праблем і непаразуменняў. Каб звесці іх да мінімуму, мясцовыя ўлады сталіцы загадзя правялі папярэднюю работу.**

Як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, тэме Радаўніцы была прысвечана спецыяльная нарада з прадстаўнікамі зацікаўленых службаў. Іх кіраўнікі далажылі аб тым, што ўсе могілкі, як у горадзе, так і за яго межамі, пэўным чынам падрыхтаваны і добраўпарадкаваны, а там, дзе трэба, зроблены рамонт, забяспечаны вадой і кантэйнерамі для смецця, вызначаны месцы для продажу кветак. Паўсюдна будзе наладжаны пракат інвентару для прыбірання могілак, каб людзі не везлі з сабой лапаты, шуфлікі, мяцёлкі і іншыя прылады.

Каб не ўзнікала недарэчнасцяў з транспартам, мясцовыя ўлады сталіцы прадумалі і гэта пытанне. Ёсць адпаведная дамоўленасць з ДАІ аб кантролі за рухам да могілак. Туды, дарэчы, на Радаўніцу ўезд аўтамабіляў будзе бясплатны. Падрабязную інфармацыю пра маршруты грамадскага транспарту да могілак з 8 да 11 мая можна знайсці на сайце гарвыканкама.

**Леанід ТУГАРЫН.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбарнікаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2021 года.**

Будзьце пільныя!

# Бачыць скрозь сцэны

## Як не трапіць у арэндную пастку



**Пошук новай здымнай кватэры — пытанне заўсёды хвалюючае, асабліва для тых, хто не сустракаўся з ім раней. У нерухомасці, дзе круцяцца вялікія грошы, трапіць на махляроў даволі лёгка. Практычнымі парадамі ў галіне арэнды падзялілася Кацярына ФІЛОНЧЫК, дырэктар аднаго з вядучых сталічных агенцтваў, з вопытам работы ў сферы каля 10 гадоў.**

**«Фэйкі».** Сярод кватэр на сайтах можна сустрэць неіснуючыя аб'екты, якія публікуюцца як «прынада» для арандатараў. Звычайна гэта вельмі прывабныя, а часам і казачныя па кошце варыянты, напрыклад — двухпакаёўка з еўрарамонтам каля метро за 250 у.а.». Каб атрымаць каардынаты гаспадара гэтай цуда-кватэры, вам трэба будзе заплаціць агенцтву і падпісаць дагавор аб аказанні «інфармацыйнай паслугі». Як толькі ўсё будзе зроблена і вы патэлефануеце па атрыманым нумары, хутчэй за ўсё, вам адкажуць, што кватэру толькі-толькі здалі. Грошы, вядома, ужо не вернуцца, таму што паслугу вам аказалі.

*Пазбегнуць гэтага можна, калі працаваць з агенцтвамі «па факце засялення». У такім выпадку вам падбіраюць варыянты па вашых запытах, афармляюць усе дакументы, а заплаціць агенцтву вы павінны будзеце толькі пасля дасягнення асабістых дамоўленасцяў з гаспадаром або пасля заключэння дагавора з ім жа.*

**Аванс за кватэру.** Вы знайшлі ідэальны варыянт, патэлефанавалі і даведаліся, што кватэра актуальная, але на яе прэтэндуе яшчэ некалькі патэнцыяльных кліентаў. Каб быць перакананымі, што вы сур'ёзны чалавек і гатовыя засяліцца, ашуканцы могуць папрасіць вас пералічыць аванс на картку. Дасылаць грошы незнаёмцу, а тым больш не паглядзеўшы жыллё, наўрад ці хто стане. Найбольш верагодна, гэтай кватэры ўвогуле не існуе, а той, з кім вы размаўлялі, зусім не яе ўладальнік.

*Каб не трапіць у такія абставіны, пераканайцеся, што кватэра рэальная, і перад вамі яе гаспадар. Калі размова зайшла пра аванс, для свайго спакою можна напісаць распіску.*

**Здача чужой нерухомасці.** Часам, каб хутчэй атрымаць грошы, чалавек вельмі лёгка пагаджаецца на ўсе вашыя ўмовы: гатовы бясплатна даставіць мэблю, зрабіць поўны рамонт кватэры. Некаторыя людзі могуць здаваць нерухомасць членаў сваёй сям'і, нічога не кажучы ўладальнікам. Сітуацыя, калі вы заехалі ў апартаменты, а праз некалькі дзён з'яўляюцца яго рэальныя гаспадары або іншыя жыхары, будзе, мягка кажучы, непрыемная.

*У такім выпадку вам дастаткова будзе папрасіць дакументы і ўпэўніцца, што вы размаўляеце менавіта з уласнікам. Такім чынам ашуканец не атрымае вашы грошы за чужую кватэру на паўгода наперад і вы спакойна зможаце пераехаць на новае месца.*

**Марыя ТАРНАЛІЦКАЯ.**

# СПРАВА ЦІХАНОЎСКАГА НАКІРАВАНА Ў СУД

**Генеральная пракуратура накіравала ў Вярхоўны суд для вызначэння падсуднасці крымінальную справу па абвінавачанні: Ціханоўскага С. Л., Сакава А. М., Папова Д. Ю. па ч. 1 арт. 293, ч. 3 арт. 130, ч. 2 арт. 191, ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса Беларусі; Лосіка І. А., Цыгановіча У. У. па ч. 1 арт. 293 і ч. 3 арт. 130 КК; Статкевіча М. В. па ч. 1 арт. 293 КК. Пра гэта паведамілі ва ўпраўленні ўзаемадзеяння са СМІ і рэдакцыйнай дзейнасці Генеральнай пракуратуры.**

Згодна з матэрыяламі справы, Ціханоўскі С. Л., Статкевіч М. В., а таксама прыцягнутыя імі Сакаў А. М., Папоў Д. Ю., Лосік І. А., Цыгановіч У. У. і іншыя грамадзяне з чэрвеня 2019 года планавалі арганізацыю масавых беспарадкаў на тэрыторыі краіны ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў Прэзідэнта ў 2020 годзе.

Для дасягнення сваіх мэт яны выкарыстоўвалі сучасныя паліттэхналогіі, каб стварыць у насельніцтва недавер і негатыўнае стаўленне да прадстаўнікоў дзяржаўных органаў.

Абвінавачаныя з канца 2019 года сталі распаўсюджваць у сетцы Інтэрнэт публічныя заклікі да падрыхтоўкі, арганізацыі і актыўнага ўдзелу ў незаконных масавых мерапрыемствах пры падрыхтоўцы і правядзенні электаральнай кампаніі ў 2020 годзе.

Ціханоўскі С. Л. і іншыя асобы з яго акружэння на розных падставах, у тым ліку для збору подпісаў за вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты Беларусі, праводзілі незаконныя масавыя мерапрыемствы ў Мінску, Брэсце, Гродне, Магілёве, Салігорску, Мёрах і іншых гарадах краіны. Падчас такіх мерапрыемстваў яны распаўсюджвалі інфармацыю, накіраваную на абвастрэнне палітычнай і сацыяльнай напружанасці ў краіне, узбуджэнне іншай сацыяльнай варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці. Пасля размяшчалі відэаздымкі з мерапрыемстваў у інтэрнэце, уключаючы Youtube і Telegram-каналы, сацыяльныя сеткі.

Акрамя таго, Ціханоўскі С. Л. 27 мая 2020 года ў Магілёве з мэтай перашкодзіць рабоце Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў падчас відэатрансляцыі пры ўдзеле Сакава А. М. і Папова Д. Ю. выказаў як заклік да дзеяння пагрозы на адрас старшыні камісіі Лідзіі Ярмошынай: аб правядзенні незаконных групавых масавых мерапрыемстваў у яе дома; парушэнні недатыкальнасці і ўварванні ў яе жыллё; іншым абмежаванні яе законных правоў.

У час вобыску ў садовым доміку ў Гомельскім раёне, які Ціханоўскі С. Л. выкарыстоўваў для работы і жыхарства, выяўлены і канфіскаваны $900 300, пнеўматычны пісталет і пнеўматычны аўтамат. Характар упакоўкі значнай часткі грошай, серыйны нумар банкнот у пачках паказвалі на іх аднамомантавае атрыманне ў банкаўскіх або іншых фінансавых арганізацыях.

У выніку супрацьпраўных дзеянняў Ціханоўскага С. Л. і яго саўдзельнікаў дзяржаве нанесены ўрон на суму больш чым Br3 млн. На маёмасць абвінавачаных накладзены арышт на суму звыш Br2 млн.

Пасля вывучэння крымінальнай справы ў Генпракуратуры прыйшлі да высновы, што абвінавачанне Ціханоўскаму С. Л., Сакаву А. М., Папову Д. Ю., Лосіку І. А., Цыгановічу У. У. і Статкевічу М. В. прад'яўлена абгрунтавана і пацверджана сабранымі доказамі; абраная да абвінавачаных мера стрымання ў выглядзе заключэння пад варту ўжыта абгрунтавана, падстаў для яе змены або адмены няма; абставіны крымінальнай справы даследаваны поўна, усебакова і аб'ектыўна; парушэнняў крымінальна-працэсуальнага закона ў ходзе папярэдняга расследавання не дапушчана.

Генеральная пракуратура ў рамках крымінальнай справы прад'явіла да абвінавачаных іск аб кампенсацыі шкоды, прычыненай іх дзеяннямі.

**БелТА.**

А не шкодзь!

# АКТЫЎНЫ НЕРАСТ

## За тры тыдні ў браканьераў канфіскавалі 1,3 тысячы забароненых прылад

**У нераставы перыяд актывізуецца, без перабольшання, усё: і сама рыба, і браканьеры, якія прагнуць злавіць сваю здабычу, і дзяржінспектары — не дапусціць такіх «рыбакоў» на вадаёмы. За апошнія тры тыдні, калі нераставая забарона пачала дзейнічаць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, інспектары выявілі 171 парушэнне ў сферы рыбалоўства, паведамляе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету.**

У браканьераў канфіскавалі 1057 сетак агульнай даўжынёй амаль 49 кіламетраў і 313 іншых забароненых прылад лоўлі (пад'ёмнікі, экраны, нераты, астрогі і інш.)

Адказнасць за браканьерства ў нераст вырастае трохразова — менавіта настолькі павялічваюцца таксы пры разліку прычыненай прыродзе шкоды за кожную рыбіну, вылаўленую незаконным спосабам або прыладай. Напрыклад, калі ў звычайны час злоўлены сеткамі карась сярэбраны абыдзецца парушальніку ў адну базавую велічыню, то ў перыяд нераставай забароны — ужо ў тры базавыя. Калі шкода ад усяго ўлову дасягае 100 базавых велічынь, браканьеру пагражае крымінальная адказнасць і буйны штраф.

Так, на Зэльвенскім вадасховішчы супрацоўнікі Ваўкавыскай інспекцыі затрымалі мясцовага жыхара, які сеткай вылавіў 44 кілаграмы рыбы, якая нерастуе. Ва ўлове аказалася 50 адборных карасёў, два ляшчы, тры акуні і белы амур. З улікам павышаных такс шкода ад такой рыбалкі склала 186 базавых велічынь (5,4 тысячы рублёў). Пазней у доме жыхара Зэльвы знайшлі яшчэ шэсць сетак і порах. Дарэчы, чатыры гады таму мужчыну прыцягвалі за незаконнае паляванне.

А на возеры Чэчаль у Веткаўскім раёне інспектары затрымалі гамяльчаніна. Рыбак-нелегал перагарадзіў вадаём адразу сямю сеткамі агульнай даўжынёй амаль паўкіламетра і злавіў 50 кілаграмаў рыбы, у асноўным ляшча. Незаконны ўлоў, здабыты падчас нерасту, ацанілі ў 510 базавых велічынь (14,8 тысячы рублёў). У доме затрыманага таксама выявілі забароненыя прылады лоўлі рыбы — тры астрогі і пад'ёмнік з сеткі.

У дачыненні да абодвух браканьераў ужо распачаты крымінальныя справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА 8 ИЮНЯ 2021 ГОДА

| **Лот № 1*.** Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-141029. Наименование: гараж; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 440100000013078. Общая площадь: 19,2 кв. м. Составные части и принадлежности: погреб. Стены кирпичные, фундамент, полы – бетонные; перекрытие железобетонное; крыша рулонная; проемы дверные – металлические ворота; электроснабжение – центральная система | | |
|---|---|---|
| **Местонахождение:** Гродненская область, г. Гродно, ул. Суворова, 141/2922, блок 29 | **Начальная цена** | **9 288,00 руб.** |
| | Сумма задатка | 920,00 руб. |

** – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Возможность осмотра имущества до его приобретения отсутствует.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. – **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Аукцион состоится 8 июня 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 12 мая по 2 июня 2021 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056.

Адреса сайтов: **grodno.gov.by, gcn.by, gki.gov.by**



# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ИП Боровой Валерий Анатольевич** (УНП 190072399) в лице антикризисного управляющего ИП Семенова Дмитрия Юрьевича, тел. +375 (29) 273-56-07.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **08 июня 2021 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

Предмет торгов –

**3/8 ДОЛИ В ИЗОЛИРОВАННОМ ПОМЕЩЕНИИ, кад. № 500/D-156269, пл. – 43,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Волгоградская, д. 5, кв. 17.**

Начальная цена предмета торгов – 30 688,91 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 08.05.2021 г. с 09.00 по 07.06.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, услуги аукциониста в течение 5 рабочих дней со дня их проведения. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.



УНН 190431606

**УП «Белконфискат»**
**объявляет о проведении электронных торгов 28.05.2021 г. по продаже имущества ЧТПУП «Газремонт»**

**автомобиль Ford Transit, 2010 г. в.,**

**начальной стоимостью 8 300 рублей.**

На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах.
Справки по тел. **8 (017) 3639489.**



**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Петриковского филиала Гомельского областного потребительского общества (продавец)**
информирует о том, что в извещении о проведении 9 июня 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, опубликованном в газете «Звязда» от 05.05.2021 г.,
**время приема заявлений для участия в аукционе читать как: 07.06.2021 г. в 17.00.**
Контактные телефоны: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by
УНП 490870026

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Все просто»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Все просто» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Все просто» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является ООО «Хэппи Нейшен», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 3, УНП 190871314, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 27 сентября 2007 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190871314.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является ЗАО «МТБанк», 220007, г. Минск, ул. Толстого, 10, УНП 100394906.

**3. Участники Рекламной игры.**

К участию в Рекламной игре приглашаются физические лица, держатели банковских платежных карточек платежной системы Mastercard Worldwide, эмитированных ЗАО «МТБанк», достигшие возраста 18 лет: граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**4. Наименование Рекламной игры:** «Все просто».

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 8 мая 2021 года.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 24 сентября 2021 года.

**8. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов физическими лицами с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard Worldwide, эмитированных ЗАО «МТБанк» (далее – «Карточка»).

**8.1.** При использовании в Правилах термин «**карточка**» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица в размере **228 293,57 (двести двадцать восемь тысяч двести девяноста три) белорусских рубля 57 копеек.** Призовой фонд рекламной игры включает следующие призы:

**Таблица № 1. Призовой фонд рекламной игры.**

| № | Наименование | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за ед., бел. рублей | Всего, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз 1000 белорусских рублей | Приз | 70 | 1 000,00 | 70 000,00 |
| | Денежные средства | | | 127,01 | 8 890,70 |
| 2 | Денежный приз 130 000 белорусских рублей | Главный приз | 1 | 130 000,00 | 130 000,00 |
| | Денежные средства | | | 19 402,87 | 19 402,87 |
| **ИТОГО** | | | | | **228 293,57** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

**10.1.** Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 08:00:00 08.05.2021 по 29:59:59 31.07.2021 включительно (далее – «Период участия»):

**10.1.1.** Являться и/или стать держателем Карточки;

**10.1.2.** Зарегистрироваться на Интернет-сайте http://mtbank.by/promotions_live/more-money/ (далее – «Сайт»), заполнив регистрационную форму, содержащую следующие данные:

- фамилию (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно) держателя Карточки;

- номер телефона держателя Карточки в формате «+375XXXXXXXXX» (обязательно);

- адрес электронной почты Участника (обязательно).

Также Участнику необходимо подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, а также подтвердить согласие на предоставление Заинтересованным лицом Организатору своих персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, на Сайте, путем проставления соответствующей галочки при заполнении регистрационной формы;

**10.1.3.** С соблюдением правил пользования Карточкой совершить одну или несколько безналичных операций, каждая на сумму не менее 35,00 (тридцати пяти) белорусских рублей, по оплате товаров/работ/услуг на территории Республики Беларусь, за исключением операций, указанных в п. 10.6 Правил.

**10.2.** Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное число раз, совершая новые безналичные операции согласно п. 10.1.3 настоящих Правил.

**10.3.** Каждая уникальная безналичная операция на сумму не менее 35,00 (тридцати пяти) белорусских рублей, совершенная в соответствии с настоящими Правилами, участвует в розыгрыше Призов согласно порядку проведения розыгрышей (Таблица № 2 п. 11.1 настоящих Правил).

**10.4.** Участнику присваивается один Номер участника для розыгрыша Приза за каждые 35,00 (тридцать пять) белорусских рублей безналичной операции, соответствующей п. 10.1.3 настоящих Правил, а также совершенной с 08:00:00 08.05.2021 по 29:59:59 31.07.2021 согласно периодам участия, указанным в Таблице № 2 п. 11.1 настоящих Правил. То есть Участнику, совершившему безналичную операцию на сумму 70,00 (семьдесят) белорусских рублей, будет присвоено 2 (два) Номера Участника для розыгрыша Призов.

**10.4.1.** Участнику присваивается один Номер участника для розыгрыша Главного приза за каждые 10 (десять) Номеров участника для розыгрыша Призов, присвоенных Участнику за весь Период участия в Рекламной игре.

**10.5.** Например, Участник совершил 10 (десять) безналичных операций на сумму 35,00 (тридцать пять) белорусских рублей каждая, в рамках периодов, указанных в Таблице № 2 п. 11.1 настоящих Правил. Участник получает 10 (десять) Номеров участника для розыгрыша Приза, а также 1 (один) Номер участника для розыгрыша Главного приза.

**10.6.** Не являются основанием для участия в Рекламной игре:

- безналичные операции, совершенные до 08:00:00 08.05.2021 или после 23.59.59 31.07.2021;

- безналичные операции, которые совершены через платежный ресурс e-pay.by;

- операции безналичной оплаты, которые совершены в устройствах самообслуживания, таких как банкоматы, инфокиоски, платежные терминалы самообслуживания;

- безналичные операции, связанные с азартными играми (включая операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через интернет);

- операции безналичной оплаты, которые совершены через СДБО «Интернет Банк», «Мобильный банк»;

- операции безналичной оплаты, которые совершены в устройствах банков, установленных в РУП «Белпочта»;

- безналичные операции, связанные с оплатой телекоммуникационных услуг;

- операции перевода между банковскими картами с использованием сервиса «Denegram» либо аналогичных сервисов, предоставляемых другими банками;

- операции, по которым денежные средства, перечисленные в рамках безналичной операции в период с 08:00:00 часов 08.05.2021 года по 23:59:59 часов 31.07.2021 года, были возвращены организациями торговли и сервиса Участнику Рекламной игры.

**10.7.** Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных безналичных операций Участниками Рекламной игры, в том числе обратиться к Заинтересованному лицу в целях проверки безналичных операций, участвующих в Рекламной игре.

**11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрышей призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры:**

Розыгрыши призов проходят по адресу: Республика Беларусь, город Минск, ул. Толстого, 10 (Бизнес-центр «Титул») в соответствии с датами и временем, указанными в Таблице 2.

Розыгрыши призов проводятся открыто, с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

**11.1. Розыгрыши призов проводятся согласно следующему графику:**

**Таблица № 2. Розыгрыши Призов:**

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Период регистрации Участника на Сайте | Период совершения безналичной операции | Приз |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 20.05.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 16.05.2021 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 16.05.2021 | Приз – 7 шт. |
| 2 | 27.05.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 23.05.2021 | с 00:00:00 17.05.2021 по 23:59:59 23.05.2021 | Приз – 7 шт. |
| 3 | 03.06.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 30.05.2021 | с 00:00:00 24.05.2021 по 23:59:59 30.05.2021 | Приз – 7 шт. |
| 4 | 10.06.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 06.06.2021 | с 00:00:00 31.05.2021 по 23:59:59 06.06.2021 | Приз – 7 шт. |
| 5 | 17.06.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 13.06.2021 | с 00:00:00 07.06.2021 по 23:59:59 13.06.2021 | Приз – 7 шт. |
| 6 | 24.06.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 20.06.2021 | с 00:00:00 14.06.2021 по 23:59:59 20.06.2021 | Приз – 7 шт. |
| 7 | 01.07.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 27.06.2021 | с 00:00:00 21.06.2021 по 23:59:59 27.06.2021 | Приз – 7 шт. |
| 8 | 08.07.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 04.07.2021 | с 00:00:00 28.06.2021 по 23:59:59 04.07.2021 | Приз – 7 шт. |
| 9 | 15.07.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 11.07.2021 | с 00:00:00 05.07.2021 по 23:59:59 11.07.2021 | Приз – 7 шт. |
| 10 | 22.07.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 18.07.2021 | с 00:00:00 12.07.2021 по 23:59:59 18.07.2021 | Приз – 7 шт. |
| 11 | 05.08.2021 14:00 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 31.07.2021 | с 08:00:00 08.05.2021 по 23:59:59 31.07.2021 | Главный приз – 1 шт. |

**11.2.** Для осуществления каждого розыгрыша Призов Организатор формирует Список, в котором за каждые 35,00 (тридцать пять) белорусских рублей всех безналичных операций, соответствующих Правилам, присваивает Номера Участника для розыгрыша Призов» в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения безналичной операции. В случае совпадения у нескольких Участников даты и времени совершения безналичных операций Номера Участника присваиваются по фамилии, имени и отчеству участника по алфавиту.

Все Номера Участников для каждого розыгрыша Призов имеют одинаковую разрядность.

Для осуществления розыгрыша Главного приза Организатор формирует Список, в котором за каждые 10 (десять) Номеров участника, присвоенных для розыгрышей Призов, присваивает Номера Участника для розыгрыша Главного приза. Номера Участника для розыгрыша Главного приза присваиваются по фамилии, имени и отчеству участников по алфавиту.

Все Номера Участников для розыгрыша Главного приза имеют одинаковую разрядность.

**11.2.1.** Каждый Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: Номер Участника, фамилию, имя, отчество Участника, адрес электронной почты (e-mail), номер телефона Участника, дату и время совершения безналичной операции.

**11.3.** Для проведения каждого розыгрыша Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышных Номеров Участников происходит путем его формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**11.3.1.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера Участника Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Организатор извлекает из лототрона один шар. Цифра вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**11.3.2.** После этого в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, который определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров Участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера Участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения.

**11.3.3.** Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров Участников в Списке. Таким образом, формируются все выигрышные Номера Участников – Победителей Призов и Главного приза.

**11.4.** При проведении каждого розыгрыша Организатор дополнительно определяет по одному резервному победителю для каждого Приза и Главного приза. Резервным победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер Участника, принадлежащий другому Участнику.

**11.5.** Результат каждого Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии.

**12. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша, порядок получения выигрыша.**

**12.1.** Организатор уведомляет Победителей о выигрыше по телефону в течение двух рабочих дней после розыгрыша, а также дополнительно может извещать Победителей письмом по электронной почте не позднее 20.08.2021.

**12.2.** Для получения приза Победитель должен предоставить информацию Организатору по 03.09.2021 включительно, любым из указанных способов:

1) письмом по почте по адресу: ООО «Хэппи Нейшен», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 3;

2) письмом на электронный почтовый ящик Организатора: igra@hn-project.com;

3) лично по адресу Организатора: ООО «Хэппи Нейшен», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18б, 2-й этаж, пом. 3 в рабочие дни с 10:00 до 17:00.

а именно:

а) копию страницы 25, а также страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;

б) копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

в) заявление/выписку об открытии банковского счета в ЗАО «МТБанк», на который будет перечисляться сумма приза.

Суммы призов (за вычетом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза) передаются Победителям путем зачисления на банковские счета Победителей, открытые в ЗАО «МТБанк», не позднее 07.09.2021.

С общими условиями банковского обслуживания физических лиц в ЗАО «МТБанк», можно ознакомиться на Интернет-сайте mtbank.by.

**12.3.** Приз не вручается основному Победителю, а вручается (перечисляется) резервному победителю в случае если основной Победитель:

**12.3.1.** отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

**12.3.2.** нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленном Правилами;

**12.3.3.** не выходит на связь с Организатором.

**12.4.** Резервные Победители, которым перешло право на получение приза, уведомляются об этом не позднее 08.09.2021, по номерам телефонов Участников.

Резервные Победители должны выполнить действия, перечисленные в пункте 12.2 Правил, не позднее 22.09.2021. Призы будут зачислены резервным Победителям на банковские счета, открытые в ЗАО «МТБанк», по 24.09.2021 включительно.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Призы остаются в распоряжении Организатора.

**12.5.** Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

**12.6.** Призы не подлежат замене. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**12.7.** При получении всех призов победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи призов из денежной части призов (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

**13.1.** Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Антипович Татьяна Игоревна – заместитель начальника управления маркетинга ЗАО «МТБанк»;

2. Довжик Светлана Марьяновна – главный специалист управления маркетинга ЗАО «МТБанк»;

3. Шорр Полина Андреевна – специалист по работе с клиентами ООО «Хэппи Нейшен»;

4. Брель Алеся Алексеевна – специалист по работе с клиентами ООО «Хэппи Нейшен»;

5. Морозова Ольга Анатольевна – главный бухгалтер ООО «Хэппи Нейшен».

**14.** Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.

**14.1.** Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

**14.2.** Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 22.09.2021 включительно.

**14.3.** Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте mtbank.by, а также по телефонам горячей линии: + 375 17 229 99 99, +375 29 509 99 99, +375 44 509 99 99, +375 25 509 99 99 с 9:00 до 18:00 без выходных.

**15.** Прочие условия.

**15.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**15.2.** Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются представить все необходимые документы для получения призов.

**15.3.** Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления рекламных материалов для размещения их в средствах массовой информации и на интернет-ресурсах не требуя за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, образы (изображения), аудио и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Заинтересованным лицом. Все права, в том числе исключительные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору и Заинтересованному лицу. Участники выражают согласие на сбор и обработку их персональных данных для целей Рекламной игры.

**15.4.** Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при его использовании Участником (например, плохое соединение с провайдером и т. д.), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовой службы (сроки доставки писем и т. д.)

**15.5.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

**15.6.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

**15.7.** Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, 2-й этаж, пом. 3.

***Свидетельство № 3981 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 4 мая 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.***




# КВЕТКІ ДЛЯ ЦЕШЧЫ

Зручна цяпер — усе з тэлефонамі: захочаш да некага ў госці зайсці, можаш пазваніць — спытаць, ці дома, ці можна... А пакуль ты будзеш збірацца, гаспадыня, глядзіш, пачастунак прыдумае.

Але ж робяць гэтак не ўсе (у прыватнасці, госці): шмат хто па-ранейшаму забягае-заходзіць без званка. І тым самым...

Летась перад нашым жаночым святам да маёй прыяцелькі зяць заехаў — павіншаваў, уручыў букет любімых цюльпанаў. «Пяць штук, — хвалілася потым Іванаўна. — Ды такіх жа высокіх, прыгожых! У вазу на стол паставіла, — аж у хаце святлей!.. Шкада хіба — колер не мой: ружовыя кветкі, а больш люблю чырвоныя, жоўтыя...». — «Заўтра сын такія прывязе», — абнадзеіла я жанчыну. І, як аказалася, марна, бо сын, пазваніўшы зранку, сказаў, што дужа заняты, што заедзе толькі пад вечар... Папрасіў яшчэ, каб маці для яго жонкі букет купіла, бо сам, маўляў, можа не паспець.

Іванаўна для сваіх дзяцей ну ўсё чыста на свеце гатовая зрабіць, а ўжо кветкі купіць — з дарагою душой! Прыйшла на рынак, убачыла, што іх там — не абабрацца... Не паспела разгледзецца-прыцаніцца, — знаёмая гандлярка як з-пад зямлі: свае цюльпаны расхвальвае, за размовай з жоўтых ды чырвоных букет ёй складае... Няёмка было не купіць.

А потым, дома, не ўбачыць, што «праляцела» з пакупкай, што яе цюльпаны і драбнейшыя, і падвялыя, і лісткі з жаўцізной... Прывязе сын такія, павіншуе нявестку ды яшчэ пакрыўдзіць. Тая падумае, што ён грошай пашкадаваў.

...Выйсце знайшлося, як тая сякера пад лаўкай: зяцеў ружовы букет перадаць маладзіцы, а свой — пакінуць сабе.

І ўсё, як выглядала, добра было б, калі б той зяць не заехаў зноў — прычым неспадзеўкі, калі б не згледзеў на стале букет і не спытаў: «Што гэта з кветкамі зрабілася?» — Цешча ў адказ: «Дык даўно ж стаяць...» — «Разумею, што даўно, — чухае патыліцу зяць, — што за тыдзень падвялі. — Але ж каб колер змянілі...» — «Дык гэта ж не твой букет, — далей хітрue цешча. — Твой я на дачу завезла. А гэты мне сын падарыў».

...Вось такая непрыемнасць адбылася ў жанчыны летась.

Сёлета на жаночае свята зяць да яе з падарункам прыязджаў. «А букет, — сказаў, — самі купіце». І грошы на стол... Іванаўна, вядома ж, не ўзяла. Схадзіла потым на рынак, за свае, за кроўныя — «каб у хаце стала святлей» — купіла жоўтых, чырвоных, аранжавых цюльпанаў. Адзін букет паставіла на стале ў вітальні, другі — у зале. І ўсім, хто потым заходзіў, расказвала, што першыя кветкі ёй сын падарыў, а другія — зяць. «Ведае, бач, цешчыны любімыя».

**Таццяна Новік,**

*г. Клецк.*

# АБМЕН ЧАМУСЬЦІ НЕ АДБЫЎСЯ

Пасля вучобы ў інстытуце мяне, як іншых, размеркавалі на работу. Прыехала ў адно з беларускіх мястэчак, уладкавалася на кватэру. Гаспадыня адвяла мне асобны пакойчык, дазволіла карыстацца сваім керагазам (былі такі «папярэднік» у электра- і газавых пліт)... Я тут жа спытала, дзе ў іх купляюць мяса? Гаспадыня ў адказ: «Ды ў цэнтры мястэчка... Там крамка ёсць. Называецца «Рогі-капыты»».

Рогі дык рогі, думаю, ды кірую ў цэнтр. Там, па «наводцы» нейкай жанчыны, з цяжкасцю (бо шыльды ніякай) знаходжу невялікі ларок. Адчыняю дзверы, займаю чаргу да прылаўка. За ім, бачу, стол і вагі, побач — вялікая калодка і мужчына з сякерай. Па «ўказанні» пакупніка ён адсякае ад тушы досыць вялікія кавалкі мяса, узважвае, прадае... Чарга ідзе досыць хутка. «Мне два кілаграмы, — загадвае жанчына, што стаіць перада мной. — Вось тут (паказвае) адсячы». Прадавец выконвае «загад»... «Тут косць вялікая, — круціць носам жанчына. — Давай з іншага боку адсячы».

Мужчына ўзмахвае сякерай яшчэ раз і...

Адкуль толькі цярпенне: яшчэ мо разы са тры ён слухае, што зразумеў няправільна, што сячы трэба было не там і не так... «Усё, з мяне хопіць. На сякеру — сячы сама, — кажа нарэшце, здымаючы фартух. — А я пайду адсюль».

І сапраўды сыходзіць?!

Вяртаецца хвілін праз пяць, прадае той пакупніцы апошні з адсечаных кавалкаў. «Што вам?» — пытаецца ў мяне. «Трыста грамаў, — кажу (бо халадзільніка на кватэры няма) і спінай адчуваю, як чарга свідруе мяне вачыма...

Па-ранейшаму ні на што не зважае толькі прадавец. Ужо нажом ён адразае мне кавалачак мяса.

...Потым гаспадыня скажа мне, што крамка «Рогі-капыты» носіць сваю назву нездарма, што найчасцей там прадаюцца амаль голыя косці (супавыя наборы), а мяса бывае гады ў рады. Таму і бяруць яго людзі памногу... А я, маўляў, правароніла.

...Гэта было маё першае знаёмства з мястэчковым гандлем. У памяці і другое, калі ў «Прамтаварах» «выкінулі ў продаж» імпартны абутак.

Што здзівіла, ніякіх тэлефонаў тады не было, а чарга сабралася — проста мігам. Людзі ў ёй, бачу, стаяць і ўсе чамусьці з кашамі, поўнымі яек.

Растлумачылі: продаж — на так званыя нарыхтоўкі, гэта значыць, што за туфлі, апроч грошай, трэба яшчэ і сельгаспрадукцыю здаць.

У мяне, на жаль, нічога падобнага не было, таму, цяжанька ўздыхнуўшы, я рушыла на выхад і там жа спынілася, бо ў краму ўляцеў знаёмы хлопец. Ён таксама быў з прыезджых-маладых, але ж доктар (ветэрынар), а значыць, ВЕЛІЧЫНЯ (!). Чарга перад ім адразу расступілася — прапусціла да прылаўка.

— Мне, калі ласка, туфлі. 43-і памер, — просіць ён прадавачку.

— Гэта на яйкі, — гаворыць тая (па ўсім відаць: доктара пакуль не ведае).

— Што ёсць, тое ёсць... І не сумнявайцеся, — пасміхаецца хлопец. — А туфлі мне б на ногі...

— Усім на ногі! — перабівае жанчына. — І ўсе мне спачатку яйкі, а я потым — туфлі!

...Што далей было, шчыра кажучы, не ведаю, бо зайшлася ад рогату і выскачыла на вуліцу. Без нявага абутку.

А магла б, як той казаў, падмітусіцца: заняць чаргу, купіць у некага яек, а потым, можа, і туфлі.

...Ветэрынар, дарэчы, таксама хадзіў у старых: не адбылося, відаць, абмену.

**Зоя Наваенка,**

*г. п. Падсвілле,*
*Глыбоцкі раён.*

# КОНЮХ? ЁН МОЖА...

Не ведаю, як у іншых вёсках было, а ў нашай — дзяцей выхоўвалі ў строгасці: змалку прывучалі да працы, да парадку. Крый бог было слова брыдкае сказаць, некага падмануць ці штосьць украсці...

Але ж гэта ўсё пра малых, а Васіль тады старшакласнікам быў, прычым закаханым. І нават узаемна!

Здавалася б, шчаслівы хлапец — можна яму пазайздросціць. З аднаго боку — так, а з іншага...

Жыла яго выбранніца далекавата, у суседняй вёсцы. А каб даляцець туды, у хлопца — ні крылаў, ні ровара.

Сябры, праўда, падказалі, што можна канём, калі самагонкі ці бражкі наліць калгаснаму конюху. «Добра было б, — памарыў хлапец, — але дзе ж іх браць? Купіць няма за што. Дома пашукаць? Ды наўрад ці ёсць?»

Каб пра тое даведацца, выбраў ён час, калі маці ў гародзе была, і пытаецца:

— Мама, а ці ёсць у нас гарэлка?

— Нашто табе? — не разумее тая, бо спіртнога яе сын яшчэ не каштаваў... Ды і зараз не пакаштуе, бо ў хаце ані кроплі няма: днямі толькі брагу завялі...

Заўважыў Васіль вось гэтую разгубленасць і далей за сваё. Маўляў, у вёсцы, дзе яго дзяўчына жыве, учора міліцыя лютавала, падворкі трэсла ў пошуках самагону... Па іншых вёсках таксама ехаць збіраецца. Рэйд...

У маці ад гэтай навіны аж рукі затрэсліся: гайда разам з сынам брагу пераносіць, у іншае месца хаваць (не выліваць жа прадукт?!)...

Яны хуценька ўсё зрабілі. У жанчыны і камень з душы. Пахваліла сына за пільнасць. Праўда, і пад вечар, і назаўтра трохі падзівілася, што неяк не чуваць нідзе ні таго лютавання, ні рэйду...

А дзён праз колькі стала гарэлку гнаць і ўбачыла, што брагі толькі на дне...

Далей, як і варта было чакаць, пачаўся «допыт», чыстасардэчнае прызнанне і нават пакаранне. Перапала сыну ад бацькі.

Аднак канец у гэтай гісторыі досыць добры, бо, вярнуўшыся з войска, хлопец ажаніўся з той самай дзяўчынай. А галоўнае, што спіртнога па-ранейшаму ў рот не бярэ. Кажа, што яго «норму» конюх выпіў — тую самую брагу...

**Ларыса Купрыянчук,**

*в. Хатоўня,*
*Рагачоўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# ПЕРАКАДЗІРОЎКА ПАМЯЦІ

## Калі мы яе не захаваем, яе нам проста заменяць

9 МАЯ для мяне асабіста заўсёды напоўнена святочнасцю і ўрачыстасцю. Не толькі таму, што парад, фільмы па тэлебачанні, песні ваенных гадоў... Тут яшчэ ёсць асабісты момант. З дзяцінства памятаю, як мама расказвала пра гэты дзень у 1945 годзе. Яны якраз садзілі бульбу на сваім вясковым агародзе. І раптам хтосьці гукнуў з вуліцы: «Вайна скончылася!» І яны пакідалі кашы і сталі плакаць і абдымацца... Вельмі яскрава ўяўляліся бабулін агарод у Кукшавічах, і плецены з лазы кашы, што радасна ляцяць уверх, пад самыя аблокі, рассыпаючы салютам бульбу, і жанчыны з худзюшчымі, як на першых пасляваенных фота ў сямейным альбоме, дзецьмі, што плачуць і абдымаюцца... А яшчэ штогод у другой палове 1980-х для мясцовых ветэранаў і для ўсіх астатніх жыхароў ладзілася свята ў цэнтры саўгаса кіламетраў за восем ад нашай вёскі. Па вуліцы, якая патанала ў водары чаромхі, ішлі, нязграбна трымаючы ў спрацаваных руках яркія чырвоныя цюльпаны, нешматлікія ветэраны — звычайныя вясковыя, немаладыя ўжо, дзядзькі, якіх так непрывычна было бачыць у касцюмах, у новых кепках, што надзяваліся, пэўна, толькі ў гэты дзень ды, можа, яшчэ да сваяка на вяселле. Усё гэта было незвычайна, кранальна, хораша, і мы, падлеткі, таксама несліся прыбраным натоўпам «пад магазін», а там ужо чакаў саўгасны насаты аўтобус, які вёз нас усіх у Скірмантава, дзе каля помніка спаленым жыхарам вёскі былі і мітынг, і ўскладанне кветак, і песні, і віншаванні...

АЛЕ ёсць адзін успамін, які выбіваецца з гэтай прыгожай урачыстай карціны. Было гэта ў пачатку 1990-х. Саўгас, і без таго ніколі не перадавы, у той час ужо ледзьве дыхаў. Дый да вайны і Перамогі ў той час стаўленне было невядома якое (што казаць, калі на журфаку нам замест лекцый па паліталогіі чыталі кнігу Суворава «Ледакол» — у ёй аўтар прапаноўваў версію, што Другую сусветную развязаў Савецкі Саюз, каб пасля пераможным маршам прайсці па ўсім свеце і ўстанавіць дыктаруру пралетарыяту). Карацей, я не ведаю дакладна, якія аб'ектыўныя ці суб'ектыўныя прычыны былі дзеля таго, што ў той год 9 Мая за нашымі ветэранамі ніхто не прыехаў. Але і сёння я памятаю, як яны, не дачакаўшыся аўтобуса, ішлі назад ад магазіна па нашай доўгай вясковай вуліцы — нібы саромеючыся, трымаючы ў руках ужо падвялыя за час чакання чырвоныя цюльпаны. Ці была на іх тварах крыўда? Не. Хутчэй, збянтэжанасць і неразуменне. Але мне і тады было, і цяпер ад гэтага не лягчэй. Тых дзядзькоў, маіх аднавяскоўцаў, што ваявалі, ужо даўно няма на гэтым свеце. А жаль (я не ведаю, як гэта ў літаратурнай мове, у нас дома кажуць: «Жаль агарнуў» — і гэта менавіта тое пачуццё) і сорам ад таго даўняга і адзінкавага выпадку не праходзяць і сёння. І я нядаўна раптам падумала: а вось гэтыя жаль і сорам — апаспродкаваныя, агульныя, не за сябе асабіста — гэта ж і ёсць мая ўласная прышчэпка ад забыцця і абыякавасці...

А яшчэ я думаю пра тое, што для цяперашняга пакалення, якое вырасла ўслед за намі, па сутнасці, нашых дзяцей, падобнае немагчыма ў прынцыпе. Вайна і Перамога для іх — ужо не асабістыя тэмы. Амаль няма ветэранаў, а тыя, што жывыя, для большасці ўжо не родныя дзядуля і бабуля, а проста чужыя старыя людзі, якія нешта расказваюць пра далёкую вайну. Свае ж прадзеды і прапрадзеды, што ваявалі, — гэта ўсяго толькі маўклівыя фота ў сямейным альбоме. Эксперты гавораць, што гэта натуральны працэс у любым грамадстве — чым маладзейшыя людзі, тым далей становіцца падзеі, тым больш вымываюцца з памяці дэталі і падрабязнасці. А калі гэта адбываецца — пачынаюць працаваць паліттэхналогіі. І тады мы атрымліваем тое, што называецца перакадзіраваннем памяці, якое пачынаецца з замяшчэння гэтай памяці. І зусім незаўважна тое, што яшчэ некалькі гадоў таму лічылася непрымальным, набліжаецца да катэгорыі «норма». Робіцца гэта пакрысе — у форме дыскусій, абмеркаванняў. І ўжо здраднікі становяцца рупліўцамі незалежнасці, а акупанты — вызваліцелямі ад яшчэ горшага, чым яны самі...

Я нездарма згадала пачатак 1990-х. Тады ўжо спрабавалі перакадзіраваць нашу памяць. Але выратавала нас усіх менавіта памяць асабістая, бо няма ў Беларусі сям'і, якую б не закранула вайна. Сёння ж праблема, напэўна, у тым, што пакаленне 45-50-гадовых — па сутнасці, апошняе, якому гэтую сямейную памяць перадалі з першых вуснаў непасрэдныя сведкі і ўдзельнікі той вайны — не паклапаціліся ці не палічылі патрэбным перадаць яе сваім дзецям. Для якіх прадзед-ветэран — усяго толькі фота ў сямейным альбоме, закінутым дзесьці на антрэсолях. І гэтыя самыя дзеці — дарослыя, у тым самым узросце, калі іх прадзеды ваявалі, спрабуюць (выбачайце) памачыцца на Вечны агонь і здымаюць гэта на тэлефон. І не расказвайце мне, што маладзёны проста былі п'яныя. Што ў цвярозага наўме... ну, вы самі ведаеце... Тая самая перакадзіроўка ў дзеянні.

ЦІ ёсць паратунак? Ці не спазніліся ўжо канчаткова і беспаваротна? Хочацца верыць, што не. На выхадных мы збяромся ў роднай хаце ўсёй вялікай сям'ёй, і я абавязкова прывязу і пакажу нашай малечы, што сёлета пойдзе ў школу, фота іх прабабулі, якой на здымку таксама шэсць гадоў. І яны, напэўна, здзівяцца і спытаюць, чаму ў прабабулі, якую яны ведалі і добра памятаюць, у дзяцінстве былі такія худзюшчыя, як запалкі, ногі. І я раскажу ім, што прабабуля была заўжды галодная, а есці не было чаго, і мама карміла яе з братам пышкамі з гнілой перамёрзлай бульбы. А калі яны спытаюць: «Чаму?», я скажу ім: «Бо была вайна». А на Радаўніцу мы паедзем у Кукшавічы на магілкі і, праязджаючы міма хаты, у якой ужо жывуць чужыя людзі, я раскажу ім, як на гэтым агародзе 9 мая 1945 года іхняя прабабуля радасна падкінула плецены з лазы кош пад самыя аблокі, і з яго салютам пасыпалася бульба.

Я чамусьці веру, што менавіта гэтае веданне ўратуе іх ад хлусні і бяспамяцтва.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95** |

**Предмет аукциона:** магазин (здание специализированное розничной торговли), общ. пл. 319,1 кв. м, инв. номер 610/С-27467. **Составные части и принадлежности:** двухэтажное кирпичное здание магазина (А1-2/к), пристройка (1), дорожки (а1), декоративный водопад (а2). **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0621 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 06.07.2045 для строительства и облуживания магазина. **Адрес:** Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 109

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 234 797,17 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию и проведения аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

**Дополнительная информация:** покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан возместить продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона, а также на публикацию извещения о проведении аукциона

Продавец или организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 03.12.2020

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.05.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.05.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЗПИ» (Продавец)

**Лот № 1, состав:** 1. Вагонные весы, инв. № 610/С-28301, 10 кв. м. 2. Контейнерная площадка для козлового крана, инв. № 610/С-62942, 1126,2 кв. м. 3. Железнодорожный путь с инв. № 610/С-62941, 1180,2 кв. м. Адрес: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 57А.

**Начальная цена с НДС** – 570 005,18 руб. **Задаток** – 57 000,52 руб. **Штраф** – 50 000,00 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 620850100014000877, 2,9450 га. Право аренды по 14.12.2070.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **09.06.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **07.06.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЗПИ» (Продавец)

**Лот № 1:** 1. Пункт техобслуживания погрузчиков, инв. № 610/С-28293, 319,7 кв. м. 2. Электротельфер г/п 2т Н-6М, инв. № 4153. 3. Таль ручная передвижная червячная, инв. № 4152. **Адрес:** Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, 45. **Обременения:** пункт техобслуживания погрузчиков с инв. № 610/С-28293 сдается в аренду по 31.08.2023, площадь, сдаваемая в аренду, – 319,7 кв. м. **Начальная цена с НДС** – 265 933,20 руб. **Задаток** – 26 593,32 руб. **Штраф** – 25 000,00 руб. Земельный участок с кадастровым номером 620850100014000865, 0,3778 га. Право аренды по 06.07.2070.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Аукцион состоится **26.05.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **24.05.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 19 мая 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62161, общая площадь – 307,5 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62162, общая площадь – 47,3 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62163, общая площадь – 145,9 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения; капитальное строение с инвентарным номером 500/С-62164, общая площадь – 244,5 кв. м, наименование – здание неустановленного назначения, назначение – здание неустановленного назначения, составные части и принадлежности: литер 1А/к – здание неустановленного назначения, литер а, б, к, м – площадка; литер в, ж, н – дорожка, литер г, е, и – площадка под навес, литер д – лестница, литер п, с, ф, х, ц – калитка, литер р, т, у, ч – ворота, литер щ, э, ю – ограждение, литер л – смотровая яма; склад металлический (инв. № 100558), трансформаторная подстанция КТП-160-10/ (инв. № 48664), кабельные сети от РУ до КТП-160 (инв. № 103366) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Красина, 105, 105/1, 105/2, 105/3 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 1,5612 га, кадастровый номер 500000000002008276, целевое назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания неустановленного назначения, здания специализированного автомобильного транспорта |
| **Продавец имущества** | ОАО «МТЗ», ул. Долгобродская, 29, 220070, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС** | 163 328,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 16 300,00 бел. руб. |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 19.05.2021.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **19 мая 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 07.05.2021 по 17.05.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017) 333-49-73, (029) 216 92 90, (029) 632 97 44, (029) 312 80 82.

**Телефоны для справок:** (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-73 (ОАО «МТЗ»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Речицкого районного потребительского общества (продавец) извещает о проведении 18 мая 2021 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Наименование холодильного оборудования: камера т/изолир. холод. КХН-31.4 | 2736,00 | 273,60 |
| 2 | Наименование холодильного оорудования: камера т/изолир. холод. КХН-11 | 1152,00 | 115,20 |

Дата проведения предыдущего аукциона – 30.04.2021 г. Выход – 20.04.2021 г. в газете «Звязда».

**Продавец: Речицкое районное потребительское общество,** г. Речица, ул. Привокзальная, 2. Конт. тел. +375296900010.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17.05.2021 г. в 17.00.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее – ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в сроки согласно заключенному договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением ООО «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества.

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: ЗАО «Белреализация» (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Добрушский КБО»** (УНН 400003508) 247050, Гомельская обл., г. Добруш, ул. кн. Паскевича, 12, тел./факс: +375 232 31-59-72 / 25-26-63, тел. +375 29 135-78-72

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **07 июня 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 311/С-38771, пл. 156,0 кв. м, назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – комплексный приемный пункт, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 5. Кадастровый номер земельного участка 321250100003001863 | 7860,00 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ 3302, VIN: 330200800535171 Х9633020082331558, рег. № АВ 8994-3, тип ТС – грузовой бортовой тентовый, цвет – белый, 2008 г. в., местонахождение – г. Чечерск, ул. Урицкого, 8 | 4500,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 08.05.2021 г. 09.00 по 04.06.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 15.04.2021 г.

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИНФОРМИРУЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31.05.2021 ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

**Лот № 1: капитальное строение с инв. № 732/С-5785 – склад-навес,** общ. пл. 2867 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 1, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000502 (право аренды, площадь – 1,5323 га). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

***Начальная цена продажи: 89 500,00 бел. руб. с учетом НДС***

**Лот № 2: капитальное строение с инв. № 732/С-5787 – арматурный цех,** общ. пл. 1711 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Костюковичский р-н, г. Костюковичи, участок № 2, на земельном участке с кадастровым номером: 723550100001000503 (право аренды, площадь – 0,3913 га.

***Начальная цена продажи: 62 500,00 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 31 мая 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by. Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 18.12.20, 06.02.21 и 20.03.21.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

## 7 МАЯ — ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ РАДЫЁ, ТЭЛЕБАЧАННЯ І СУВЯЗІ

# «НАМ ПАТРЭБНЫ ТЭХНІЧНЫЯ ЭРУДЫТЫ, У ЯКІХ ПРЫ РАЗМОВЕ ПРА ВОБЛАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ВОЧЫ ГАРАЦЬ»



**Напярэдадні прафесійнага свята сувязістаў карэспандэнт «Звязды» гутарыць з вядучым спецыялістам па рабоце з персаналам кампаніі МТС Святланай АБРАМЕНКАЙ. Па выніках 2020 года кампанія прызнана найлепшым работадаўцам Беларусі ў намінацыі тэлекамунікацый.**

— Падборам кандыдатаў на работу да нас займаецца профільны аддзел, які падыходзіць да справы сур'ёзна. Запаўняюцца анкеты, вядуцца субяседаванні, кандыдатаў знаёмяць з кіраўнікамі нашых дэпартаментаў. Падыход дыферэнцыраваны — у залежнасці ад таго, што ад спецыяліста спатрэбіцца ў далейшым. У выніку прымаецца рашэнне, ці падыходзіць чалавек на тую або іншую пазіцыю. На работу бяром галоўным чынам выпускнікоў тэхнічных ВНУ. Учарашнім студэнтам прызначаецца настаўнік, і з яго дапамогай навічок павінен «упісацца» ў графікі работы, у зменнасць, спецыфіку сваёй пасады.

Маладыя людзі часцей за ўсё ідуць да нас па перспектывы. Дасягаюць іх — застаюцца надоўга. У кампаніі вялікія магчымасці для прафесійнага росту. Заўсёды назіраецца нейкі рух паміж падраздзяленнямі — дзяўчаты, што займаюцца продажамі, пераходзяць, напрыклад, у маркетынг, а нашы «тэхнары» становяцца, скажам, дызайнерамі і гэтак далей. У такога кадравага руху ёсць свая жыццёвая логіка, і перад вачыма разгортваецца цэлы калейдаскоп чалавечых лёсаў. Каб уплываць на яго з карысцю для справы, патрэбна глыбока ўнікаць у прычынна-выніковыя сувязі і абавязкова — з клопатам пра чалавека.

У нас штогод праводзіцца ацэнка персаналу, і перад гэтым ідзе яго апытанне ў некалькі этапаў — як каму працуецца, ці ёсць праблемы, якія шляхі іх выпраўлення. Калектыўная думка аналізуецца, робіцца вывады. Вызначаецца так званы хэпі-індэкс (у нашым выпадку — думка персаналу пра сваю работу ў кампаніі), і гэты паказчык — восем з дзесяці магчымых, трымаецца каторы год. Персанал надзвычай зацікаўлены ў дасягненні мэт, якія ставяцца перад кампаніяй. І тое, што МТС пастаянна развіваецца, — гэта вынік працы ўсяго калектыву.

Таксама работнікам даецца магчымасць павучыцца на курсах павышэння кваліфікацыі — для ўдакладнення прафесійных ведаў. А калі была ўведзена дыстанцыйная работа, з'явілася неабходнасць для новай вучобы, былі арганізаваны лекцыі для больш хуткай адаптацыі ў новых рэаліях.

**— І ўсё ж, як удаецца пераканаць персанал у неабходнасці высокаэфектыўнай работы ва ўмовах даволі жорсткай канкурэнцыі?**

— Сёння наша кампанія — адзін з самых буйных тэлекамунікацыйных аператараў у Беларусі. Трапіць да нас на работу сапраўды няпроста. Трэба быць спецыялістам у сваёй справе, прычым — перспектыўным, шматабяцальным. Калі коратка, то нам патрэбны тэхнічныя эрудыты, пажадана з тым ці іншым досведам работы, у якіх пры размове пра воблачныя тэхналогіі вочы гараць. І яны гатовыя вучыцца далей, павышаць кваліфікацыю, бываць у камандзіроўках. Зразумела, такі спецыяліст будзе для нас цікавы.

Цяпер можна матываваць работніка працяглымі кантрактамі — на тры, чатыры, пяць гадоў. Мы афармляем адносіны так, як жадае работнік.

**— Ці можна вашы патрабаванні да персаналу назваць унутранымі стандартамі?**

— Наша кампанія міжнародная. Безумоўна, усё робіцца ў рамках міжнародных стандартаў і заканадаўства Беларусі. Так, на базе міжнародных стандартаў дзейнічае сістэма менеджменту якасці. Штогод мы яе пацвярждаем, і яна цалкам адпавядае патрабаванням ISO 9001-2015. Каб гэтыя параметры пацвердзіць, неабходна прыкласці нямала намаганняў. А калі ўлічыць, што пацвярджаць іх трэба штогод, то расслабляцца няма часу.

Мы вельмі высока цэнім увагу нашых спажыўцоў і дзелавых партнёраў. Калі мы кажам, што імкнёмся да высокай якасці паслуг, то гэта сапраўды так — каб усім бакам было зручна і надзейна. І ў той жа час для нас, выбачайце мне, прыбыткова, бо рынак ёсць рынак. Спажывец жадае мець добры танны тэлефон, і гэта зразумела. А нам трэба яшчэ забяспечыць якасную сувязь, і каб спажывец заставаўся з намі надалей.

Працаваць менавіта так дазваляюць нармальныя дзелавыя адносіны ў калектыве. Захоўваецца прынцып гендарнай роўнасці: жанчыны працуюць і ў топ-менеджменце, і кіраўнікамі груп і іншых структурных падраздзяленняў. Усё залежыць ад дзелавых якасцяў.

**— Як новы фармат жыцця ўплывае на работу калектыву кампаніі?**

— Самым непасрэдным чынам. Таму клопат пра чалавека з боку адміністрацыі і грамадскіх арганізацый павінен быць шматпланавы. Пачтаруся, мы на рэгулярнай аснове праводзім апытанні персаналу, па іх выніках робім высновы і стараемся ўдасканальваць працэсы. Сёння шмат людзей у нас працуе «на аддаленцы», а тыя, хто працуе ў офісе, забяспечаны маскамі, пальчаткамі і антысептыкамі. Пры ўваходзе ў кампанію стаяць спецыяльныя спрэйныя прыстасаванні.




**Салон сувязі МТС — месца, дзе можна пазнаёміцца з навінкамі сусветна вядомых вытворцаў, набыць смартфон, планшэт, гаджэт, аксесуары на выгадных для пакупніка ўмовах.**

**— Раскажыце, калі ласка, пра месца і ролю прафсаюзнай арганізацыі ў сённяшнім дні.**

— Прафсаюзная арганізацыя, якую я ўзначальваю, створана ў нас у 2006 годзе. У асноўным займаемся сацыяльнай праблематыкай, у тым ліку і аховай здароўя, што асабліва актуальна цяпер, і арганізацыяй мерапрыемстваў у вольны ад работы час.

Сочым за выкананнем калектыўнага дагавора, якім прадугледжаны тыя ці іншыя даброты для членаў калектыву. Прафсаюз, дарэчы, сумесна з наймальнікам падпісвае штогадовы каляндарны план спартыўна-масавых і фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў. Да пандэміі мы ўдзельнічалі і ў міжнародных спаборніцтвах, нашы каманды часта вярталіся з прызамі. Матэрыяльная база дзякуючы клопату адміністрацыі па-ранейшаму дазваляе моладзі трымаць сябе ў форме.

Мала таго, што традыцыйнымі сталі спаборніцтвы ўнутры кампаніі па дзесяці відах спорту, — мы штогод удзельнічалі і ў галіновых мерапрыемствах, у тым ліку ў турыстычных злётах.

У рамках сацыяльных праектаў асаблівую ўвагу ўдзяляем сям'і. Так, напрыклад, МТС падтрымала міжнародную ініцыятыву Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ЮНФПА «Кампаніі, дружалюбныя бацькам», якая разглядае сям'ю з дзецьмі як каштоўнасць, а не перашкоду для бізнесу. Ініцыятыва скіравана на стварэнне спрыяльных умоў работы для супрацоўнікаў з дзецьмі, а таксама на дасягненне гендарнай роўнасці ўнутры кампаній.

Трэба адзначыць, што мы даўно прыглядаліся да гэтай цікавай і карыснай, на наш погляд, ініцыятывы. Яшчэ ў 2019 годзе пры падтрымцы Еўрапейскага саюза MOST прадстаўнікі сямі беларускіх бізнес-прадпрыемстваў, ЮНФПА і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны наведалі шведскія кампаніі, якія з'яўляюцца лідарамі ў галіне ўкаранення канцэпцыі ParentSmart. У азнаямленчай паездцы бралі ўдзел і супрацоўнікі МТС.




**У салонах сувязі МТС наведвальнікі маюць магчымасць атрымліваць кваліфікаваную кансультацыю спецыялістаў, даведвацца пра новыя акцыі, карыстацца шматлікімі паслугамі. Гэтыя фотаздымкі зроблены ў салоне сувязі МТС на праспекце Незалежнасці, 95/1 у Мінску.**




**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 800013732

## Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе кампазітар **Яўген КСЯНЕВІЧ.**
evgenyksenevich@gmail.com



# РАНАК ПЕРАМОГІ

Валянцін Таўлай (1914—1947) — вядомы беларускі паэт, літаратуразнавец, легендарны заходнебеларускі дзеяч. У Гродне, Лідзе і Маладзечне ёсць вуліцы, названыя імем Таўлая. У Лідзе працуе музей імя паэта.

Значнае месца ў творчасці Валянціна Таўлая займаюць ваенныя вершы. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ён быў партызанскім сувязным, разведчыкам, прайшоў фашысцкія засценкі. І нават у такія цяжкія часы працягваў ствараць непаўторную паэзію, поўную жыццёвага і грамадскага аптымізму.

**Вершы — Валянцін ТАЎЛАЙ, музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.**

*1. Мы цябе выглядалі*
*з-за шэрых руін,*
*Воблік*
*светлы твой снілі*
*начамі ў астрогах*
*І тужылі тугою*
*магіл і краін*
*Па табе,*
*залатая вясна*
*перамогі.*

**Прыпеў:**

*Нашы дрэвы і кветкі,*
*і дзеці, і сны*
*Летуцелі даўно*
*аб табе недацветам,*
*Ані разу яшчэ*
*так пакутна вясны*
*Не чакаў чалавек,*
*покуль свет гэты*
*светам.*

*2. Вочы дым выядаў,*
*лісце вянула дрэў,*
*Апякалі зямлю*
*і душу бліскавіцы.*
*Чорным полымем*
*ранак*
*вясновы гарэў,*
*Рассыпалася ў попел*
*гарачы травіца.*

**Прыпеў.**

*3. Выбухалі і песні,*
*і сэрцы, як тол.*
*Смерць,*
*губляючы косці,*
*назад адпаўзала*
*Праз магілы*
*ахвярныя*
*нашых братоў,*
*Праз руін гарады,*
*цені сёл і вакзалаў.*

**Прыпеў.**




## Ну і ну

### «РАЗВЯЛА» ХЛОПЦА НА БОЛЬШ ЧЫМ 1300 ДОЛАРАЎ

**У міліцыю звярнуўся малады чалавек, які растлумачыў, што яго падманула дзяўчына, з якой ён пазнаёміўся на сайце знаёмстваў.**

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС сталіцы высветлілі асобу грамадзянкі. Ёю аказалася 25-гадовая ўраджэнка Нясвіжскага раёна.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, у ходзе разбору было ўстаноўлена, што дзяўчына пазнаёмілася з пацярпелым на сайце знаёмстваў, дзе потым распавяла пра тое, што працуе ў турыстычным агенцтве. У працэсе стасункаў прапанавала сумесную паездку на адпачынак па вельмі выгаднай цане. Малады чалавек пагадзіўся і перавёў патрэбную суму на карту. Таксама ў перапісцы дзяўчына расказала, што адкрывае бізнес і ёй неабходна невялікая сума грошай, якую яна папрасіла пазычыць на кароткатэрміновы перыяд. Пацярпелы вырашыў дапамагчы і пераве́ў яшчэ 500 долараў. Калі настаў час паездкі на адпачынак, дзяўчына паведаміла, што з'явіліся неадкладныя абставіны і неабходна перанесці паездку. Малады чалавек засумняваўся ў сваёй новай знаёмай і стаў патрабаваць вярнуць грошы, на што дзяўчына прыдумвала розныя адгаворкі.

Вядома, што раней да крымінальнай адказнасці дзяўчына не прыцягвалася. Таксама ўстаноўлена, што яна здзейсніла аналагічныя ашуканскія дзеянні ў Стоўбцах... Сума шкоды склала больш за 3500 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

**7 МАЯ**






**1911** год — нарадзіўся Канстанцін Міхайлавіч Касмачоў, беларускі жывапісец і графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

**1921** год — 7—13 мая ў Мінску адбыўся Першы ўсебеларускі з'езд прафесійных саюзаў.

**1956** год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Фралянкоў, беларускі жывапісец.

**1956** год — Людміла Васільеўна Брэхава, беларуская спартсменка (плаванне брасам), трэнер, майстар спорту СССР міжнароднага класа. Чэмпіёнка Еўропы (1975), сярэбраны прызёр Кубкаў Еўропы (1975, 1976), сярэбраны і бронзавы прызёр чэмпіянату СССР (1976), рэкардсменка і чэмпіёнка Беларусі (1975—1977).

**1971** год — заснаваны Дзяржаўныя прэміі Беларусі па літаратуры і мастацтве для дзяцей і Дзяржаўныя прэміі Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі.




**1861** год — нарадзіўся Рабіндранат Тагор, індыйскі паэт, гуманіст і грамадскі дзеяч, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1913).



**1901** год — нарадзіўся Гэры Купер (Фрэнк Джэймс), амерыканскі акцёр кіно. Здымаўся ў фільмах «Бывай, зброя!», «Па кім звоніць звон», «Сяржант Ёрк» і інш. Уладальнік спецыяльнай прэміі «Оскар» (1960).

**1946** год — нарадзіўся Уладзімір Уладзіміравіч Бартко, расійскі кінарэжысёр, народны артыст Расійскай Федэрацыі, народны артыст Украіны, заслужаны дзеяч мастацтваў РФ. Паставіў фільмы «Бландзінка за рогам», «Сабачае сэрца», «Ідыёт», «Майстар і Маргарыта» ды інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР (1990).

**1946** год — заснавана кампанія «Такійскія навукова-даследчыя лабараторыі тэлекамунікацый» («Токіа цусінкэнкусе»). Цяпер — японская кампанія па вытворчасці бытавой тэхнікі Sony.

**1946** год — нарадзіўся Андрэй Барысавіч Корсакаў, расійскі скрыпач і педагог, народны артыст СССР.




**Бернард ШОУ:**

*«Нянавісць — помста баязліўца за перажыты ім страх».*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.21 | 20.52 | 15.31 |
| Віцебск — | 5.06 | 20.47 | 15.41 |
| Магілёў — | 5.11 | 20.42 | 15.31 |
| Гомель — | 5.14 | 20.32 | 15.18 |
| Гродна — | 5.38 | 21.06 | 15.28 |
| Брэст — | 5.44 | 21.01 | 15.17 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 3 мая. Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Лізаветы, Аляксандра, Аўсея, Аляксея, Валянціна, Савы, Фамы.*
***К.*** *Людмілы, Ружы, Бенядзікта, Вінцэнта, Людаміра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА









ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1260. Нумар падпісаны ў 19.30 6 мая 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12